ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

11 чэрвеня 2011 г.
СУБОТА
№ 108 (26972)
Кошт 750 рублёў

ПРАКАВЕТНАЕ



## Троіцкая Тройца

**З ГОДНА з даўняй традыцыяй, у вёсцы Троіцкая Асіповіцкага раёна напярэдадні дня Святой Троіцы ўсе ўваходы ў двор і хату ўпрыгожваюцца галінкамі клёна, а падчас самога свята звіваюць бярозавыя вяночкі. Маленькія вясковыя жыхаркі Кацярына Бяляўская, Крысціна Сугака і мінчанка Ангеліна Васілеўская хочуць, каб гэтая традыцыя доўжылася і далей.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ ФІКТЫЎНАЕ, А ГРОШЫ РЭАЛЬНЫЯ

У адным з гомельскіх мантажных упраўленняў ААТ «Гомельтэхмантаж» начальнік участка працаўладкаваў на прадпрыемства свайго знаёмага. Насамрэч чалавек, які быў афармлены мантажнікам тэхналагічнага абсталявання, ніводнага дня не працаваў на прадпрыемстве. Затое ва ўліковую дакументацыю спраўна ўносіліся запісы пра яго знаходжанне на працоўным месцы. Ілжывыя звесткі ў дакументы ўносіў або сам начальнік участка, або па яго ўказанні падначаленыя. На падставе запісаў ліпаваму «працаўніку» налічваўся рэальны заробак. Потым грашовыя сродкі прысвойваліся. Дарэчы, фіктыўны супрацоўнік не толькі атрымліваў на прадпрыемстве зарплату, але і «ездзіў» у службовыя камандзіроўкі. Камандзіровачныя таксама аплачваліся за кошт сродкаў дзяржаўнага прадпрыемства. Цяпер грамадзяне падазраюцца ў тым, што, уступіўшы ў змову, выкралі грашовыя сродкі на суму больш Br170 мільёнаў, — паведамілі ў прэс-групе ўпраўлення КДБ Рэспублікі Беларусь па Гомельскай вобласці. Пасля распачынання крымінальнай справы начальнік участка пакрыў частку прычыненай прадпрыемству шкоды і вярнуў Br130 мільёнаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Беларусь выплаціць запазычанасць за расійскую электраэнергію да 5 ліпеня

Па выніках учарашняй сустрэчы прадстаўнікоў ДВА «Белэнерга» і ААТ «Інтэр РАТ АЭС» падпісаны графік плацяжоў, згодна з якім беларускі бок абавязуецца пагасіць запазычанасць за расійскую электраэнергію да 5 ліпеня, паведаміла БЕЛТА памочнік міністра энергетыкі Беларусі Людміла Зяньковіч. Таксама дасягнута дамоўленасць аб тым, што ААТ «Інтэр РАТ АЭС» адновіць пастаўкі электраэнергіі з 0.00 13 чэрвеня.

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

**WWW.RLT.BY**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гамма вкуса» (продавец)**

проводит повторный открытый аукцион по продаже единым лотом объектов недвижимости, расположенных по адресу: Минская обл., Клецкий р-н, **г. Клецк, ул. Кирова, д. 2**, в составе: здание мастерских, об. пл. 519,3 кв.м; конюшня, об. пл. 136,9 кв.м; здание диспетчерской, об. пл. 175,1 кв.м.

**Начальная цена с НДС (снижена на 50%) – 116 583 730 бел. руб.**

**Площадь земельного участка – 0,6053 га.**

**Задаток 10% от начальной цены перечисляется на р/с 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

*Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 12.04.11.*

Аукцион состоится **17.06.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.06.2011** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА АЦЭНЬВАЕ КОШТ ААТ «БЕЛАРУСЬКАЛІЙ» У $30 МЛРД

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ацэньвае кошт ААТ «Беларуськалій» у $30 млрд і не выключае, што з 1 ліпеня гэта сума будзе індэксавацца з улікам інфляцыі долара. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў учора на нарадзе па пытаннях развіцця прадпрыемства, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Мы абсалютна не супраць продажу пакетаў акцый акцыянерных таварыстваў, у тым ліку «Беларуськалія», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Што датычыцца «Беларуськалія», то я дакладна сказаў — $30 млрд на стол, а з 1 ліпеня гэта сума будзе індэксавацца на ўзровень інфляцыі долара», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што паколькі ідзе інфляцыя, гэта сума пастаянна будзе індэксавацца. «Гэта значыць цана «Беларуськалія» з 1 ліпеня можа быць не $30 млрд, а $30 млрд 10 млн. Калі ў вас ёсць такая сума — заўтра вы гаспадары гэтага камбіната», — сказаў ён.

«Як вы цудоўна разумееце, гэта толькі ў Беларусі нашы разумныя беларусы, «свядомыя» або з іх падачы хапаюць гэтыя паперкі доларавыя. Вы цудоўна разумееце, што сёння ідзе каласальнейшая накачка доларамі сусветнай эканомікі, што можа прывесці да яшчэ аднаго абвалу гэтай эканомікі. Мы гэта ўсё ведаем. Ну, хочуць людзі купляць долары — хай купляюць, гэта іх справа. Тое ж самае і на рынку еўра адбываецца. Вось гэтыя ўкідванні па 100, па 200 мільярдаў Грэцыі, Партугаліі, Іспаніі і іншае — гэта адкуль? Германія што, са сваёй кішэні дае? Ідзе зноў жа накачка гэтых еўра-паперак. Калі нашым людзям гэта падабаецца, дык няхай купляюць. Але дзяржава павінна вуха трымаць востра», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што «ніхто нікому за бясцэнак або бясплатна ніводнае прадпрыемства, не толькі «Беларуськалій, не аддасць».

«Пусціў чуткі, што прададзена ўжо гэта прадпрыемства. Я наогул ні з кім не вёў перагавораў па продажы «Беларуськалія», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Што з імі весці? Цана названа, грошы ёсць — прыязджай. Якія перагаворы?» — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў Прэзідэнта, калі неабходна зрабіць пераацэнку прадпрыемства, «калі ласка — пераацэньвайце, але $30 млрд — пакуль я гэту цану не адмяняў».

«Яшчэ раз падкрэсліваю: ёсць грошы — на бочку, заўтра атрымаеце акцыі. Але колькі прынясуце грошай, зыходзячы з $30 млрд, столькі атрымаеце акцый. Пакуль іншага меркавання ў мяне няма», — заявіў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што некалькі пакупнікоў ужо гэту суму выражаюць уголас, гэта значыць гатовы плаціць $30 млрд. «Ну што ж, добра, няхай прыязджаюць», — дадаў ён.

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што за $30 млрд можна пабудаваць яшчэ як мінімум тры такія прадпрыемствы, як «Беларуськалій», па найноўшых тэхналогіях. І яшчэ грошы застануцца для народа. Паводле яго слоў, сыравіннай базы дастаткова, аднак дзейнічаць тут трэба акуратна, каб не абваліць цану на калійныя ўгнаенні.

СТАР. 2

## Сістэма мер па абароне спажывецкага рынку ад неабгрунтаванага вывазу тавараў за мяжу будзе ўкаранёна ў Беларусі

**Аб гэтым паведаміў журналістам дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Беларусі Леанід Мальцаў, перадае БЕЛТА.**

Паводле слоў Леаніда Мальцава, прынятыя меры па абароне насельніцтва ад росту цэн выклікалі іншую праблему, якая звязана з тым, што цэны ў сумежных краінах на сацыяльна значныя тавары вышэйшыя. «Асобныя нядобрасумленныя людзі спрабуюць на гэтых праблемах нажывацца. Таму цяпер адпрацоўваецца сістэма мер па абароне спажывецкага рынку, у тым ліку і ад неабгрунтаванага вывазу тавараў за мяжу. Няма ніякіх сумненняў, гэту сістэму мер у бліжэйшы час адпрацоўць і яна будзе дакладна дзейнічаць». Леанід Мальцаў адзначыў, што праблемы не павінны быць прычынай для розных інсінуацый і разгойдвання сітуацыі. «Яны не павінны быць падставай для асобных людзей, каб на гэтых праблемах спрабаваць вырашыць нейкія праблемы свайго дабрабыту». Дзяржсакратар Савета Бяспекі ўдакладніў, што запланаваныя меры будуць часовымі, і выказаў упэўненасць у тым, што сітуацыя па ўсіх напрамках будзе стабілізавана.

У першую чаргу маюцца на ўвазе эканамічныя меры. «Тое, што спажывецкі рынак будзе абаронены, — гэта адназначна. І тое, што ступень абароны і ступень дзеяння мер будуць адпавядаць той сітуацыі, якая складваецца, — гэта таксама адназначна. Сістэма будзе змяняцца ў залежнасці ад змянення сітуацыі на рынку».

У якасці адной з найбольш вострых праблем ён назваў сітуацыю, звязаную з вывазам паліва з Беларусі з-за розніцы цэн. «Калі ён (бензін. — **Заўвага БЕЛТА**) каштуе ў нас танней, то выязджаеш за мяжу — заплаці гэту розніцу», — адзначыў Леанід Мальцаў, гаворачы аб магчымых варыянтах вырашэння гэтай праблемы. «У нас ёсць заканадаўства, у адпаведнасці з якім будуць прымяняцца ў тым ліку жорсткія, але вымушаныя меры. Нам трэба стабілізаваць сітуацыю, а не разгойдваць яе. Няма ніякіх сумненняў, гэтыя меры будуць адпавядаць усім міжнародным нормам і абавязацельствам Беларусі, узятым у двухбаковых і шматбаковых адносінах, у рамках Мытнага саюза і іншых аб'яднанняў. Яны будуць адэкватныя, але ў рамках дасягнутых дамоўленасцяў», — дадаў дзяржсакратар Савета Бяспекі Беларусі.

## FORD ПАЧАЎ ГАВАРЫЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ

**Кампанія Ford пачала рэалізацыю спецыяльнай канцэпцыі папулярызацыі сваіх прадуктаў і сэрвісных паслуг у Беларусі.**

Тэмай першай рэкламнай кампаніі Ford на беларускай мове стане якасць абслугоўвання ў фірменным сэрвісным цэнтры. Пры гэтым выкарыстанне беларускай мовы не абмяжуецца толькі рэкламнымі слоганамі, плакатамі і шчытамі. Кампанія ўспрымае моўную канцэпцыю шырэй і дапускае выкарыстанне дзяржаўнай мовы Рэспублікі Беларусь у вуснай размове з кліентамі салона або сэрвіснага цэнтра. Выкарыстоўваць беларускую мову на прыярытэтнай аснове кампанія пакуль не гатова, паколькі большая частка кліентаў выступае за падтрыманне двухмоўнай формулы, якая замацавана ў Беларусі на дзяржаўным узроўні. Аднак новая камунікацыйная канцэпцыя нівеліруе прыярытэт рускай мовы над беларускай, гарманізуючы тым самым працэс стасункаў Ford са сваімі спажыўцамі ў Беларусі.

## УДАРЫЛА ТОКАМ

На складзе збожжа СВК «Глінкавічы (Столінскі раён) загінуў рабочы. Жыхар в. Глінка раскручваў сілавы кабель, які аказаўся пад токам.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

БПС-БАНК

**ОАО «БПС-Банк» с 13 июня 2011 года устанавливает следующий размер процентов по вновь привлекаемым и действующим депозитам физических лиц в белорусских рублях:**

| Наименование депозита | Срок привлечения | Размер процентов (годовых) |
| --- | --- | --- |
| «Праздничный» | 65 дней | 23,5 |
| «Актуальный» | 6 месяцев | 24 |

**Дополнительную информацию можно получить в любом подразделении ОАО «БПС-Банк», на сайте банка www.bpsb.by или по телефонам:**

- 148 (в стационарной сети);
- МТС (029) 5-148-148, 2-148-148; Velcom (044) 77-00-148, 77-55-148.

Проценты, выплаченные по депозитам в белорусских рублях в течение 2010 г. (млрд. руб.): январь – 6,1; февраль – 6,3; март – 7,3; апрель – 6,6; май – 6,9; июнь – 7,0; июль – 7,3; август – 8,1; сентябрь – 7,6; октябрь – 7,1; ноябрь – 7,2; декабрь – 6,5.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 08.06.2011 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Банк».

| *Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.06.2011 г. (для б/н разлікаў)* | | | | *Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ* | |
| --- | --- | --- | --- | --- | --- |
| ▲ 1 долар ЗША | 4 971,00 | 1 чэшская крона | 298,14 | USD | 27,7907 |
| ▼ 1 еўра | 7 184,59 | 1 польскі злоты | 1824,29 | 10 UAH | 34,7949 |
| 1 латвійскі лат | 10 141,79 | ▼ 1 расійскі рубель | 178,88 | 1000 BYR | 55,9507 |
| 1 літоўскі літ | 2 082,57 | 1 украінская грыўня | 622,39 | EUR | 40,2298 |

ISSN 1990 - 763X

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ ВЯЧАСЛАВА КЕБІЧА З 75-ГОДДЗЕМ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Вячаслава Кебіча з 75-годдзем.**

«Вы ведаеце цану слову, заўсёды робіце ўсё ад Вас залежнае, каб прынесці карысць нашай дзяржаве і беларускаму народу», — гаворыцца ў віншаванні.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў Вячаславу Кебічу здароўя, даўгалецця, разумення родных і блізкіх, міру і дабра.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ ЕЛІЗАВЕТУ ІІ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Каралеву Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі Елізавету ІІ з нацыянальным святам — Днём нараджэння Каралевы.**

Кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў Каралеве Елізавеце ІІ шчырыя пажаданні моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту, а таксама міру і працвітання яе краіне.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

## Нацбанк Беларусі папярэдзіў банкі аб адказнасці за перавышэнне гранічных значэнняў абменных курсаў

**Нацыянальны банк Беларусі папярэдзіў банкі аб адказнасці за перавышэнне гранічных значэнняў абменных курсаў пры ажыццяўленні валютна-абменных аперацый. Адпаведнае рашэнне замацавана пісьмом Нацыянальнага банка Беларусі, якое ён накіраваў у банкі краіны, перадае БЕЛТА.**

У пісьме гаворыцца аб тым, што ў мэтах выраўноўвання ўмоў ажыццяўлення аперацый куплі-продажу замежнай валюты на розных сегментах валютнага рынку пастановай праўлення Нацбанка Беларусі ад 23 мая 2011 года № 188 устаноўлены гранічныя значэнні абменных курсаў, па якіх могуць ажыццяўляцца купля-продаж і канверсія замежнай валюты на пазабіржавым рынку і рынку наяўнай замежнай валюты. З 24 мая 2011 года яны не могуць адрознівацца больш як на 2 працэнты ў той ці іншы бок ад афіцыйнага курсу беларускага рубля, устаноўленага Нацыянальным банкам (пры канверсіі — ад крос-курсу, разлічанага на аснове афіцыйных курсаў беларускага рубля да адпаведных валют).

Акрамя таго, Нацыянальнаму банку вядомы факты наўмыснага завышэння банкамі тарыфаў па аперацыях кліентаў, што прадугледжваюць выкарыстанне замежнай валюты, у выніку правядзення якіх фактычны кошт замежнай валюты для кліента значна перавышае ўстаноўлены пастановай гранічныя значэнні абменных курсаў (у прыватнасці, пры ажыццяўленні аперацый за мяжой з выкарыстаннем банкаўскіх пластыкавых картак, эмітаваных банкамі да карт-рахункаў у беларускіх рублях).

У сувязі з гэтым Нацбанк просіць банкі прадставіць да 17 чэрвеня гэтага года ў галоўнае ўпраўленне валютнага рэгулявання і валютнага кантролю інфармацыю аб усіх тарыфах, дзеючых да і пасля ўступлення ў сілу пастановы, па аперацыях кліентаў.

Нацыянальны банк лічыць таксама неабходным рэкамендаваць банкам пры ажыццяўленні банкаўскіх аперацый, якія маюць іншую прыроду, чым валютна-абменныя аперацыі, але па сутнасці падобныя да іх (пагашэнне выдадзеных крэдытаў у замежнай валюце беларускімі рублямі, вяртанне прынятых дэпазітаў у замежнай валюце беларускімі рублямі і інш., гэта значыць замена абавязацельстваў, выражаных у замежнай валюце, на абавязацельствы ў беларускіх рублях), прымяняць курс пераліку, які не адрозніваецца ад афіцыйнага курсу беларускага рубля, устаноўленага Нацыянальным банкам, больш як на 2 працэнты.

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю члена Савета Рэспублікі першага склікання, былога старшыні Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў **Жука Мікалая Мікалаевіча** і выказвае спачуванне яго родным і блізкім.

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА АЦЭНЬВАЕ КОШТ ААТ «БЕЛАРУСЬКАЛІЙ» У $30 МЛРД

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што калійная прамысловасць з'яўляецца адной са стратэгічна важных галін беларускай эканомікі, а «Беларуськалій» даўно стаў візітнай карткай краіны. У той жа час Прэзідэнт лічыць, што патэнцыял прадпрыемства можна задзейнічаць больш поўна. У прыватнасці, там створаны штучныя горы, якія, як сцвярджаюць вучоныя, можна выкарыстоўваць у народнай гаспадарцы. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, уносяцца прапановы па стварэнні холдынга, гэта значыць аб'яднанні ўсіх дробных прадпрыемстваў, якія і будуюць руднікі, і абслугоўваюць «Беларуськалій», паколькі гэта павысіць капіталізацыю кампаніі і дасць эфект, а таксама многія іншыя прапановы. «Можна іх з парога адхіляць, але ўпэўнены, што рацыянальнае зерне ў гэтым ёсць. Нам трэба было б даўно папрацаваць у гэтым напрамку», — сказаў Прэзідэнт.

Прэзідэнт адзначыў, што калійная соль з'яўляецца нацыянальным здабыткам, ад рацыянальнага выкарыстання якога ў многім залежыць паступленне валютных сродкаў у краіну. «У гэтым плане хачу падзякаваць жыхарам Салігорска і работнікаў «Беларуськалія», якія часта гаворыць аб тым, што, маўляў, мы ж шахцёры, мы вялікія людзі ў краіне, а ўсё астатняе другараднае, мы валютай краіну забяспечваем. Так, шахцёр — вельмі складаная прафесія і я не вельмі паважаю, — сказаў Прэзідэнт. — Але шахцёры павінны разумець, што кампанія «Беларуськалій» — гэта здабытак нашай дзяржавы, здабытак усяго беларускага народа, як і нафтаперапрацоўка, нафтахімія, Беларускі металургічны завод і многае іншае. Гэта здабытак беларускага народа, а потым ужо жыхароў Салігорска, шахцёраў, металургаў».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сёння трэба будзе дэталёва разглядзець функцыянаванне калійнай кампаніі ў комплексе — ад здабычы да рэалізацыі калійных угнаенняў і стварэння ў перспектыве, прычым ужо блізкай, кампаніі па вытворчасці змешаных складаных угнаенняў. Ён дадаў, што запрасіў са справаздачай выконваючага абавязкі генеральнага дырэктара ААТ «Беларуськалій» Валерыя Кірыенку. «Нам неабходна аб'ектыўна ацаніць рэальную сітуацыю на прадпрыемстве, плюсы, мінусы ў эканамічнай і гаспадарчай дзейнасці яго кіраўніцтва і абмяркаваць перспектывы развіцця калійнай галіны ў цэлым», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт нагадаў, што ў свой час па яго даручэнні сумесна з расіянамі была створана збытавая арганізацыя, якая займаецца пастаўкай калійных угнаенняў на экспарт, — Беларуская калійная кампанія, каб узяць пад кантроль дзяржавы вытворчасць і рэалізацыю калійных угнаенняў. Ён дадаў, што тады ніхто не лічыў кошт калійных угнаенняў і прадавалі іх часта за бясцэнак. Сёння ў склад БКК уваходзіць «Беларуськалій», «Уралкалій», кампанія павялічваецца за кошт «Сільвініта». Такім чынам, падагульніў Прэзідэнт, гэта вядучая, вельмі магутная арганізацыя, якая гандлюе ў свеце і на якую арыентуюцца ўсе вытворцы калійных угнаенняў. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, як будуюцца адносіны кіраўнікоў «Беларуськалія» з БКК, ці ёсць праблемы, паколькі ад гэтага ўзаемадзеяння вытворцы і трэйдара непасрэдна залежыць фінансавы вынік.

Звяртаючыся да Валерыя Кірыенкі, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што хацеў бы пачуць, што робіцца для павышэння эфектыўнасці вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі, зыходзячы з цяперашняй сітуацыі на сусветным рынку, якія праекты дапамогуць прадпрыемству пашырыць геаграфію паставак сваёй прадукцыі і павялічыць экспартны патэнцыял. Паводле слоў Прэзідэнта, асаблівую актуальнасць сёння набываюць пытанні паглыблення перапрацоўкі хлоразмяшчальнай мінеральнай сыравіны. Пакладзены пачатак будаўніцтву новага завода, дзе па сучаснай тэхналогіі будуць вырабляцца комплексныя ўгнаенні. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, што яшчэ ў гэтым напрамку прапануецца зрабіць. Акрамя таго, кіраўніка дзяржавы цікавіць, як можна паскорыць распрацоўку новых радовішчаў, якія прыцягваюць увагу замежных інвестараў, ці трэба іх наогул распрацоўваць. «Не абысці і сацыяльныя аспекты, якія істотна ўплываюць на сітуацыю і на самім прадпрыемстве, і ў раёне ў цэлым. Што робіцца для паляпшэння ўмоў працы і адпачынку шахцёраў, членаў іх сем'яў і ўсіх гараджан?» — абазначыў задачу нарады кіраўнік дзяржавы.

Па выніках нарады прынята новая праграма развіцця «Беларуськалія», у адпаведнасці з якой плануецца давесці магутнасці прадпрыемства да 11 млн тон калійных угнаенняў да 2015 года. Разглядаецца таксама пытанне па асваенні новых перспектыўных участкаў радовішчаў з будаўніцтвам там прадпрыемства па здабычы калійных угнаенняў магутнасцю да 3 млн тон у год.

Прэзідэнт учора таксама прызначыў Валерыя Кірыенку генеральным дырэктарам ААТ «Беларуськалій».

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ПАРЛАМЕНТ ЛІТВЫ ПРЫНЯЎ РАШЭННЕ ПАВЯЛІЧЫЦЬ ПЕНСІЙНЫ ЎЗРОСТ ДА 65 ГАДОЎ

**Парламент Літвы прыняў закон пра паэтапнае падвышэнне пенсійнага ўзросту да 65 гадоў для мужчын і жанчын з 1 студзеня 2012 года.**

Закон прадугледжвае паступовае павелічэнне пенсійнага ўзросту: з 1 студзеня 2012 года штогод пенсійны ўзрост жанчын будзе павялічвацца на 4 месяцы, а мужчын — на два месяцы, каб да 2026 года ўсе мужчыны і жанчыны выходзілі на пенсію ў 65 гадоў.

Урад даўно вёў гаворку пра неабходнасць павелічэння пенсійнага ўзросту з-за велізарнага дэфіцыту бюджэту Фонду сацыяльнага страхавання. Прэзідэнт, якая павінна будзе падпісаць гэты прававы акт, заўсёды выказвалася пра неабходнасць такой меры, спасылаючыся на досвед заходніх краін, у якіх на пенсію выходзяць у 65-67 гадоў.

### АМАТАРКАМ ВЫСОКІХ АБЦАСАЎ ПАГРАЖАЕ АРТРЫТ



**Высокія абцасы павінны быць у гардэробе кожнай модніцы, сцвярджаюць стылісты. Аднак медыкі ім пярэчаць: падобны абутак павялічвае рызыку развіцця артрыту ў далейшым жыцці. Высокія абцасы здольныя змяніць асанку і павялічыць ціск на ступні, ладыжкі, каленныя суставы, што павялічвае рызыку астэартрыту, адзначае The Daily Mail.**

У выніку чалавек пакутуе ад болю і рыгіднасці суставаў. Як адзначае Таварыства майстроў па педыкюры і артапеды, падобная праблема часцей закранае менавіта жанчын.

Артапед, прафесар Энтані Рэдманд раіць жанчынам выбіраць абутак з круглым носам і максімальнай вышынёй абцаса ў 2-3 сантыметры. Таксама патрэбна падэшва, якая паглынае штуршкі пры хадзе. Адмысловыя мяркуюць, што неўзабаве разаўецца сапраўдная эпідэмія артрыту з-за прыхільнасці жанчын да абцасаў.

## МЫТНАЯ СЛУЖБА БЕЛАРУСІ ПРЫ НЕАБХОДНАСЦІ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ АБАРОНУ ЎНУТРАНАГА РЫНКУ НАФТАПРАДУКТАЎ

**Аб гэтым заявіў учора журналістам намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Сяргей Полудзень, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Тыя меры, якія выпрацоўвае ўрад і даводзіць да ведама ДМК, мытныя службы рэалізуюць у поўным аб'ёме», — адзначыў Сяргей Полудзень. Разам з тым, паводле яго слоў, мытная служба Беларусі пакуль не мае дакументы, якія будуць рэалізоўвацца для таго, каб забяспечыць механізмы абароны, стабілізацыі спажывецкага рынку Беларусі. Але ў бліжэйшы час яны будуць даведзены да мытнай службы, удакладніў Сяргей Полудзень.

Фактычна сёння дзейнічаюць нормы заканадаўства, якія даюць магчымасць у агульных звычайных памерах ажыццяўляць вываз тавараў, у тым ліку любых прадуктаў харчавання. Якіх-небудзь абмежавальных, забаронных мер па вывазу тавараў у заканадаўстве не прадугледжваецца, акрамя тых выпадкаў, калі аб'ёмы вывазу сведчаць аб прадпрымальніцкай дзейнасці. «Але калі будуць прыняты нейкія дадатковыя меры па абмежаванні, мытная служба будзе рэалізоўваць гэтыя меры», — сказаў намеснік старшыні ДМК. На сёння заканадаўча дазваляецца вывозіць дызельнае паліва, іншыя нафтапрадукты ў стандартных баках.

Намеснік старшыні ДМК выказаў упэўненасць, што ўсе абмежавальныя меры, якія будуць прадугледжвацца, будуць поўнасцю адпавядаць міжнародным абавязацельствам і ўпісвацца ў заканадаўства, якое дзейнічае ў Мытным саюзе.

**ОБЪЯВЛЕНИЕ**

**О проведении хозяйственным судом Витебской области публичных торгов по продаже имущества, принадлежащего ИП Мощенкову Сергею Петровичу, находящегося по адресу: Лиозненский район, д. Добромысли.**

| № п/п | Наименование имущества | Количество, мера, вес | Рыночная стоимость бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|
| 1. | Торговый киоск | 1 шт. | 12 253 200 рублей |

**Время проведения торгов — 24 июня 2011 года в 11.00 в г. Витебске по ул. Правды, 32, каб. 323.**

**Минимальная величина первого шага торгов 5% от первоначальной стоимости имущества.**

Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: внести на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области р/с № 3642903000023 в 201 филиале АСБ «Беларусбанк» г. Витебска, код 259, УНН 300007670 сумму в размере 10% от стоимости продаваемого имущества, подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества.

Сумма, внесенная лицом, купившим с торгов имущество, зачисляется в счет покупной цены. Остальным участникам торгов внесенные ими суммы возвращаются в течение 5 рабочих дней после окончания торгов.

Победитель аукциона обязан возместить затраты суда на организацию и проведение аукциона.

**По вопросам проведения и участия в торгах следует обращаться в хозяйственный суд Витебской области по адресу: 210025, г. Витебск, ул. Правды, 32, каб. 321 или по телефонам тел./факс. (8 0212) 49 13 22, тел. 49 13 44, тел.м. +37544 757 63 00 судебный исполнитель Новолоцкий Виктор Валерьевич или тел. 49 13 40 старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович. Дополнительная информация на сайте хозяйственного суда Витебской области http://court.by, e-mail: vitsud@tut.by.**

## Затрыманы міліцыянер, які не зняў адпячаткі пальцаў у абвінавачанага па справе аб выбуху ў метро

Затрыманы міліцыянер, які ў 2009 годзе халатна паставіўся да сваіх абавязкаў і не зняў адпячаткі пальцаў у чалавека, які цяпер з'яўляецца абвінавачаным па справе аб выбуху ў мінскім метро. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў праваахоўных органах.

Гэты супрацоўнік органаў унутраных спраў стаў фігурантам асобнай крымінальнай справы. Выбух на станцыі метро «Кастрычніцкая» ў Мінскім метрапалітэне прагрымеў 11 красавіка гэтага года. У выніку тэракта 11 чалавек загінулі на месцы, 4 памерлі ў бальніцах.

## ЗНОЎ ГАРУЧАЯ ВАДКАСЦЬ, ЗНОЎ ПАЦЫЯРПЕЛЫ

**Літаральна на наступны дзень пасля здарэння ў Мінску з дзецьмі, якія пацярпелі ад свавольства з агнём і гаручай вадкасцю, у Фрунзенскім раёне сталіцы адбыўся падобны выпадак. На гэты раз пацярпеў хлопец 1995 года нараджэння, навучэнец першага курса Мінскага дзяржаўнага электратэхнічнага каледжа.**

Падрабязнасці здарэння нам паведамілі ў Мінскім гарадскім упраўленні МНС. 9 чэрвеня ў 13.46 па нумары 101 паведамілі, што ў падвале жылога дома (па адрасе: вуліца Прытыцкага, 47) адбылася ўспышка гаручай вадкасці, ёсць пацярпелы. Было ўстаноўлена: пры пераліванні вадкасці, як мяркуецца, растваральніка, які знаходзіўся ў літровай пластыкавай бутэльцы, адбылася ўспышка пара-паветранай сумесі без наступнага гарэння. Пацярпелы быў дастаўлены ў бальніцу з дыягназам: апёкавая хвароба ў стане шоку, тэрмаінгаляцыйная траўма, тэрмічныя апёкі полымем галавы, тулава, верхніх і ніжніх канечнасцяў 1-4 ступені (50 працэнтаў).

З якой мэтай і што канкрэтна пераліваў малады чалавек, дакладна ўстанавіць пакуль не атрымалася: пацярпелы зараз не можа з-за шпіталізацыі даць тлумачэнні. На словах бацькоў, іх сын не курыў, ды і карыстацца адкрытым агнём у такой сітуацыі наўрад ці стаў бы. Не выключана, што на пацярпелым было сінтэтычнае адзенне, дзе мог утварыцца статычны разрад, іскра якога і магла стаць крыніцай загарання пароў, што назапасіліся ў памяшканні. **Таму спецыялісты нагадваюць: любыя маніпуляцыі з гаручымі вадкасцямі трэба праводзіць па-за памяшканнямі або ў спецыяльна прызначаным для гэтага месцы з выцяжной вентыляцыяй — каб пазбегнуць утварэння выбухованебяспечных канцэнтрацый пароў гаручай вадкасці і паветра. Чалавеку забараняецца праводзіць такі від работ у сінтэтычным адзенні або выкарыстоўваць у якасці анучы такія тканіны, якія карыстацца інструментам, які мож дацъ іскры. Таксама забараняецца выкарыстанне адкрытага агню і моцна нагрэтых прадметаў.**

Сяргей РАСОЛЬКА.

## МЗС Літвы спрабуе скрыць ад грамадскасці факт наяўнасці чорных спісаў беларускіх журналістаў

МЗС Літвы спрабуе скрыць ад грамадскасці факт наяўнасці чорных спісаў беларускіх журналістаў, якім забаронены ўезд на тэрыторыю Еўрасаюза. Такое меркаванне БЕЛТА выказалі ў Беларускім саюзе журналістаў, каментуючы наўдзел дэлегацыі БСЖ у нарадзе па бяспецы журналістаў у рэгіёне АБСЕ, якая праходзіла ў Вільнюсе. Як сцвярджаюць у БСЖ, удзел іх прадстаўнікоў у нарадзе быў сарваны з-за таго, што літоўскае пасольства адмовіла ў выдачы віз, спасылаючыся на санкцыі, уведзеныя Саветам ЕС адносна многіх беларускіх журналістаў. Аднак некаторыя СМІ, спасылаючыся на паведамленне МЗС Літвы, распаўсюдзілі інфармацыю, што беларускі журналістаў не пусцілі на тэрыторыю гэтай дзяржавы быццам бы ў сувязі з несвоечасовым зваротам па візу. «Гэта інфармацыя не адпавядае рэчаіснасці. У БСЖ ёсць афіцыйны дакумент, які гэта пацвярджае. Ні аб якім парушэнні тэрмінаў звароту па візу ў гэтым дакуменце размовы не ідзе. А пазначана, што Шэнгенская інфармацыйная сістэма SIS аб'явіла аб забароне на прыбыццё», — расказалі ў БСЖ.

Паведамленне літоўскага МЗС, што прычынай адмовы нібыта стаў несвоечасовы зварот па візу, у БСЖ называюць «нязграбнай спробай замяць скандал, які ўзнік у сувязі са з'яўленнем інфармацыі аб тым, што многім журналістам Беларусі забаронены ўезд на тэрыторыю ЕС». Матывы такіх паводзін прадстаўнікі БСЖ лічаць відавочнымі. Увядзенне абмежавальных санкцый адносна журналістаў парушае ўнутраныя дакументы самога ЕС, а таксама Еўрапейскую Хартыю аб свабодзе прэсы, прынятую ў Гамбургу ў маі 2009 года. Гэты дакумент забараняе ўводзіць якія-небудзь санкцыі адносна журналістаў.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗА РАС ПРАГАЙЦЕ ХЛОПЦЫ КОНЕЙ?

**Мая маскоўская хрэсніца тры разы на тыдзень бярэ свайго жалезнага каня, каб праз увесь горад імчацца на спатканне да коней сапраўдных. Задавальненне ад такіх сустрэч цяжка пераказаць словамі — адны клічнікі! На гэта ёй не шкада ні часу, ні грошай. Пра карысць стасункаў з конямі вядома, здаецца, усім. Эмоцыі эмацыянальным, але ж карысць цяпер усё больш вымяраецца ў эканамічных тэрмінах: мэтазгодна ці не. Ліст, дасланы ў рэдакцыю пенсіянеркай Разаліяй Рубінчык, перапоўнены якраз эмоцыямі. І да ліста — выразка з газеты «Сябры жывёл». Артыкул прысвечаны складанай сітуацыі ў конна-спартыўным клубе Светлагорскага раёна і называецца «Пакуты «Мустанга», або Навошта калгасу «Прагрэс» коні?». Між іншым, мясцовыя ўлады аператыўна на яго адрэагавалі і далі адпаведныя адказы. Таму мне здаецца неабходным некалькі пашырыць тэму, бо лёс коней сёння цесна звязаны з лёсам людзей не толькі эканамічнымі, але і, напрыклад, дэмаграфічнымі паняццямі. З іх і пачнём. Рытарычным зараз здаецца пытанне: «Навошта конь на вёсцы?» І калі пасля вайны меўся на ўвазе адказ накшталт: «А як жа без яго?», то зараз — «А сапраўды, навошта?»**

## Тры белыя кані, тры белыя кані...

Колькасць насельніцтва на вёсцы памяншаецца, а тэхнікі — павялічваецца. Утрымліваць жывёлу — задавальненне зусім не таннае. Тым больш — каня. Людзей, якія б загадзя стратна для сябе трымалі такую разумную і прыгожую жывёлу, становіцца менш і менш. На Гомельшчыне, напрыклад, толькі за апошнія тры гады пагалоўе коней скарацілася на тры тысячы галоў — ва ўсіх відах гаспадарак.

Як і ва ўсім свеце, прыйшло разуменне, што ўтрымліваць ці разводзіць коней можна толькі на сур'ёзнай прамысловай аснове з пэўнымі магчымасцямі і вызначанымі кірункамі. У Гомельскай вобласці такіх прамысловых племянных заводаў два: КСУП «Гомельскі конны завод № 59» у Веткаўскім раёне і «Палескі дзяржаўны радыяцыйна-экалагічны запаведнік» у Хойніцкім. У першым цяпер 210 галоў коней, у другім — 284.

Як гаворыць начальнік упраўлення інтэнсіфікацыі жывёлагадоўлі і племяннай справы ў жывёлагадоўлі камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама Вольга Варановіч, толькі ў такіх маштабах мэтазгодна займацца конямі. Калі жывёл толькі 13, як у КСУП «Прагрэс-Агра» Светлагорскага раёна, аб эканамічнай выгадзе не можа быць і размовы. Тое ж пацвярджаюць і лічбы. За мінулы год страты ад утрымання коней у гэтай гаспадарцы склалі амаль 40 мільёнаў рублёў, у той час як прыбыткі — 795 тысяч.

## Я коней сваіх бізуном хвашчу?..

Гаспадарка «Прагрэс-Агра» сёлета заняла трэцяе месца ў краіне сярод сельгаспрадпрыемстваў, якія спецыялізуюцца на вытворчасці малака. Так што прыярытэты зразумелыя. А вось коні тут з'явіліся ў 2005 годзе. Намеснік дырэктара па вытворчасці Аляксандр Высоцкі гаворыць, што ў той час планавалі развіццё спорту, турызму:

— Як пачыналі, тут усё адрамантавалі. Раён быў зацікаўлены, але ж апошні час укладанняў ад раёна ў коней няма. Проста ўтрымліваем іх за асабістыя сродкі. Вядома, гэта стратна: грошай на іх не зарабляем. Людзей, якія павінны займацца конямі, доўгі час не было. Таму ў свой час жывёл, можна лічыць, закінулі.

Зусім нядаўна, з 1 красавіка, конна-спартыўны клуб узначаліла Ірына Саракан. Яна 24 гады працавала з конямі ў Расіі, і цяпер на яе — усе надзеі. Інструктар Таццяна Шубіна другі год працуе на каняферме і з радасцю расказвае, што чакаюць прыбаўлення ў невялікім табунчыку — хутка роды ў адной з кабыл. Прымацъ, гаворыць, будуць самі, вопыт ёсць. Я ж раблю высновы, што даверу да ветурача гаспадаркі не прыбавілася. Значыць, недарэмна яму была аб'яўлена вымова са 100 % пазбаўленнем прэміі. Тлумачу: у артыкуле нашых калег з газеты «Сябры жывёл» менавіта да яго працы і адносін да коней было больш за ўсё прэтэнзій.

Таццяна расказвае і пра тое, што зараз на выхадных да іх у конна-спартыўны клуб прыязджаюць са Светлагорска людзі — пакатацца на коніках. Гадзіна каштуе 20 тысяч. Звычайна прыязджаюць кампаніяй, і гадзіну гэтую выкарыстоўваюць усе разам. Па выхадных конікі «працуюць» такім чынам 3-5 гадзін.

## Штосьці коні мне трапіліся пераборлівыя

Між тым, у КСУП «Прагрэс-Агра» зусім не звычайныя беспародныя конікі. Тут большасць — прадстаўнікі тракенінскай пароды. Даведнікі гавораць, што гэта спартыўныя коні для вершнікаў. У конным спорце сусветнага ўзроўню прадстаўнікі гэтай пароды дамагаюцца больш поспехаў у выездцы, чым у канкуры ці трохбор'і. Савецкая спартсменка Алена Петушкова на тракенінскім жарабцы Попеле ў 1970 годзе атрымала званне чэмпіёнкі свету па выездцы.

Але ж гэта ў свеце, а ў гаспадарцы «Прагрэс-Агра» некалькі год запар на каняферме была чахарда са спецыялістамі. Між іншым, усе крыніцы сведчаць, што менавіта яны, сапраўдныя спецыялісты — на вагу золата ў такой справе, як конегадоўля. Не ўсякі ветэрынар ведае, з якога боку да каня падысці — у літаральным і пераносным сэнсе. Гэта пацвярджае і начальнік упраўлення інтэнсіфікацыі жывёлагадоўлі і племяннай справы ў жывёлагадоўлі камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама Вольга Варановіч:

— Спецыялістаў неабходнага ўзроўню, якія маглі б займацца развядзеннем верхавых парод, недастаткова ў вобласці. Калі гаспадарка атрымлівае асноўныя прыбыткі ад мяса-малака ці раслінаводства, цяжка казаць аб развіцці конегадоўлі.

Пасля гэтых разважанняў застаецца толькі адно пытанне: быць ці не быць дзвюм маленькім каняфермам, якія маюць назву конна-спартыўных клубаў. Прынамсі, на Гомельшчыне, акрамя Светлагорскага раёна, яшчэ ў Лельчыцкім ёсць падобны клуб. Калі быць — навошта?

## Я скачу, але скачу інакш

Зробім адступленне. У свеце конны бізнэс развіваецца па розных напрамках. Калі верыць нашым суседзям украінцам http://www.allprobiz.net/viewpage.php?page_id=1575, «па словах уладальнікаў клубаў, сярэднія інвестыцыі ў гэты бізнэс складаюць 10-15 млн еўра з тэрмінам акупляльнасці два гады і рэнтабельнасцю 300%». Апошняя лічба мяне некалькі здзівіла. У іншай крыніцы http://liratop.ru/content.php/180-Конный-бизнес знайшла, што «рэнтабельнасць коннага бізнэсу, у залежнасці ад узроўню, будзе 20-30%. Акупіцца не хутка, у сярэднім спатрэбіцца 4-5 гадоў». Больш падобна на праўду, але ж залежыць і ад таго, які напрамак выбраць.

У нас дагэтуль амаль адзіным спосабам зарабляць на конях з'яўляецца іх продаж. Гэта, зразумела, вельмі важная крыніца прыбыткаў у коннай прамысловасці, але далёка не адзіная. З экзатычных ці малавядомых такія. Невялікая частка агульнасусветнага пагалоўя ўтрымліваецца для патрэб фармацэўтыкі. Коні валодаюць незвычайна бурнай імуннай рэакцыяй, што дазваляе вырабляць на аснове іх крыві розныя лячэбныя і прафілактычныя сывараткі. Людзі абавязаны коням распрацоўкай прэпаратаў з гатовымі антыцелямі супраць слупняка, гангрэны, дыфтэрыі, батулізму. Для патрэб медыцыны выкарыстоўваюць і конскі страўнікавы сок.

## А поні — таксама коні

Міні-коней разводзяць выключна для дэкаратыўных мэт ці ў якасці хатніх улюбёнцаў, з якімі гуляюць, не абцяжарваючы іх працай. Выкарыстоўваюць іх для навучання верхавой яздзе дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў, а ў некаторых выпадках як павадыроў для людзей са слабым зрокам. У свеце становяцца вельмі папулярнымі поні-клубы.

Вакол каня ў свеце круцяцца мільярды долараў. Велізарная колькасць фірмаў зарабляюць на вытворчасці кармоў, ветпрэпаратаў, амуніцыі, адзення, сувеніраў і шмат чаго яшчэ.

Інтэрнэт-крыніцы даюць і такую статыстыку. Кошт звычайнага каня, у родзе якога не было прызёраў і племянных вытворцаў, складае ў сярэднім 1,5-2 тыс. еўра. А вось спартыўны пародзісты конь можа каштаваць ад 7-8 да 20-50 тыс. еўра. Кошт коней не ідзе ні ў якое параўнанне з коштам чатырохколавага жалезнага агрэгата. За тых, якіх купляюць для ўдзелу ў алімпійскіх відах коннага спорту, плацяць ад 500 тысяч да 10 мільёнаў долараў. Пры гэтым трэба ўлічваць, што і на ўтрыманне жывога каня спатрэбіцца куды больш грошай, чым на абслугоўванне аўтамабіля.

## Скачкі! — я сёння фаварыт...

Калі продаж — больш-менш вядомы спосаб, то ў арэнду здаваць коней і стойлы для іх — такой традыцыі ў Беларусі няма. Відаць, таму, што практычна няма прыватных уладальнікаў пародзістых скакуноў. Між тым, людзі, якія аддаюць на ўтрыманне сваіх жывёл, у месяц плацяць ад 1 да 3 тысяч долараў. Напрыклад, на конезаводах Украіны трымаюць коней, чые гаспадары — іншаземцы. Яны карыстаюцца паслугамі ўкраінскіх конезаводаў, таму што там утрыманне абыходзіцца танней, чым у іншых краінах.

Шмат грошай даюць скачкі, таталізатар, паслугі кавалёў, ветэрынараў, брокераў і г.д. На Захадзе навучыліся зарабляць грошы на правядзенні конна-спартыўных спаборніцтваў. Камерцыйныя шоу ў свеце даўно сталі прыдэннай крыніцай заробку. Так, Іспанская школа верхавой язды ў Вене збірае сотні гледачоў. На Церскім конезаводзе ў Стаўрапольскім краі даўно ўжо праводзяцца платныя выводкі коней для турыстаў. Што тычыцца ўдзелу ў скачках, то чым часцей конь перамагае ў іх, тым даражэй ён каштуе.

Пракат, як спосаб зарабляць грошы на коніках, вельмі распаўсюджаны там, дзе ёсць шмат адпачывальнікаў (напрыклад, у Крыме), але не толькі. Там-сям з'яўляюцца аб'явы аб такой паслузе і ў Гомелі. Але ж традыцыяй такі адпачынак пакуль назваць вельмі цяжка. Відаць, таму і са Светлагорска, які знаходзіцца за 15 км ад гаспадаркі «Прагрэс-Агра», прыязджае няшмат людзей, якія жадаюць пабыць гадзіну-другую вершнікам.

## Не марозь мяне, майго каня...

Яшчэ шматлікія конезаводчыкі за мяжой зарабляюць на прадастаўленні сваіх жарабцоў для пакрыцця кабыл кліентаў. На выбітных вядзецца запіс. Напрыклад, на выдатнага рускага араба Персіка ў Германіі запіс на год наперад. У свеце вельмі папулярна выкарыстанне замарожанага семені. Але ж такі від заробку звязаны з наяўнасцю не толькі годных прадстаўнікоў пароды, але і нятаннага абсталявання. Яго сёння няма і ў вялікіх конных гаспадарках на Гомельшчыне — не тое што ў маленькіх.

— Гэта павінна быць станцыя па штучным асемяненні, — тлумачыць Вольга Варановіч, — для коней гэта вельмі дарагое задавальненне, якое цяжка будзе акупіць. Увогуле рэальных інвестарскіх прапаноў накошт развіцця конегадоўлі на Гомельшчыне пакуль не было.

Вырошчваюць прамыслова коней у свеце, як і кароў, — на мяса-малако. З апошняга робяць карысны напой кумыс. Аднак прыбытковым гэты напрамак можа стаць пры наяўнасці пагалоўя не менш за 100 кабыл. Галоўнай праблемай гадоўлі на мяса з'яўляецца неабходнасць вялікіх прыродных паш. Такімі тэрыторыямі ў Еўропе можа пахваліцца хіба што Венгрыя.

## Але толькі коні лётаюць натхнёна!

Застаецца конны турызм. Гэты напрамак варты асаблівай увагі. Хоць, вядома, на перспектыву. Далёкую ці блізкую — сёння ніхто не скажа. Залежыць ад развіцця іншай галіны, якая толькі-толькі пачала развівацца ў краіне, — агратурызму.

Старшыня прафкама АПК Светлагорскага раёна Аляксандр Новік лічыць, што, нягледзячы на ўсе страты, якія сёння мае конна-спартыўны клуб «Мустанг», закрываць яго не варта. Не толькі таму, што конікі ўдзельнічаюць у розных забаўляльна-культурных мерапрыемствах у райцэнтры:

— Дзецям гэта вельмі патрэбна, ды і дарослым цікава. Таму коннаму клубу «Мустанг» трэба час ад часу абавязкова аказваць дапамогу з раёна.

Згодная з гэтай думкай і начальнік упраўлення інтэнсіфікацыі жывёлагадоўлі і племяннай справы ў жывёлагадоўлі камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама Вольга Варановіч:

— Калі гаварыць аб развіцці конегадоўлі на перспектыву, тут вельмі актуальны турызм. Таму правільна робяць у «Прагрэс-Агра», што коней трымаюць. Калі там хочуць развіваць аграэкатурызм, адкрываць аграсядзібы, ім абавязкова спатрэбяцца коні. Гэта цяпер яны несуць страты, а потым, калі разаўецца турызм, а ў іх коней не застанецца, знайсці сродкі і купіць племянную жывёлу будзе вельмі цяжка.

## Я прыйсці не першым не магу?

Не абысціся ў развіцці коннага бізнэсу, у тым ліку маленькім клубам, без службы маркетынгу і без рэкламы адпаведнага ўзроўню. Пакуль што для вёскі гэтыя замежныя словы не вельмі напоўнены сэнсам. З таго, што ўсё ж запланавана і нават павінна ўвасобіцца на Светлагоршчыне сёлета, — гэта распрацоўка конных маршрутаў. Але ж калі па іх зноў пяць чалавек за выхадныя праедзе?

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Абзац

◢ У Мінску з'явіцца дэльфінарый. Комплекс размесціцца побач з заапаркам на другім баку Свіслачы. Наведвальнікі змогуць назіраць за экзатычнымі насельнікамі марскіх глыбінь, а ў спецыяльных басейнах гасцям прапануюць паплаваць з дэльфінамі і пагрузіцца на дно з аквалангам.

**◢ Трохгадовае дзіця выпала з акна кватэры на 8-м паверсе ў Гродне. Хлопчык гуляў у пакоі з бацькам. Адышоўшы літаральна на 2 хвіліны, бацька не меркаваў, што адбудзецца трагедыя. Хутчэй за ўсё, малы змог забрацца на падваконне і выпаў з адчыненага акна. Хлопчык загінуў на месцы. Вядзецца следства.**

◢ Дзёрзкі напад здзейснены 9 чэрвеня паблізу в. Гарадзішча Дзяржынскага раёна. Малады мужчына на падвозіў у сваёй машыне дваіх наглядна знаёмых людзей — мужчыну і жанчыну. Па дарозе мужчына-пасажыр выхапіў нож, параніў кіроўцу, парэзаўшы яму шыю, і выгнаў яго з машыны. Зламыснік знік на чужым «Саабе» з буйной сумай — Br100 млн і $150. Пацярпелы звярнуўся ў міліцыю, быў тэрмінова ўведзены план «Перахоп». Увечары аўтамабіль знайшлі ў Дзяржынску. Папярэдне ўстаноўлена асоба таго, хто напаў, — гэта непрацуючы жыхар Мінска 1988 г.н. Яго шукаюць.

**◢ У Іспаніі затрымалі мужчыну, які падазраецца ў крадзяжах у багажных аддзяленнях аўтобусаў. Зламыснік трапляў у грузавыя адсекі ўнутры чамадана, у які залазіў дзякуючы сваёй гнуткасці. Крадзяжы здзяйсняліся ў аўтобусах, што курсіравалі паміж аэрапортам і Барселонай. Па версіі следства, чамадан са злодзеем унутры ў багажнае аддзяленне змяшчаў яго саўдзельнік. За паўтары гадзіны шляху злодзей паспяваў вылезці з чамадана, скрасці каштоўнасці з багажу іншых пасажыраў і зноў схавацца. У канцы паездкі саўдзельнік зламысніка забіраў свой чамадан і знікаў. Злодзея, рост якога складае 178 см, затрымалі разам з саўдзельнікам падчас праверкі падазрона вялікага чамадана.**

## Поўны абзац

◢ Былы прэзідэнт Францыі Жак Шырак не змог зайсці ў казіно ў горадзе Давіль у Ніжняй Нармандыі. Прычынай адмовы стаў сабака на руках у экс-кіраўніка Францыі. Шыраку патлумачылі, што ўваход з жывёламі забаронены. Па сведчанні персаналу, Шырак быў спакойны, не выказваў незадаволенасці тым, што яму адмовіліся прадаставіць прывілеі. Балонка Дуду з'явілася ў Ж. Шырака ў 2009 г. Жывёлку падарылі яму падчас здымак перадачы, прысвечанай выхаду першага тома мемуараў былога прэзідэнта.


Фота БЕЛТА.

**◢ Гродзенскія памежнікі затрымалі ў пункце пропуску «Бераставіца» 17 шчанюкоў ёркшырскага тэр'ера і іх маці, якіх незаконна спрабавалі ўвезці ў Беларусь. Выявіць кантрабанду дапамог службовы сабака. Гаспадыня тэр'ераў патлумачыла, што ехала на выставу сабак у Мінску, аднак ніякіх дакументаў на жывёлак у яе не было. Усё сабачае сямейства перададзена ў Гродзенскі заапарк. Паводле папярэдняй ацэнкі, кошт жывога грузу складае каля Br17 млн, а ў Br40 млн ацэнены мікрааўтобус «Мерседэс Бэнц», які таксама можа быць канфіскаваны.**

◢ У Чарнігаўскай вобласці (Украіна) рой пчол насмерць закусаў 56-гадовага пчаляра. На яго целе налічылі больш за 200 укусаў насякомых. Праз 2 гадзіны пасля нападу пчол пасечнік, не прыходзячы ў свядомасць, памёр. Вопытныя пчаляры мяркуюць, што агрэсію мог справакаваць пах алкаголю ці іншыя раздражняльнікі — напрыклад, часнок ці парфума.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## РАЗВІТАЛЬНЫ ШКОЛЬНЫ ВАЛЬС

**11 чэрвеня ў Клімавічах адбудзецца гарадскі выпускны вечар.**

Выпускнікі школ разам са сваімі настаўнікамі пройдуць па цэнтральных вуліцах раённага цэнтра і ўскладуць кветкі да брацкай магілы герояў вайны. У гарадскім парку са сцэны амфітэатра да маладых людзей звернецца кіраўніцтва Клімавіцкага раёна, і ва ўрачыстай абстаноўцы выпускнікі атрымаюць школьныя атэстаты. А на заканчэнне — традыцыйны вальс развітання са школай.

**Ілона ІВАНОВА.**

## ХТОСЬЦІ ХАВАЕ, А ХТОСЬЦІ ЗНАХОДЗІЦЬ

**Каля вёскі Верасніца Жыткавіцкага раёна знішчаны пасеў маку на плошчы больш чым гектар.**

Супрацоўнікі групы па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі мясцовага РАУС сумесна з Тураўскай міжраённай інспекцыяй аховы жывёльнага і расліннага свету выявілі плантацыю падчас правядзення спецыяльнай праграмы «Мак». Цікава, што дзялянка была добра замаскіравана кустамі лазы, а па перыметры пасаджана высокая трава, якая хавала расліны маку ад чужых вачэй.

У лясным масіве побач з вёскай Сасноўка Гомельскага раёна быў затрыманы непрацуючы гамяльчанін. Пры ім знойдзена 1,2 кг яшчэ не высушаных канапель. А ў Брагінскім раёне міліцыянерам прыйшлося скасіць дзікарослых канопляў, якія раслі ў 25 метрах ад аўтадарогі. 850 кг зялёнай масы не дасталося наркаманам. У прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама нагадваюць, што за незаконны пасеў ці вырошчванне забароненых раслін, якія змяшчаюць наркатычныя рэчывы, прадугледжаны штраф у памеры да дваццаці базавых велічынь.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Аперацыя АДКБ

# КАНФІСКАВАНА ТРЫ ТОНЫ НАРКОТЫКАЎ

**АНТЫНАРКАТЫЧНЫЯ ведамствы Расіі, Беларусі і Казахстана, мытныя і пагранічныя службы, фінансавыя разведкі гэтых дзяржаў завяршылі ўчора лакальную антынаркатычную аперацыю «Канал-Захад», праведзеную ў рамках Рэгіянальнай антынаркатычнай аперацыі «Канал-2011». У якасці назіральнікаў удзельнічалі прадстаўнікі Латвіі, Літвы, Польшчы і Украіны.**

На працягу трох сутак на тэрыторыі дзяржаў, якія мяжуюць з Беларуссю, а таксама з Рэспублікай Казахстан, вялася работа па падрыве эканамічных асноў наркабізнэсу, спыненні дзейнасці наркагрупіровак, канфіскацыі з незаконнага абароту наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў, зброі і боепрыпасаў. Дзякуючы зладжанай рабоце нацыянальных міжведамасных штабоў дзяржаў АДКБ з незаконнага абароту канфіскавана каля 3 тон наркотыкаў, у тым ліку 17 кг гераіну, 3 кг сінтэтычных наркотыкаў, 1 кг опію, 2,8 т марыхуаны, 2 кг гашышу, 111 г какаіну, 8 т дзікага маку, 38 кг прэкурсораў. Падчас правядзення аперацыі злачынцы пазбавіліся 142 адзінак агнястрэльнай зброі і больш як 2,3 тысячы боепрыпасаў. Канфіскавана матэрыяльных каштоўнасцяў і іншых прадметаў, забароненых да перавозкі, на суму амаль 600 тысяч долараў. Выяўлена звыш 1,5 тысячы нарказлачынстваў. Усяго падчас правядзення аперацыі было заведзена звыш 6 тысяч крымінальных спраў, з якіх амаль 1 тысяча — за злачынствы, звязаныя з незаконным абаротам наркотыкаў. Да крымінальнай адказнасці за нарказлачынствы прыцягнуты 660 чалавек.

Работа аператыўнага ўпраўлення Міжнароднага каардынацыйнага штаба па кіраўніцтве аперацыяй разгарнулася на базе МУС Беларусі. Аперацыя праводзілася на падставе прынятага ў 2008 годзе рашэння Савета калектыўнай бяспекі дзяржаўчленаў АДКБ аб пераводзе комплекснай аператыўна-прафілактычнай аперацыі «Канал» у Рэгіянальную антынаркатычную аперацыю пастаяннага дзеяння. Аперацыя «Канал-Захад» заклікана спыніць дзейнасць наркагрупіровак, якія маюць дачыненне да кантрабанды наркотыкаў, у тым ліку сінтэтычных, з краін Заходняй Еўропы ў дзяржавы-члены АДКБ праз Беларусь, перакрыццё каналаў кантрабанды афганскіх апіятаў у краіны Мытнага саюза і далей у Заходнюю Еўропу, перакрыццё марскіх партоў Чорнага, Каспійскага і Балтыйскага мораў, чыгуначных вузлоў і аэрапортаў, якія могуць выкарыстоўвацца з вышэйназванымі мэтамі, а таксама спыненне дзейнасці падпольных лабараторый па вытворчасці сінтэтычных наркотыкаў. На аб'ектах транспартнай інфраструктуры былі створаны міжведамасныя стацыянарныя пасты, заслоны і мабільныя аператыўныя групы, узмоцнены кантроль за адпаведнымі ўчасткамі дзяржаўнай граніцы на кантрольна-прапускных пунктах. У аперацыі былі задзейнічаны каля 40 тысяч чалавек.

— Мы гаворым сёння пра дзве глабальныя пагрозы — наркатрафік усходні гераінавы і заходні какаінавы, — сказаў перад журналістамі статс-сакратар — намеснік дырэктара Федэральнай службы Расійскай Федэрацыі па кантролі за абаротам наркотыкаў, кіраўнік Аператыўнага ўпраўлення Міжнароднага каардынацыйнага штаба па кіраўніцтве лакальнай антынаркатычнай аперацыяй «Канал-Захад» Алег САФОНАЎ. — Існуе і сур'ёзная праблема павелічэння на наркарынку колькасці сінтэтычных наркотыкаў. Сінтэтыка актыўна ідзе праз Беларусь у краіны Захаду і краіны АДКБ. Таму і было прынята рашэнне сёлетнюю аперацыю правесці ў вашай краіне...

Дзяржавы—члены АДКБ прызналі афганскую пагрозу пагрозай міжнароднаму міру і бяспецы. З 2001 года вытворчасць гераіну ў Афганістане вырасла ў 44 разы. Штогод афганскі наркакартэль атрымлівае прыбытак у памеры 25 млрд долараў, а аб'ём глабальнага наркарынку складае каля 800 млрд долараў... Наркотыкі — гэта не толькі гібель дзясяткаў тысяч маладых людзей у той жа Расіі, але і набыццё зброі, што дэмабілізуе палітычныя рэжымы...

Для Беларусі ў гэтым выпадку было важна атрымаць ацэнку экспертаў у процідзеянні нарказлачыннасці, сказаў першы намеснік міністра — начальнік крымінальнай міліцыі Алег ПЯКАРСКІ. З яго слоў, у самой Беларусі яшчэ да пачатку актыўнай фазы аперацыі было канфіскавана, напрыклад, каля 8 тон маку. Аднак пагроза афганскага гераіну для Беларусі таксама не міф. Дастаткова прыгадаць затрыманне буйной партыі — каля 28 кг такога гераіну — напрыканцы мінулага года.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

**ОАО «ОБЪЕДИНЕННАЯ ДИРЕКЦИЯ СТРОЯЩИХСЯ ОБЪЕКТОВ»,**
**расположенное по адресу:**
**220089, г. Минск, ул. Шатько, 24 ,**

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

Собрание состоится в очной форме **16 июня 2011 года** по адресу: г. Минск, ул. Шатько, 24. Начало проведения собрания **в 15.00.** Регистрация участников собрания **с 14.15 до 14.45** по месту нахождения Общества.

**При себе необходимо иметь:**

- физическим лицам — **паспорт;**

- представителям — **доверенность,** удостоверенную в установленном порядке, и паспорт.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании Общества, — **1 мая 2011 года.** С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по месту проведения собрания **с 23 мая по 16 июня 2011 г.** с 8.30 до 17.00. Телефон для справок: (8017) 226 26 70; (8029) 331 15 54.

**Повестка дня собрания акционеров**
**ОАО «Объединенная дирекция строящихся объектов»**

1. О признании утратившим силу решения по третьему вопросу повестки дня первого общего собрания акционеров Общества, состоявшегося 11 сентября 2009 г. (протокол первого общего собрания акционеров Общества от 11 сентября 2009 г. № 7), об утверждении плана использования нераспределенной прибыли, остающейся в распоряжении предприятия за 1 и 2 кварталы 2009 г.

2. Об утверждении использования чистой прибыли Общества, образовавшейся в периодах за 2006—2009 гг.

3. О рассмотрении аудиторского заключения ООО «Альфа-Аудит» бухгалтерской отчетности Общества за 2010 год.

4. Об утверждении бухгалтерской отчетности Общества за 2010 год.

УНП 190664244

**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОСТИ**

| № лот | Наименование объекта/ Краткая характеристика | Адрес объекта | Продавец | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Здание цеха зимнего бетонирования (инв. № 350/С-56818)** Здание общей площадью 2276,3 кв. м | г. Гомель, ул. Добрушская, 91а | ОАО «Мостоотряд» № 88 | 1 140 274 800 | 57 013 740 |

| | |
|---|---|
| **Условие продажи** | Без условий. Цены указаны с НДС. Шаг аукционных торгов — 5%, вознаграждение — 2% от цены продажи лота. |
| **Срок подачи заявления** | **До 17.00 20 июня 2011 г.,** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46 |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **21 июня 2011 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, Гомельское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012105618010 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк» по г. Минску, пр-т Машерова, 80, код 369, УНП 102353509 |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность |

**Дополнительная информация по тел. (0232) 75 06 63 (факс).**

Спажывец

# Вытворчасць піва ў краіне павялічылася амаль на чвэрць

**ПІВАВАРНЫЯ прадпрыемствы краіны ў студзені—маі вырабілі больш за 16,8 мільёна дэкалітраў піва, што на 22 працэнты больш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.**

Паводле інфармацыі канцэрна «Белдзяржхарчпрам», больш за іншыя гэтай прадукцыі вырабіла ААТ «Крыніца» — звыш за 5,2 мільёна дэкалітраў, што на 1,7 працэнта больш у параўнанні з леташнім узроўнем. Вытворчасць пеннага напою павялічылі і іншыя буйныя прадпрыемствы краіны. Так, «Піваварні Хайнекен» (Магілёўская вобласць) павялічылі яго выраб на 57,3 працэнта — да амаль 4,2 мільёна дэкалітраў, ААТ «Брэсцкае піва» — на 35,1 працэнта (да 1,2 мільёна дэкалітраў), ААТ «Піўзавод «Аліварыя» на 31,1 працэнта (да 3,7 мільёна дэкалітраў), ААТ «Лідскае піва» — на 27 працэнтаў (да 2,5 мільёна дэкалітраў).

У той жа час «Двінскі бровар» з Віцебска за пяць месяцаў істотна скараціў выпуск пеннага напою — на 84,5 працэнта (да 15,6 тысячы дэкалітраў). Спад вытворчасці піва за той жа тэрмін адзначаны і ў «Рэчыцапіва» — на 43,7 працэнта (да 197,5 тысячы дэкалітраў), а таксама ў іншых прадпрыемстваў.

У канцэрне канстатуюць, што працягваюць расці пастаўкі айчыннага піва за мяжу. У студзені—маі піваварныя прадпрыемствы краін адгрузілі на экспарт больш за 5,1 мільёна дэкалітраў пеннага напою, што ў два разы перавысіла пастаўкі аналагічнага перыяду мінулага года. Разам з экспартам за пяць месяцаў вырасла і рэалізацыя піва на ўнутраным рынку — на 25,2 працэнта або да 14,9 мільёна дэкалітраў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА С УСЛОВИЯМИ ПО ПРОДАЖЕ НЕИСПОЛЬЗУЕМЫХ ОБЪЕКТОВ, НАХОДЯЩИХСЯ В РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ, С УСТАНОВЛЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ, РАВНОЙ ОДНОЙ БАЗОВОЙ ВЕЛИЧИНЕ**

**Аукцион состоится 21 июля 2011 г. в 11.10 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.**

**Организатор аукциона: фонд «Могилевоблимущество», 8 (0222) 311185, 223375, 229022.**

Продавцы неиспользуемого имущества: по лоту № 1 – РУП «Минск Кристалл», тел. 8 (017) 2270825, по лоту № 2 – РУП «Белпочта», тел. 8 (017) 2260173, 2261170, 8 (0222) 253549.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 11 марта 2010 г. № 342 «О некоторых мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 11 декабря 2009 г. № 622».

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни в фонде «Могилевоблимущество» с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104, начиная с **13 июня 2011 г.** Последний день подачи заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **19 июля 2011 г.** с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00. Заключительная регистрация участников аукциона в фонде «Могилевоблимущество» **21 июля 2011 г.** с 10.00 до 10.50.

| № лота | Сведения о неиспользуемом имуществе: Наименование и краткая характеристика | Сведения о неиспользуемом имуществе: Место нахождения | Сведения о неиспользуемом имуществе: Начальная цена, базовых величин* | Информация о земельном участке: Площадь, га | Информация о земельном участке: Срок аренды, лет | Сумма задатка, тыс. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Мазутное отделение одноэтажное кирпичное 52 кв.м, насосная мазутного отделения одноэтажная кирпичная 43 кв.м с двумя емкостями полуподземными металлическими 50 куб.м каждая. | Могилевская обл., Осиповичский р-н, д. Дараганово, ул. Привокзальная | 4 | 0,1390 | 30 | 35,0 |
| | **Обязательные условия аукциона по лоту № 1:** 1. Ввод покупателем объектов в эксплуатацию в течение одного года с даты заключения договора купли-продажи. 2. Осуществление покупателем предпринимательской деятельности на базе неиспользуемого имущества в течение не менее трех лет с даты ввода объектов в эксплуатацию. 3. Создание покупателем не менее трех дополнительных рабочих мест в течение одного года с даты ввода объектов в эксплуатацию. 4. Запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объектов до выполнения им условий договора купли-продажи. | | | | | |
| 2 | Изолированное помещение отделения связи 127,2 кв.м в двухэтажном кирпичном здании | Могилевская обл., Дрибинский р-н, Черневский с/с, д. Белая | 1 | - | - | 35,0 |
| | **Обязательные условия для покупателя по лоту № 2:** 1. Осуществлять предпринимательскую деятельность на приобретенном объекте в течение не менее трех лет, в том числе начало осуществления – не позднее 12 месяцев с даты подписания договора купли-продажи объекта. 2. Создать не менее двух рабочих мест в течение 18 месяцев с даты подписания договора купли-продажи объекта. 3. Не продавать, не отчуждать объект иным образом до выполнения условий договора купли-продажи объекта. | | | | | |

* Начальная цена продажи входящего в состав лота неиспользуемого имущества определяется исходя из размера базовой величины, установленного законодательством на дату проведения аукциона.

Земельный участок, право заключения договора аренды которого входит в состав лота № 1, имеет ограничения в использовании в связи с расположением его в водоохранной зоне реки Птичь вне прибрежной полосы. С перечнем ограничений можно ознакомиться у организатора аукциона.

Задаток перечисляется до момента подачи заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

К участию в аукционе допускаются негосударственные юридические лица, индивидуальные предприниматели, внесшие задаток в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет, подавшие организатору аукциона в определенный в извещении срок заявление с приложением (предъявлением) необходимых документов, заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона и получившие билеты участников аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в фонд «Могилевоблимущество» подается заявление на участие в аукционе с приложением следующих документов:

заверенная банком копия платежного поручения о перечислении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении;

негосударственным юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии; копии учредительных документов юридического лица без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть оформлена не ранее чем за шесть месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Представителем заявителя (кроме случая, когда юридическое лицо представляет его руководитель) предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости (для представителя иностранного юридического лица) легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

Прием заявлений со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Дата и время регистрации заявления указываются организатором аукциона в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

Организатор аукциона имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, при этом объявление об отказе от проведения аукциона публикуется в газете «Звязда».

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков.

Срок заключения договора купли-продажи неиспользуемого имущества и договора аренды земельного участка – не позднее 2 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат.

Оплата за неиспользуемое имущество осуществляется денежными средствами в белорусских рублях по безналичному расчету без предоставления рассрочки в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи имущества.

## Увага!

### УВЕДЗЕНА ЗАБАРОНА НА НАВЕДВАННЕ ЛЯСОЎ

**У сувязі з высокай пажарнай небяспекай у Брэсцкай, Гомельскай і Мінскай абласцях (за выключэннем Мінскага раёна) ўведзена забарона на наведванне лясоў.**

Паводле інфармацыі Міністэрства лясной гаспадаркі, у Віцебскай вобласці аналагічныя рашэнні прынятыя ў Полацкім і Віцебскім раёнах, у Магілёўскай — у Асіповіцкім, Клічаўскім і Чэрыкаўскім раёнах. У Гродзенскай вобласці пад забаронай наведвання лясоў пакуль толькі адзін раён — Слонімскі.

Уведзена забарона і на ўезд аўтатранспарту ў лясныя масівы. Такія меры бяспекі ўведзены ў тых рэгіёнах, дзе сіноптыкі ўжо рэгіструюць чацвёрты і пяты класы пажарнай небяспекі. Увогуле зараз на палове тэрыторыі Беларусі назіраецца высокая пажарная небяспека. З пачатку пажаранебяспечнага перыяду ў лясным фондзе Мінлягсаса зарэгістравана 236 пажараў на плошчы 86,82 гектара. На шчасце, пакуль у рэгіёнах краіны не было ніводнага верхавога пажару, пры якім лес гіне цалкам. Усе пажары, што ўзнікаюць, дзякуючы своечасоваму рэагаванню дзяржаўнай лясной аховы хутка лакалізуюцца і тушацца. У тых лягсасах, дзе рэгіструецца пяты, надзвычайны, клас пажарнай небяспекі, уведзена абавязковае кругласутачнае дзяжурства.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ЛЕС ПАЛАЕ

***Жыткавіцкія леснікі выклікалі пажарных і паведамілі пра ўзгаранне пчальніка на тэрыторыі Палянкаўскага лясніцтва.***

Полымя вельмі хутка ахапіла тэрыторыю і стала імгненна распаўсюджвацца, пагражаючы вёсцы. Нямнога заставалася, і лясны пажар мог стаць верхавым. На працягу чатырох гадзін больш за шэсцьдзесят чалавек — і выратавальнікі, і леснікі — вялі барацьбу са стыхіяй. У выніку пажар знішчыў лясны масіў на плошчы ў чатыры гектары. Амаль аднačасова на сельгасугоддзях, арандаваных Жыткавіцкім маторабудаўнічым заводам ля вёскі Кольна, загарэлася трава. Полымя стала набліжацца да населенага пункта. Літаральна за секунды агнём было ахоплена два з паловай гектары. Толькі аператыўнае рэагаванне дазволіла не выйсці сітуацыі з-пад кантролю. Пажар ліквідаваны. А вось у вёсцы Стрэлічава Хойніцкага раёна згарэў сенасклад мясцовай гаспадаркі. Знішчана 65 тон сена ў рулонах сёлетняга ўкосу. Прычыны высвятляюцца.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота МНС.**



# ЧЫРВОНАЯ ЛІХАМАНКА



Гандаль ідзе.

**У кожным раёне Палесся ёсць нешта адметнае. Гуркамі праславілася Століншчына, а журавінамі — Ганцавіцкі раён. Калі ж наступае сезон клубніц, то ажывае Лунінеччына.**

Сёлета шкоду плантацыям клубніц нанесла спякота. Нават з акна цягніка было відаць, што ягаднікі не дужа зялёныя, але гэта датычыцца не толькі клубніц. Бульба рэдкая і не высокая, а палі бялёсыя, быццам хутка жніво.

У Дварцы — вёсцы на аўтамагістралі Лунінец—Мікашэвічы — нягледзячы на будзённы дзень, было даволі шумна. Пачаўся сезон клубніц, і сюды прыязджаюць аптавікі з «усяго свету». Многа ягады запатрабавана Мінскам, стаяць фуры з Масквы...

Мясцовы люд падвозіць клубніцы на веласіпедах, аўтамашынах ці падносіць. Гандаль ідзе ад цямна да цямна, але найбольшы рух раніцой і вечарам.

Калі не ўсе мясцовыя жыхары, то большасць насельніцтва Дварца і бліжэйшых да яго вёсак вырошчвае клубніцы. Сем'і маюць 15-20 сотак, і гэта не рэдкасць.

Падышоў да Міхаіла і Алены Насеняў, якія з в. Галы Бор прывезлі свае клубніцы. Разам з бацькамі быў і сын Руслан, а дачка Віка, як старэйшая, засталася дома.

Вось гаспадар і павёў размову:

*— У нас дваццаць сотак клубніц, і над імі працуем усёй сям'ёй. Сёлета сезон няўдалы, але мы сваю плантацыю паліваем.*

— А колькі ў вас усяго зямлі?

*— Кожнаму чалавеку, які працуе ў калгасе, у нас павінна належаць 30 сотак, і мы маем 60.*

— Працоўны дзень, а вы тут з ягадай?

*— Жонка працуе даяркай, а я халадзільшчыкам. То як раніцой з дойкай управімся — мы свабодныя да наступнай дойкі.*

— Колькі ў сярэднім даярка атрымлівае ў вашым СВК?

*— Мы працуем на новым комплексе, у Алены прыкладна 900 тыс. — 1 млн рублёў у месяц.*

— Клубніцы даюць прыбытак?

*— О-о-о!*

— Я не пытаю пра суму, а, найперш, ці аплачваецца праца?

*— Ад клубніц вялікая выгада, а інакш які сэнс быў бы ў іх? Вось Руслан не толькі дапамагае вырошчваць, але і прадае.*

— Можа, за лепшае было б завесці ў Мінск?

*— Клопату шмат, за бензін заплаціць трэба, за месца таксама... Тут оптам бяруць, а там...*

Мае суразмоўцы за кілаграм клубніц прасілі 8,5 тысячы — трымалі цану. А ў сярэднім клубніцы ў гэты дзень прадаваліся па 7,5-8 тысяч. Але гэта калі ягады адборныя.

Яшчэ сезон не дасягнуў свайго апагея, а праз некалькі дзён цана на клубніцы ўпадзе. Спажыўкааперацыя такія грошы не можа плаціць і чакае, калі прапанова будзе перавышаць попыт. У мінулыя гады здаралася, што людзі не ведалі, куды падзець клубніцы: тавар хутка псуецца.

На тэрыторыі Дварэцкага сельсавета ідзе такі гандаль, а што з гэтага мае сельсавет?

*— Нічога,* — адказаў старшыня Савета Аляксандр Віднікевіч. — *Даведкі мы выдаём бясплатна, хоць санітарная служба з кожнага бярэ немалыя грошы. Сельсавет — бюджэтная арганізацыя.*

— Але ж мы ведаем, што іншым разам у нашых сельскіх Саветах няма за што купіць фарбы, а тут ёсць магчымасць... Дарэчы, а хто смецце ўбірае?

*— Вываз смецця абыходзіцца Савету ў 3,5 мільёна, але ж «чырвоная ліхаманка» працягваецца ўсяго два тыдні... Можна было б гандаль наладзіць у іншым месцы, абгарадзіць, а то, бывала, 16 супрацоўнікаў ДАІ наводзяць тут парадак... Аўтамагістраль, ды яшчэ на самым скрыжаванні вуліц, але патрэбны грошы, ёсць рашэнне вышэйстаячых інстанцый.*

Успамінаю, як нейкі год таму патрабавалі, каб сельсаветы аказвалі платныя паслугі насельніцтву, зараблялі грошы... Але размова ў нас пра клубніцы.

Закупялі ягаду і на самым уездзе ў Лунінец. Відавочна, клубніцы падвозілі з прыватнага сектара райцэнтра. Толькі тут стаяла ўсяго дзве аўтамашыны. Гандлююць клубніцамі і каля чыгуначнага вакзала ў Лунінцы — прадаюць слоікамі і вёдрамі. Са мілітровае вядзерца — 27 тысяч, але пакупнікоў не відаць было. Чарга выцягнулася каля бочак з рыбай, цана на якую асабліва не вырасла. Карп — 7 тысяч, шчупак — 8,5 тысячы.

За гуркамі, клубніцамі, журавінамі... аптавікі прыязджаюць самі і ўсе маюць прыбытак — людзі задаволены. Можа гэта звязана з тым, што тут бізнэсам займаецца прыватнік? Палешука палітыка не цікавіць, для яго абсалютна не важна, хто плаціць грошы: свае, расіяне, літоўцы...

Усім нялёгка — тым, хто вырошчвае клубніцы, аптавікам (выглядаюць змучанымі дарогай), але яны свабодныя ў сваім выбары. Людзі зарабляюць на жыццё і спадзяюцца на сябе.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.**

*Лунінецкі раён.*



Сям'я Насеняў.

# ІРАН БЛІЗКА. У сталічным Палацы мастацтва



Беларускам таксама пасуюць іранскія нацыянальныя строі. На фестывалі можна пераапрануцца ў ісламскае жаночае адзенне і бясплатна атрымаць свой фотаздымак у ім.

**З 7 па 16 чэрвеня ў Мінскім Палацы мастацтва праходзіць Фестываль культуры і мастацтваў Ірана ў Беларусі.**

— Калі будуць паспяхова развівацца культурныя стасункі, то стасункі ў іншых сферах дзейнасці таксама не будуць стаяць на месцы, — перакананы пасол Ісламскай Рэспублікі Іран у Беларусі Сеед Абдала Хасейні. І менавіта таму фестываль культуры і мастацтваў Ірана ў Беларусі праводзіцца ўжо не ў першы раз.

Усю вялікую пляцоўку Палаца мастацтва, што аддаў у часовае карыстанне на дні фестывалю Пасольству Ірана ў Беларусі айчынны Саюз мастакоў, займае іранская экспазіцыя. І калі на першым паверсе можна фрыьвольна пабавіць час, далучыўшыся да чайханы, то іншыя два паверхі прысвечаныя больш сур'ёзным рэчам. Тут самі іранскія мастакі і рамеснікі на вачах у наведвальнікаў дэманструюць сваё майстэрства: ткуць славутыя ісламскія кілімы, выразаюць з дрэва, лепяць з гліны, малююць і выводзяць невераготныя каліграфічныя ўзоры. Па сутнасці, усё, што сёлета прадстаўлена на фестывалі, — гэта іранская народная творчасць. Працавітыя іранскія людзі — сапраўды выдатныя штукары.

Дарэчы, у Іране існуе больш за 290 відаў народных рамёстваў. У гэтым годзе на фестывалі прадстаўлена 45 з іх, што ў паўтара раза больш, чым у мінулым годзе. Адпаведна, больш прыехала і саміх мастакоў. Сёлета 100 аўтараў кожны дзень па некалькі гадзін працуюць на фестывалі: ствараюць і аднačасова распавядаюць ахвотным пра свой від рамяства.

Ёсць тут і іншыя цікавосткі, якія беларусы змогуць пабачыць упершыню. Славуты курдскі танец выконваюць іранскія танцоры на імітаванай пляцоўцы трэцяга паверха Палаца мастацтва. Курдскі танец — вельмі старажытны від танца і вельмі цікавае відовішча для беларусаў, якія прывыклі да рухавых скокаў. Курдскі танец выконваецца так, што танцоры застаюцца амаль нерухомымі, толькі злёгку варушачы каленямі. Але, нягледзячы на такі мінімалізм, танец усё адно ўспрымаецца вельмі жвавым, дзякуючы імпульсіўнай нацыянальнай музыцы.

Іран, тэхналагічна надзвычайна развітая і паспяховая дзяржава, не магла не прадэманстраваць у Беларусі свае тэхнічныя вынаходніцтвы. Прыцягвае ўвагу, напрыклад, робат-піяніна. Механічныя рукі, вельмі сімвалічна злучаныя з фартэпіяна «Беларусь», дзякуючы адмысловым камп'ютарным праграмам самастойна выконваюць вядомыя мелодыі.

Як і ў беларускай культуры, у іранскай таксама ёсць свае праблемы. Галоўная з іх — нястача грошай.

— Недахоп грошай — гэта эпідэмія па ўсім свеце, асабліва калі справа тычыцца культуры, — распавядае пасол Ірана ў Беларусі Сеед Абдала Хасейні, які добра ведае нацыянальны і сусветны культурны канктэкст, бо 20 гадоў адпрацаваў намеснікам міністра культуры Ірана. — Магчыма, у Іране з фінансаваннем культуры справы крыху лепшыя, чым у Беларусі. Але нашыя мастакі і людзі ад культуры таксама не ўсім задаволеныя. У нас вялікая праблема з фінансаваннем догляду старажытных помнікаў культуры, з правядзеннем археалагічных даследчых работ. Гісторыя Ірана налічвае больш за 7 тыс. гадоў. У нас дзе ні пачні капаць, паўсюль можна знайсці нейкія каштоўныя артэфакты. Адных старажытных курганоў у нас толькі 6 тысяч! Таму ў нас вельмі вялікія расходы на культуру. Грошай не хапае. Дзяржава адна не можа гэта пацягнуць. Таму мы імкнёмся рабіць так, каб бізнэсоўцы, прыватныя асобы былі зацікаўлены ўкладаць грошы ў культуру.

Іран таксама вядомы як адзін з найбуйнейшых сучасных кінавытворцаў. Акрамя таго, іранскае кіно вельмі прызнанае ў свеце і часта перамагае на прэстыжных міжнародных кінафестывалях. Дарэчы, тры месяцы таму ў Мінску прайшоў тыдзень іранскага кіно, дзе было паказана 8 фільмаў. Кожны фільм збіраў поўную залу. Пасол Ірана ў Беларусі пацвердзіў думку, агучаную тады, пра гатоўнасць Ірана да сумеснай кінавытворчасці з Беларуссю. Цяпер галоўнае — узаемная ініцыятыва айчынных кінематаграфістаў.

— У нас нават ёсць такая ідэя, мы ўжо прапаноўвалі яе нашым рэжысёрам і прадзюсарам: зрабіць іранскі фільм у Беларусі. Няхай там будуць іграць не беларускія артысты і сюжэт будзе не беларускі, але фільм абавязкова будзе здымацца ў Беларусі. Такі фільм таксама дапаможа іранскаму народу больш блізка пазнаёміцца з Беларуссю.

А для нас Іран ужо зараз зусім блізка. І нішто не перашкаджае беларусам пазнаёміцца з культурай гэтай краіны. Уваход на фестываль — вольны.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ. Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**



Іранскае шкло і парцаляна вядомыя ва ўсім свеце. На фестывалі беларусы могуць не толькі зблізку разгледзець вырабы з гэтых крохкіх матэрыялаў, але і набыць сёе-тое.



Робат-піяніна — адзін з самых захапляльных экспанатаў з Ірана.

## Факт

### У АСІПОВІЧАХ УКЛЮЧЫЛІ «СОНЦА»

**У гандлёвай сетцы Магілёўскай вобласці з'явілася першая прадукцыя фабрыкі «Сонца», якая адкрыла ў раённым цэнтры Асіповічы вытворчасць бытавой хіміі.**

На прадпрыемстве пачалі з пральных парашкоў: новая лінія можа выпрацоўваць да 5 тон прадукцыі штогадзіну. Пакупнікі цікавяцца прымальным коштам пральных парашкоў, якія, абяцаюць вытворцы, маюць еўрапейскую якасць. Далей у Асіповічах будуць выпрацоўваць вадкія і сухія сродкі для мыцця тканін і посуду, для прыбірання дома і асабістай гігіены. Магутнасцяў хопіць не толькі для таго, каб задаволіць попыт мясцовых спажыўцоў, але і для экспарту прадукцыі ў краіны блізкага замежжа. Гэта сапраўды сур'ёзны праект: у арганізацыю вытворчасці ў Асіповічах інвеставана каля 30 мільёнаў долараў. Створана сотня новых працоўных месцаў.

**Ілона ІВАНОВА.**

### ЛЮЛЬКА ЗАХРАСЛА

**паміж небам і зямлёй на ўзроўні сёмага паверха.**



Будаўнікам, якія фарбавалі фасад дома ў Мазыры, спатрэбілася дапамога выратавальнікаў. Двух рабочых, якія знаходзіліся ў люльцы каленчатага пад'ёмніка, што па тэхнічных прычынах не мог апусціць прыстасаванне, здымалі з вышыні з дапамогай спецыяльнай пажарнай аўталесвіцы. Меддапамога эвакуяваным грамадзянам не спатрэбілася.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота МНС.**

### КАЛІ РАБІЦЬ НЯМА ЧАГО

У двары дома жыхаркі вёскі Олцень Столінскага раёна загарэўся хлеў. Падпальшчыка хутка затрымалі. Ім аказаўся 17-гадовы хлопец з гэтай жа вёскі, які не працуе і не вучыцца.

**Яна СВЕТАВА.**

**Зніжкі**

## Паехаць у Расію чыгункай стане танней

**З 15 чэрвеня зніжаецца каэфіцыент індэксацыі на плацкарту ў міжнародных фірмовых цягніках у зносінах з Расіяй. Гэта цягнікі №2/1 Мінск — Масква, №4/3 Мінск — Масква, №52/51 Мінск — Санкт-Пецярбург, №40/39 Полацк — Масква, №56/55 Гомель — Магілёў — Масква, №78/77 Гродна — Масква. Зніжкі робяцца па ініцыятыве Беларускай чыгункі з мэтай змяншэння кошту праезду і прыцягнення пасажыраў.**

У цэлым зніжэнне кошту праезду на міжнародных фірмовых цягніках у зносінах з Расіяй складзе ад 9 да 22 працэнтаў у залежнасці ад маршрутаў, адлегласці следавання і тыпаў вагонаў. Як патлумачылі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі, калі па стане на пачатак чэрвеня праязны дакумент у купэйны вагон цягніка №2/1 Мінск — Масква з нашай сталіцы ў Белакаменную каштаваў 635 680 рублёў, дык з 15 чэрвеня яго цана зменшыцца на 20 працэнтаў — да 513 010 рублёў. Кошт праезду ў цягніку №52/51 Мінск — Санкт-Пецярбург з Мінска ў горад на Няве з азначанай даты знізіцца: у купэйным вагоне — на 20 працэнтаў (з 691 600 рублёў да 557 880 рублёў), у плацкартным вагоне — на 9 працэнтаў (з 299 160 рублёў да 274 000 рублёў).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Ну і ну!**

## Пажар пачаўся з... прыбіральні

**Здарэнне з разраду трагікамічных: жанчына, спальваючы ў вядры туалетную паперу, спаліла лазню і тры хлявы.**

Як паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях, усё адбылося ў вёсцы Парэчча Акцябрскага раёна. Пасля сігналу пра пажар прыбыўшыя на месца падраздзяленні ўбачылі, як адкрытым полымем гараць тры хлявы і лазня, што належалі тром розным грамадзянам. Насельніцтва ніякіх мер для тушэння не прымала. Адно са збудаванняў знаходзілася ва ўласнасці пенсіянеркі, якая, згодна з папярэдняй версіяй, і стала віноўніцай здарэння. Жанчына спальвала туалетную паперу ў металічным вядры з драўляным дном. Не пераканаўшыся ў адсутнасці тлення, яна паставіла яго назад у прыбіральню...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Вниманию акционеров ОАО «Знамя индустриализации»!**

**Выплата дивидендов по итогам работы Общества за 2010 год будет осуществляться с 11 июня 2011 года по 30 сентября 2011 года.**

- работающим акционерам – одновременно с выплатой заработной платы через отделения филиалов ОАО «Беларусбанк»,
- иногородним акционерам – почтовым электронным переводом,
- юридическим лицам – путем перечисления на расчетный счет,
- госслужащим – перечислением на счет доверительного управляющего ОАО «Беларусбанк»,
- неработающим акционерам, жителям г. Витебска – в кассе Общества **с 14.00 до 15.30 по пятницам**, согласно предварительной записи по телефону **48 61 11.**

Дата закрытия реестра для начисления дивидендов – **20.05.2011 г.**

УНН 300200360

Считать недействительным страховой полис Зеленая карта BY/12 № 4733521.

*УНП 200035955*

## ДА ВЫПУСКНЫХ ВЕЧАРОЎ — РАСПІСКІ АД ВЫПУСКНІКОЎ

**Сёння ў большасці беларускіх школ адшумяць выпускныя вечары. Атэстаты аб агульнай сярэдняй адукацыі атрымаюць 75 тысяч учарашніх адзінаццацікласнікаў.**

— Заканчэнне школы — гэта заўсёды знакавая падзея для кожнага маладога чалавека, — падкрэсліў на сустрэчы з журналістамі першы намеснік міністра адукацыі нашай краіны Казімір Фарыно. — У вялікай ступені будучыня ўчарашніх адзінаццацікласнікаў будзе залежаць ад таго, наколькі свядома яны здзейсняць свой прафесійны выбар. Чым яны будуць кіравацца: сваімі схільнасцямі, здольнасцямі, парадамі бацькоў і настаўнікаў або прэстыжнасцю той ці іншай спецыяльнасці ці баламі ў сваіх сертыфікатах... Але ім трэба ведаць адно: прафесія павінна прыносіць задавальненне, і калі выбар здзейснены правільна, то чалавек можа дасягнуць у сваёй прафесіі вельмі многага.

Вядома, што ў Брэсцкай і Магілёўскай абласцях лепшых выпускнікоў запрасілі да сябе на прыём губернатары. У Заводскім раёне сталіцы будуць арганізаваны феерверкі для выпускнікоў. А выпускнікоў Гродна і Віцебска чакаюць прагулкі на цеплаходах.

Адказваючы на пытанні прадстаўнікоў СМІ наконт правамоцнасці дзеянняў кіраўнікоў школ, якія збіраюць з выпускнікоў распіскі аб тым, што тыя ведаюць пра правілы бяспечных паводзін, Казімір Фарыно адказаў наступнае: «Гэта вымушаная мера. Такім чынам мы дадаткова ахоўваем маладых людзей ад нестандартных сітуацый. Нагадваем ім пра каштоўнасць іх здароўя і жыцця. Наша задача — падказаць ім, папярэдзіць... І не трэба думаць, што педагогі такім чынам падстрахоўваюцца, знімаюць з сябе адказнасць. Персанальную адказнасць за ўсё, што будзе адбывацца з выпускнікамі, нясе кіраўнік установы адукацыі».

Міністэрства адукацыі правяло сумесныя нарады са спецыялістамі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і Міністэрства ўнутраных спраў. Усе на месцах прайшлі інструктаж. «А з улікам спякотнага надвор'я абавязкова ў месцах правядзення выпускных вечароў павінна быць наладжана яшчэ і дзяжурства медыцынскіх работнікаў», — дадаў Казімір Фарыно.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Уцякалі на лодцы

**На вадаёме недалёка ад вёскі Какорыца, якую часта называюць драгічынскай Венецыяй, часта ловяць браканьераў.**

І на гэты раз супрацоўнікі Дзяржінспекцыі па ахове жывёльнага і раслiннага свету прыбылі туды, калі двое мужчын лавілі рыбу сеткай. Але браканьеры ўцяклі на маторнай лодцы, пакінуўшы на беразе матацыкл і веласіпед. Сеткі і рыбу яна таксама кінулі. Канфіскавана 5 сетак і 19 кілаграмаў рыбы. Урон ацэнены больш як у 6 мільёнаў рублёў.

**Яна СВЕТАВА.**

**г. ВИТЕБСК** **13.07.2011**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Неиспользуемое здание музыкальной школы № 2, расположенное по адресу: Витебская область, г. Орша, ул. Молодежная, д. 2, и право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объектов недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 240/С-31720 (здание специализированное для образования и воспитания) – одноэтажное каменное здание с двумя бетонными крыльцами, стены кирпичные, фундамент бутовый, крыша совмещенная, перекрытия ж/б, общая площадь 646,4 кв.м. Земельный участок с кадастровым номером 242400000001001997, площадью 0,0866 га под музыкальную школу № 2, сроком аренды 10 лет. | 235506075 | 23550600 |
| 2 | Неиспользуемое здание склада, расположенное по адресу: Витебская область, Россонский район, Клястицкий с/с, аг. Клястицы, ул. Школьная, д. 8, и право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 253/С-496389 (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) одноэтажное из силикатных блоков, фундамент бутовый, крыша – асбестоцементные волновые листы, общая площадь 65,3 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 224282004601000017, площадь 0,0349 га для содержания и обслуживания здания склада, сроком аренды 50 лет. Ограничение (обременение) прав: водоохранная зона водохранилища вне прибрежной полосы, площадью 0,0349 га | 6066797 | 606670 |
| 3 | Здания и сооружения пансионата «Заналютчик», расположенные по адресу: Витебская область, Городокский район, Стодолищенский с/с, д. Заналючик, д. 12, и право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 201/С-12598 (здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей) с двумя пристройками, отмосткой бетонной и двумя крыльцами, одноэтажное бревенчатое, фундамент бетонный, перекрытия деревянные, крыша шиферная, общая площадь 158,5 кв.м; уборная, баня, сарай, навес, пешеходная часть, ограждение (в том числе участок № 1, участок № 2), ворота, калитка. Земельный участок: с кадастровым номером 221880408501000014, площадь 0,2191 га для содержания и обслуживания пансионата «Заналютчик», сроком аренды 50 лет. Ограничения (обременения) прав в использовании земель, находящихся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос озера Налютик, площадь 0,2191 га. | 65001430 | 6500140 |
| 4 | Неиспользуемое здание аптеки № 69 с тремя пристройками, уборной и неиспользуемое здание склада, расположенные по адресу: Витебская область, Верхнедвинский район, Борковский с/с, д. Борковичи, ул. Железнодорожная, 15, и право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 251/С-61244 (здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг ) одноэтажное щитовое, облицованное кирпичом, фундамент – бутобетонный, перекрытия деревянные, крыша шиферная, с двумя кирпичными пристройками, дощатой пристройкой и крыльцами деревянными, общей площадью 87,3 кв.м, уборной; капитальное строение с инвентарным номером 251/С-62539 (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) одноэтажный деревянный склад, фундамент бутовый, перекрытия деревянные, крыша шиферная, общей площадью 23,3 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 221081201601000003, площадь 0,0481 га для использования под Борковичскую сельскую аптеку № 69, сроком аренды 50 лет. Ограничения (обременения) – охранная зона линии связи, площадь 0,0070 га. Использование – для содержания и обслуживания зданий. | 38023322 | 3802330 |
| **ПОВТОРНЫЙ АУКЦИОН – НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА ПРОДАЖИ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ СНИЖЕНА НА 20 ПРОЦЕНТОВ** | | | | |
| 5 | Неиспользуемое здание аптеки с пристройкой, сараем, расположенное по адресу: Витебская область, Толочинский район, Серковицкий с/с, аг. Серковицы (аптека № 135), и право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 243/С-3061 (здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг) – одноэтажное сборно-щитовое облицованное кирпичом здание с пристройкой, сараем, 1982 г. постройки, фундамент бетонный, перекрытие деревянное, крыша шиферная, общая площадь 55,6 кв.м; сарай, общая площадь 15,6 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 224684610101000014, площадью 0,0430 га для обслуживания недвижимого имущества, сроком аренды 50 лет. | 31084908 | 3108490 |
| 6. | Неиспользуемое здание аптеки с холодной пристройкой, расположенное по адресу: Витебская область, Ушачский район, Великодолецкий с/с, аг. Великие Дольцы, ул. Лесная, 1б, и право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 243/С-5114 (здание специализированное иного назначения) – одноэтажное бревенчатое с холодной пристройкой, 1985 г. постройки, фундамент бутовый, перекрытие деревянное утепленное, крыша шиферная, общая площадь 78,3 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 224980701601000022, площадью 0,0389 га для обслуживания недвижимого имущества, сроком аренды 25 лет. Ограничения: земли, находящиеся в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000В (площадь – 0,0064 га). | 28039068 | 2803900 |

**ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.**

ПРОДАВЕЦ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ: **Лот № 1** – Республиканское унитарное производственно-торговое предприятие «Оршанский льнокомбинат», телефон в Орше (0216) 296610,232210; **Лот № 2** – Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», телефон в Минске (017) 2935910; **Лот № 3** – Прокуратура Витебской области, телефон в Витебске (0212) 474125,474060; **Лоты №№ 4, 5, 6** – Витебское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация», телефон в Витебске: (0212) 485853.

**Условия предоставления земельных участков:**

**Лот № 1:** заключение победителем аукциона с Оршанским горисполкомом договора аренды земельного участка и обращение в двухмесячный срок после заключения договора аренды в Оршанский филиал РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него.

**Лот № 2:** заключение победителем аукциона с райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок, получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

**Лот № 3:** заключение победителем аукциона с Городокским райисполкомом договора аренды земельного участка и обращение в двухмесячный срок после получения решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка за государственной регистрацией прав на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения Городокского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на реконструкцию объекта в срок, не превышающий два года.

**Лот № 4:** заключение победителем аукциона с Верхнедвинским райисполкомом договора аренды земельного участка и обращение в двухмесячный срок для получения решения (выписки из решения) о предоставлении ему земельного участка в установленном порядке за государственной регистрацией права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения Верхнедвинского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

**Лот № 6:** обращение в течение двух месяцев со дня заключения договора аренды за государственной регистрацией возникновения права аренды в Ушачское бюро Лепельского филиала РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

**Аукцион состоится 13.07.2011 в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, а также консолидированные участники – два и более субъекта малого предпринимательства – индивидуальные предприниматели и (или) микроорганизации. Участнику необходимо подать заявление и подписать соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

**1. Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают:** заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: юридическими лицами Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица, копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица, **без нотариального засвидетельствования**; индивидуальными предпринимателями – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, **без нотариального засвидетельствования**; иностранными юридическими лицами – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык; представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

**Консолидированными участниками** для участия в аукционе к заявлению прилагаются: оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе; заверенная банком копия платежного поручения о перечислении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе; сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, **последний день приема документов 12.07.2011 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308.

2. **Заключительная регистрация участников 13.07.2011 с 14.00 до 15.00**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

3. Аукцион проводится в соответствии с положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

**4. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в сумме 3 миллиона рублей (по каждому Лоту), расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; не позднее 12 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

**5. Информация по продаже лотов №№ 5 и 6 опубликована ранее в газете «Звязда» от 16.03.2011 № 48 (26912).**

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

# «ATLANTICA»: «МЫ ГАНАРЫМСЯ, ШТО МЫ — БЕЛАРУСЫ!»



**СВОЙ чацвёрты альбом гурт «ATLANTICA» выпусціць у Францыі. Дыск стане першай сумеснай працай абноўленага складу калектыву — музыкантаў Алекса Дэвіда і Яна Брыта. І пакуль запіс новага альбома яшчэ ідзе, удзельнікі знакамітага гурта расказалі, чым будзе адрозніваецца новы дыск. У гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» музыканты разважаюць пра беларускую мову, Беларусь і перспектывы запісу беларускамоўнага альбома.**

— Гэта чацвёрты поўнафарматны альбом гурта, — удакладняе саліст «Атлантыкі» Алекс Дэвід. — У гэтым альбоме абсалютна адсутнічае Павел Бараноўскі (былы аўтар тэкстаў гурта — **Аўт.**). Упершыню ён заяўлены як творчы тандэм Алекса Дэвіда і Яна Брыта — аўтараў музыкі і тэксту. Ян — аўтар англамоўных тэкстаў, я — аўтар франкамоўных. Увогуле, мы працягваем рухацца ў бок электрадэнсу. Альбом адрозніваецца зусім іншым моўным падыходам. 30 працэнтаў тэкстаў у ім па-французску, 70 працэнтаў — па-англійску.

## ATLANTICA: учора і сёння

***— Як склаўся ваш дуэт? Я чуў нейкую гісторыю пра знаёмства ў стрыптыз-клубе...***

**Алекс:**

— Не, гэта было не ў нас з Янам (*усміхаецца* — **Аўт.**). Гэты выпадак быў у часы іншага складу гурта. Даволі доўга мы існавалі ў дуэце з Дзімітрам, але так склалася, што мы разышліся. У нейкі момант з'явіўся Ян, які ўжо паспеў папрацаваць у нашай камандзе ў якасці гітарыста гурта. З ім я працую разам ужо два гады, гэта было дастаткова нечаканае рашэнне: на той момант я ўжо быў гатовы працаваць сола. Пасля высветлілася, што ён добры паэт і гітарыст, які няздрэнна спявае. Нам зручна ўдвух, разумеем адзін аднаго з паўслова, хоць і не скажу, што канфліктаў не ўзнікае.

***— Ян, а як вы адчуваеце сябе ў новай ролі?***

**Ян:**

— Музыкай я стаў займацца раней, чым радыё і тэлебачаннем, — з пяці гадоў. Музычная школа па класе гітары і фартэпіяна. На радыё пайшоў працаваць, бо цікавіўся музыкай — іграў у аматарскіх гуртах. Але склалася так, што потым на некаторы час музыку я пакінуў, працуючы на тэлебачанні ў іншых іпастасях (многія гледачы памятаюць Яна як вядучага Івана Падрэза ў праграмах 5х5 і «Твой фармат»). Я лічу, што не я абраў «Атлантыку», а «Атлантыка» абрала мяне: музыка вярнула мяне. Я вельмі гэтаму рады. І ўжо калі стаў часткай «Атлантыкі», адчуў сябе так, як павінен быў сябе адчуваць першапачаткова. Я мяркую, наша супрацоўніцтва будзе доўгачасовым. Адчуваю сябе тут на сваім месцы, вельмі камфортна.

**Алекс:**

— Хоць я і не падарунак (*смяецца* — **Аўт.**). Усе ведаюць дастаткова жорсткага Алекса Дэвіда. Ян — Стралец, а я — Дзева. Я навучыўся гаварыць «не», зразумеўшы адначы: калі я ў пэўнай сітуацыі не скажу «не», усё будзе дрэнна. Магчыма, «не» стане новай фазай у развіцці і руху наперад. Але трэба навучыцца гаварыць «не».

***— Як вам гэта ўдалося зрабіць?***

— Неяк жыццё мае так складваецца, што мяне акружаюць правільныя людзі. Я не люблю зайздрасці і ліслівасці. Заўсёды выразна адчуваю несправядлівасць, калі яна ёсць. Гэтаксама адчуваю, калі людзі па-сапраўднаму шчырыя. Жыццё так фільтруе людзей, што сапраўднае — застаецца, а ўсё, што фальшывае, — кудысьці знікае. Сказаць «не» нашмат складаней, чым сказаць «так». Але ты павінен зразумець: тваё «не» не павінна нарадзіць нейкую дэструкцыю, а павінна стаць штуршком, каб чалавек захацеў працаваць далей.

## Моўныя эксперыменты

***— У межах праекта «Тузін хітоў. Перазагрузка» гурт «ATLANTICA» пераклаў на беларускую мову адну са сваіх песень. Магчыма, плануецца асобны беларускамоўны альбом або новыя беларускія песні?***

**Алекс:**

— Калі ад «Тузіна хітоў» паступіла такая прапанова, на той момант для нас гэта быў эксперымент. У мяне як саліста перад гэтым быў толькі адзін вопыт запісу матэрыялу не на англійскай мове: аднойчы даводзілася спяваць па-руску. Тады мне не вельмі спадабалася. Усё ж гучанне майго голасу на гэтай мове зусім іншае, чым усе прывыклі, таму я вырашыў, што па-руску спяваць больш не буду. Калі ж паступіла прапанова прадставіць беларускамоўную песню, мы вырашылі паспрабаваць. І калі пачалі ўжо запісваць, я зразумеў, што гэта зусім іншае адчуванне, зусім іншая мова — іншы меладызм і вобразнасць. І песня запісалася лёгка.

**Ян:**

— А мне было б вельмі цікава зрабіць штосьці па-беларуску. Насамрэч, так склалася ў жыцці, што з беларускай мовай я практычна не сутыкаўся. Да свайго сораму. Пэўны час я меў стасункі з Вальжынай Морт — яна размаўляе і піша па-беларуску. Тая вобразнасць, сродкі выражэння, якія дае беларуская мова, — нашмат мацнейшыя, чым у рускай мове. Па сваёй фанетыцы, напеўнасці для творчага чалавека беларуская мова, відаць, больш блізкая, чым руская.

**Алекс:**

— Мая мама — настаўніца беларускай і рускай моў. Яна выкладала ў школе. Аднойчы, памятаю, зусім выпадкова я знайшоў дома коласаўскую «Новую зямлю». Адкрыў, а паэма ў рускім перакладзе. Чытаю, а мяне рэальна каробіць ад гэтага. Разумею, што не хапае чагосьці — «солі» ў мове. Калі мы запісвалі «У свеце не адны», я ўзяўся перачытваць Караткевіча. Хацеў увайсці ў кантэкст, падрыхтавацца лепш. Я дастаткова лёгка, бегла размаўляю па-беларуску. Калі б зараз стаяла пытанне пра пераход на беларускую мову ў дзяржаве, я лёгка — на працягу месяца — перайшоў бы на абсалютна вольную беларускую мову. Калі казаць пра атаясамліванне сябе з гэтай мовай, з гэтай зямлёй, гэтай краінай, то ў мяне 100-працэнтнае атаясамліванне. Колькі б я ні ездзіў у Расію, для мяне расійская культура, яе ўспрыманне і ментальнасць — чужое.

Чаму мы не працуем у Маскве? Кожны раз, прыязджаючы туды, я разумею: гэта зусім не маё. Беларусь — абсалютна ўнікальная еўрапейская краіна, са сваім, але тым не менш — еўрапейскім менталітэтам. У нас нашмат менш Азіі, чым у той жа Расіі.

### Гісторыя пра тое, як Алекс Дэвід ледзьве не трапіў у гурт «Іванушкі»:

— Гэта была абсалютна шалёная думка. Мне тады было гады 24. Я зусім выпадкова апынуўся ў Маскве і даведаўся пра кастынг. Пасля спантанна вырашыў паспрабаваць сябе. Як вакаліст я падыходзіў, а вось харэаграфіяй ніколі спецыяльна не займаўся. Таму, вядома, не прайшоў. Напэўна, тады і зразумеў, што мой шлях павінен быць усё ж толькі маім шляхам. Вельмі доўга я адмаўляўся ад музыкі і сыходзіў у нейкія зусім іншыя сферы. Адзінае, што я ведаў, — гэта тое, што я не хачу быць перакладчыкам, нягледзячы на дастаткова сур'ёзны дыплом, які дазваляе мне працаваць перакладчыкам. Тым не менш, я ніколі не хацеў, не хачу і не буду перакладаць. Я не люблю гэта.

## «Мы — беларусы, бо нарадзіліся і выраслі ў Беларусі»

***— У розных інтэрв'ю вы адзначалі, што для напісання беларускамоўнага альбома вас магла б натхніць этнаграфічная экспедыцыя на Палессе.***

**Алекс**:

— Такія думкі ўзнікалі. Памятаю, у сярэдзіне 90-х праводзіўся фестываль культур. Гэта было выдатнае змяшэнне беларускай, рускай, украінскай культур — мне так падабалася! Але зараз гэтае пытанне трошкі не да часу. Пакуль што для «Атлантыкі» яно застаецца адкрытым.

**Ян:**

— Проста мы пайшлі зараз у іншы бок. Але не выключаем, што калі-небудзь вернемся да гэтай задумкі. Было б па-сапраўднаму цікава.

**Алекс:**

— Ёсць адзін нюанс, які нельга не ўлічваць: «Атлантыка» — гэта ўсё ж поп-праект. Такім ён задумваўся з самага пачатку, і пакуль яшчэ не тая фаза, каб дазволіць сабе нейкія радыкальныя змены напрамку.

**Ян:**

— Тым не менш, мы заўсёды атаясамлівалі сябе з Беларуссю і працягваем гэта рабіць, бо мы — беларусы: нарадзіліся і выраслі менавіта тут.

**Алекс:**

—Часам дзіўна назіраць за тымі артыстамі, якія з'ехалі кудысьці і адразу неяк «адсоўваюць» ад сябе сваю радзіму. Якім бы ты ні быў знакамітым, усё роўна ўсе будуць ведаць, дзе твае карані. Ніхто не забывае, што тыя ж «ABBA» — шведы, а «Scorpions» — немцы. Хацелася б, каб людзі памяталі, што мы як музыканты сфарміраваліся менавіта тут — у Беларусі.

**Гутарыў Ілья ЛАПАТО.**

---

Шык-шок

# КОЛЕРЫ СПЯКОТЫ





**ДАЧАКАЛІСЯ. Лета! Якімі фарбамі мода расквеціць спякотны сезон 2011? Модныя зімой чорны і шэры колеры нарэшце саступілі месца яркім расфарбоўкам і белі.**

## ПАРАД НЯВЕСТ?

Не здзіўляйцеся, калі раптам горад будзе нагадваць ЗАГС. Сапраўды гэтым летам — белы колер — хіт сезона. Фасоны белых сукенак незвычайна разнастайныя, таму праблем з выбарам быць не павінна. Самыя модныя мадэлі — лёгкія кароткія белыя сукенкі вольнага крою, які нагадвае жаночую начную сарочку з паўпразрыстымі аборкамі. Актуальны вязаныя рэчы і карункі.

З белай карункавай сукенкай выдатна спалучаюцца як туфлі на высокім абцасе, так і балеткі на плоскай падэшве. Прычым мода дазваляе насіць гэтыя сукенкі і з абуткам на платформе.

Побач з кароткімі белымі сукенкамі ў модзе і доўгія. Празрыстыя, «лятучыя» мадэлі модна насіць з міні-шортамі ў стылі рэтра — выглядае прыстойна і непасрэдна. Вы можаце абраць лёгкія бавоўняныя сукенкі, альбо аддаць перавагу беласнежнаму шоўку. Дзяўчаты з тонкай таліяй могуць насіць сукенкі з паясамі.

І не думайце, што ўсе модніцы абавязаны быць аднаколернымі. Выбірайце адценні: малочны, крэмавы, беласнежны, слановай косці.

У модзе апранаць белае з белым, калі і вопратка, і абутак, і аксесуары аднаго колеру. А можна і спалучаць з іншымі колерамі. Белы дае магчымасць да шырокіх эксперыментаў. Далікатная белая сукенка добра спалучаецца з яскравымі ўпрыгажэннямі і аксесуарамі.

Напрыклад, на шыфонавую сукенку можна павязаць кантрасную стужку. На белым цудоўна выглядаюць модныя зараз буйныя ўпрыгажэнні. З кароткай сукенкай няздрэнна глядзяцца буйныя сумкі. З белымі сукенкамі апранаюць і шляпу — федору, якая зараз надта папулярная.

У свой снежны гардэроб можаце дадаць — укарочаныя белыя штаны (даўжыня крыху вышэй шчыкалаткі), белыя топы без рукавоў, белыя «а-ля сялянская» блузы з вышыўкай, і доўгія спадніцы, якія ўпрыгожаны кветкавай аплікацыяй. Дарэчы, ніз (штаны, шорты, спадніцы) гэтым летам актуальны з высокай таліяй, а верх (топы, блузы) наадварот маюць укарочаны выгляд.

Уладальніцы прыгожых жывоцікаў могуць смела іх выстаўляць «на паказ», што ўпісваецца ў сучасныя модныя тэндэнцыі.

## КВЕТКІ НА АСФАЛЬЦЕ?

У гэта лета дызайнеры прапануюць прыгажуням ўвабрацца не толькі ў «снежныя» рэчы. Аматары яркіх фарбаў могуць быць спакойнымі — у модзе і «фруктовыя» колеры — лімонны, кавуновы, абрыкосны, малінавы. Дададзім сюды яшчэ моркву, фуксію і розныя адценні ружовых. Апошні, між іншым, можа быць як яскравым, так і прыглушаным, як бы размытым і блізкім да колеру пудры.

Рамантычныя дамы могуць падабраць сабе далікатныя жаночыя шыфонавыя сукенкі з драпіроўкамі. А яскравыя асобы, якія жадаюць, каб глядзелі толькі на іх, могуць выбіраць даволі смелыя рэчы — у модзе зноў асіметрыя, спалучэнне кантрасных колераў, так званая блочная афарбоўка, геаметрычны крой. А можа вы хочаце адчуць сябе сапраўднай зоркай? Мода дае вам магчымасць праявіцца — дадаць у гардэроб рэчы з неонавымі адценнямі.

Асобам, якім прыглянуліся рэчы ў цыганскіх матывах, што было папулярна ў мінулым годзе, можна быць спакойнымі: прасторныя сукенкі і доўгія спадніцы з мудрагелістымі арнаментамі і кветкавымі ўзорамі гэтым летам з моды не выпадаюць. Трэнд сезона 2011 — рэчы ў дробную кветку. Побач з кветкавымі становяцца папулярныя прынты з лістотай, галінкамі, фруктамі, рознымі звярамі, а таксама імітацыя афарбоўкі экзатычных жывёл і этна-малюнкі. Такія выявы альбо надрукаваныя на тканіне, альбо нашыты аплікацыямі.

Кветкавыя ўзоры могуць быць як «натуральнымі» так і казачнымі, малюнкі бываюць размытыя і падобныя на фатаграфіі.

## МІНУС 40

Сучасная мода зноў вяртае нас у 70-ыя з іх камбінезонамі і штанамі клёш, сукенкамі-кашулямі, шортамі сафары, банданамі і вячэрнімі накідкамі з вялікімі засцежкамі. Сілуэт 70-ых візуальна робіць фігуру больш стройнай і выцягнутай.

У модзе зноў паласатыя рэчы. Але да традыцыйных чорна-белых палосак дадаліся эксперыменты са спалучэннямі рознакаляровых палосак, прычым імі сёння размалёваныя не толькі сукенкі і топы, але і спадніцы. Палоскі красуюцца як на свабодных так і на рэчах, што аблягаюць, на міні і мідзі.

Актуальныя доўгія сукенкі і спадніцы даўжынёй па шчыкалатку альбо крыху ніжэй калена.







## СПРАВА Ў КАПЯЛЮШЫ

Калі раней шляпы з шырокімі палямі падыходзілі больш для пляжа, сёння без іх не абысціся і на шпацыры па горадзе. Дадайце да такога галаўнога ўбору шырокія чорныя акуляры-матылькі — і адчуйце сябе зоркай.

Сёлета шляпу федора носяць не толькі з джынсамі, але і са спадніцай і нават карункавай кароткай сукенкай.

Вярнуліся каўбойскія шляпы (сёння іх спалучаюць нават з чорнай класічнай сукенкай), папулярны «азіяцкія» галаўныя ўборы і стыль сафары.

Што тычыцца сумак — сёлета папулярныя сплецены з саломкі, рафіі ці тонкіх палосак скуры. Таксама модніцам прапануюцца сумкі з кветкавымі прынтамі. Але майце на ўвазе, калі вы абралі такую рэч, абутак павінен быць аднатонным. І наадварот, калі вы абулі чаравікі ў кветачку, сумка не павінна нагадваць кветнік.

**Падрыхтавала Марына НОВІКАВА.**

# ФОРМУЛА ЗДАРОВАГА СЭРЦА




**НА пытанні чытачоў адказалі загадчыца інфарктнага аддзялення №2 10-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска Наталля ПАЛЯЎКОВА і ўрач-кардыёлаг таго ж аддзялення Ірына ГРЫШЫНА.**

***(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 8, 9 і 10 чэрвеня.)***

***☎— Нясвіж, Марыя Іванаўна. Перанесла на нагах інфаркт, потым зноў быў прыступ. Прымаю пастаянна мілдранат, амладзіпін, берліпрыл. Ці можа зноў паўтарыцца прыступ?***

— Які ў вас ціск?

***— 170/100 і коле ў сэрцы.***

— Гэта высокі ціск. А яшчэ нешта з прэпаратаў вы прымаеце?

***— У залежнасці ад самаадчування — адэльфан ці нітрагліцэрыну.***

— Вам трэба адрэгуляваць ціск. Для гэтага неабходна параіцца з лечачым урачом і разам падабраць прэпараты. Калі ціск стане нармальным, — не 170, а хаця б 150—140 і вы будзеце прымаць усе лекі, то такое можа і не паўтарыцца. Але ж, ведайце, што гэта хвароба хранічная і ваша задача — як мага даўжэй працягнуць стан рэмісіі. Усё ж прыступ можа быць у любы момант, бо многія сардэчнікі залежаць ад надвор'я, нервовага напружання. Калі вы адчуваеце, што баліць сэрца, адразу прымайце нітрагліцэрыну. Калі ж боль не праходзіць, выклікайце «хуткую дапамогу».

***☎— Дзяржынск, Таццяна Ігараўна. У мяне аднойчы рэзка павысіўся ціск — да 180. Каб яго збіць, мне прапісалі эналапрыл. Лякарства прымаю эпізадычна. Яно дапамагло, зараз адчуваю сябе нармальна. Ці варта і далей прымаць прэпарат?***

— Аднаразовае павышэнне ціску можа быць звязана са стрэсавай сітуацыяй і больш ніколі не паўтарацца. Але вам трэба прайсці поўнае абследаванне на выпадак наяўнасці артэрыяльнай гіпертэнзіі. Калі гэты дыягназ пацвердзіцца, лячэнне трэба прымаць сістэматычна і пажыццёва.

***☎— Калінкавічы, Лідзія Іванаўна. У 17-гадовай дачкі часта ўзнікае тахікардыя. Чым гэта можна зняць?***

— Гэта можа быць праяўленнем дысбалансу вегетатыўнай нервовай сістэмы. У такі момант пажадана зняць кардыяграму, каб выключыць парушэнне сардэчнага рытму. Вашай дачцэ неабходна наведаць доктара, які пры неабходнасці прызначыць кардыяграму або ўльтрагукавое даследаванне сэрца, абследаванне шчытападобнай залозы. Таксама трэба кантраляваць узровень артэрыяльнага ціску.

***☎— Смалявічы, Людміла. У мяне цукровы дыябет 2 тыпу. Ціск 180/100. Прымаю эналапрыл, арыфон, амладзіпін. Аднак ціск не нармалізуецца. Ці ёсць больш эфектыўныя прэпараты?***

— Эфектыўныя прэпараты, безумоўна, ёсць. Але ў першую чаргу вам трэба сачыць за ўзроўнем цукру ў крыві. Таксама неабходна адрэгуляваць колькасць ужывання солі, знізіць колькасць вадкасці і, па магчымасці, павялічыць фізічную нагрузку. Напрыклад, рэкамендуецца дазіраваная хада з хуткасцю 50 крокаў у хвіліну. А што тычыцца прызначэння больш эфектыўных лекаў, то гэта трэба абмеркаваць са сваім доктарам. Завочна вельмі цяжка раіць.

***☎— Мінск, Таццяна. 44 гады. У сакавіку 2009 года ў мяне быў гіпертанічны крыз. Ляжала ў бальніцы. Але лячэнне так і не падабралі. Ціск трымаецца на ўзроўні 180/100, 170/90...***

— Калі зараз вострага стану няма, то трэба звярнуцца па дапамогу да ўчастковага ўрача, які і падбярэ прэпараты. Цяпер на базе сталічных раённых паліклінік створаны кардыялагічныя службы. Кожны раён мае сваю цэнтральную раённую паліклініку, дзе ёсць кардыялагічны цэнтр. Калі ўчастковаму ўрачу нешта будзе не зразумела, ён звернецца да калегі-кардыёлага. Тым не менш, трэба знайсці магчымасць падтрымліваць са сваім лечачым урачом пастаянны кантакт. Па-другое, трэба адпаведным чынам ставіцца да прызначэнняў. Пацыент павінен быць прыхільнікам лячэння, паверыць у яго, а калі адзін раз выпіў прэпарат і забыўся, то гэта не лячэнне.

***☎— Гродна, Настасся Уладзіміраўна. Сёлета ў мяне быў гіпертанічны крыз, трапіла ў бальніцу. Там зрабілі ўльтрагукавое даследаванне і высветлілася, што павялічаны левы жалудачак. Наколькі гэта небяспечна?***

— Прычынай гіпертрафіі, або патаўшчэння, левага жалудачка з'яўляецца артэрыяльная гіпертэнзія. Пры такой сітуацыі трэба кантраляваць свой стан з дапамогай ультрагукавога даследавання ці электракардыяграмы, каб у дынаміцы паглядзець, ці ёсць тэндэнцыя да павелічэння гэтых паказчыкаў. Акрамя таго, гіпертонікам звычайна прызначаюць прэпараты, у першую чаргу інгібітары АПФ. Яны служаць прафілактыкай для развіцця гіпертрафіі левага жалудачка.

***☎— Капыльскі раён, Кацярына, 38 гадоў. Прымаю берліпрыл і эгілок. Колькі часу можна піць эгілок?***

— Прымаць эгілок трэба столькі, колькі патрэбна па прадпісанні ўрача. Пры прыёме гэтага прэпарата трэба сачыць за частатой сардэчных скарачэнняў. Калі яна складае менш за 50 або з'яўляецца парушэнне праводнасці, што выяўляецца на электракардыяграме, то доктар можа паступова знізіць дозу ці ўвогуле адмяніць прэпарат. Аднак рэзка кідаць піць эгілок нельга.

***— Ці нармальна гэта, калі перад крытычнымі днямі падымаецца ціск?***

— Важна, наколькі менавіта падымаецца ціск. Калі ў межах нормы — да 140/80 мм рт. сл., то гэта бяспечна.

***— У інструкцыі да прэпарата «Эгілок» адзначаецца, што падчас яго прыёму нельга ўжываць алкаголь. А ці можна зрэдку выпіць бакал віна?***

— Сапраўды, не рэкамендуецца спалучаць алкаголь і эгілок. Аднак калі форма прэпарата — непрацяглага дзеяння і вы з раніцы прынялі невялікую дозу, то вечарам можна выпіць крыху віна.

***☎— Шаркоўшчына, Ганна Антонаўна, 80 гадоў. У мяне ішэмічная хвароба сэрца, параксізмальная мігальная арытмія. Прымаю аміядарон, метапралол, палакард па 1 таблетцы ў дзень. Прыступы амаль спыніліся. Але з'явілася слабасць з-за нізкага ціску: ніжні не перавышае лічбаў 58—54. У гэты час мне вельмі дрэнна...***

— Трэба кантраляваць артэрыяльны ціск, рабіць электракардыяграму, ультрагукавое даследаванне сэрца, рэгулярна наведваць урача. Кароткія збоі могуць быць прадвеснікам новага зрыву рытму. Каб яго папярэдзіць, трэба падысці да доктара і адрэгуляваць лячэнне.

***☎— Слонім, Барыс Канстанцінавіч, 87 гадоў. У мяне стаіць электракардыястымулятар. Ён працуе нармальна, пульс 65, роўны, а без стымулятара — 30. Аднак падчас планавай праверкі знайшлі экстрасісталы. Што з лекаў трэба прымаць у гэтым выпадку і ў якой колькасці?***

— Аб тым, ці трэба піць нейкія прэпараты, вам сказалі б падчас планавай праверкі. Значыць, экстрасісталы ў вас рэдкія і асаблівага лячэння ў сувязі з гэтым не патрабуецца. Але ж для ўмацавання сардэчнай мышцы можна папрымаць прэпараты тыпу «Трымезідзін». Аднак лекі ўсё ж прызначае ўрач пры асабістым кантакце.

***☎— Гомельская вобласць, Алеся Мікалаеўна. Майму бацьку 55 гадоў. Ён перанёс інфаркт. Спачатку ляжаў у рэанімацыі, потым — у кардыялогіі, прайшоў курс рэабілітацыі. Зараз на бальнічным дома, прымае ўсе прэпараты. Якімі могуць быць наступствы інфаркту?***

— Каб пазбегнуць больш цяжкіх ускладненняў, вашаму бацьку трэба прымаць лячэнне пажыццёва і пастаянна, нават калі ён адчувае сябе нядрэнна. Абавязкова трэба сачыць за ўзроўнем халестэрыну ў крыві і рэгулярна рабіць ультрагукавое даследаванне сэрца. Трэба больш рухацца, ужываць больш фруктаў і гародніны.

***— А ці можна абследавацца ў Мінску?***

— Абследавацца можна ў нашай 10-й клінічнай бальніцы. Тэлефон загадчыцы аддзела платных паслуг — 340 85 08, рэгістратуры платных паслуг — 345 32 71.

**Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 27 июня 2011 года повторного открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

| Номер предмета торгов | № 1 | № 2 |
|---|---|---|
| Наименование и характеристики имущества, входящего в состав лота | здание склада (здание хранилища (литер А 1/К), инвентарный номер 500/С-38265) общей площадью 1601,6 кв. м | четырехэтажное блочное незавершенное законсервированное здание спального корпуса с холодной пристройкой общей площадью 1557,9 кв. м, инв. номер 600/U-75605 |
| Местонахождение имущества | г. Минск, пр-д Масюковщина, д. 2, корп. 2. | Минская обл., Минский р-н, район деревни Заречье-1 |
| Сведения о земельном участке | кадастровый номер 500000000006001528, площадь 1,5886 га | кадастровый номер 623681700001000492, площадь 0,0973 га |
| Организатор аукциона | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, 220030, г. Минск | |
| Балансодержатель | ООО «НПКФ «Гиада», пер. Домашевский, д. 9, комн. 512 | ЗАО «Инвесткапстрой», ул. Свердлова, 2, г. Минск |
| Начальная цена | 1 577 524 410 белорусских рублей | 654 576 300 белорусских рублей |
| Сумма задатка | 100 000 000 белорусских рублей | 65 000 000 белорусских рублей |

На продаваемое имущество обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней, примененных экономических санкций.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк», г. Минск, код 153001369, получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Заявитель, желающий участвовать в торгах по нескольким предметам торгов, вносит задаток в размере, установленном для предмета торгов с наибольшей начальной ценой.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый предмет торгов. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **27 июня 2011 года** в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 13.06.2011 по 24.06.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 13.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок:**
**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости».**



ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА III КВАРТАЛ АБО 2-е ПАЎГОДДЗЕ 2011 ГОДА

## З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 14 600 рублёў на месяц<br>87 600 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 13 400 рублёў на месяц<br>80 400 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 24 800 рублёў на месяц<br>148 800 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 22 200 рублёў на месяц<br>133 200 рублёў на паўгоддзе |

ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ»* (праз кіёск РУП «Белсаюздрук»)

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 13 250—13 350 рублёў на месяц<br>79 500—80 100 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 12 120—12 150 рублёў на месяц<br>72 720—72 900 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 19 591—22 511 рублёў на месяц<br>117 546—135 066 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 18 063—20 140 рублёў на месяц<br>108 378—120 840 рублёў на паўгоддзе |

* Залежыць ад рэгіёна


## ТАБЛЕТКІ NIZORAL ЗНІМАЮЦЦА З ВЫТВОРЧАСЦІ

Французскае ўрадавае агенцтва па наглядзе за лекавымі прэпаратамі і прадуктамі (Afssaps) забараніла продаж у краіне таблетак Nizoral, якія шырока выкарыстоўваюцца для лячэння грыбковых захворванняў, з-за небяспечных пабочных дзеянняў на печань. У заяве нагляднага органа гаворыцца, што таксічнае ўздзеянне на печань таблетак Nizaral праяўляецца часцей і ў больш цяжкай форме, чым ад іншых супрацьгрыбковых прэпаратаў.

Afssaps адзначае, што забарона тычыцца толькі таблетак, а не мазяў і крэмаў, якія выпускаюцца пад той жа маркай. У інструкцыі па прымяненні таблетак Nizoral пячоначная недастатковасць указваецца як адно з проціпаказанняў для іх прыёму.

Nizoral выпрабляецца фірмай Janssen—Cilag — французскай даччынай кампаніяй фармацэўтычнага гіганта Johnson&Johnson. Агенцтва «Франс Прэс» паведамляе, што забарона на продаж таблетак Nizoral у Францыі аўтаматычна пацягне адмену экспарту гэтага сродку ў іншыя краіны...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Ліст у нумар*

# ЛЮБЯЧЫ, НЕ ВЫРАКАЮЦЦА!

**...У адным з нумароў газеты балюча «зачапілі» словы, што «Звяздзе», маўляў, трэба шукаць сваю нішу. «Зачапілі» так, што дагэтуль не магу супакоіцца: гэта ж куды, у якую такую нішу, хочуць загнаць найстарэйшую, найшаноўнейшую беларускую газету — адзіную (са штодзённых) на роднай мове, газету-патрыётку, газету-змагарку. Бо калі знікне мова, знікне нацыя, знікне дзяржава Беларусь. Гэта ж жахліва!**

Найвялікшая заслуга «Звязды» перад народам, перад гісторыяй ужо ў тым, што яна, нягледзячы ні на што, выходзіць!.. А таму перад пакаленнямі звяздоўцаў я асабіста схіляю галаву — за журналісцкае майстэрства, за апантанасць у рабоце, за любоў да людзей, з якімі ствараецца амаль кожны нумар.

У іх, гэтых нумарах, усебакова адлюстроўваецца жыццё краіны, яе насельнікаў. Выходзяць некалькі спецыяльных дадаткаў. Шмат матэрыялаў прысвечана эканоміцы і народнай гаспадарцы, працы важнейшых прадпрыемстваў, іх калектываў. Рэгулярна друкуюцца парады па медыцыне, па гаспадарцы. Шмат цікавых гістарычных матэрыялаў, даследаванняў беларускіх вучоных, якія публікуюцца ўпершыню...

Пералік накірункаў і тэм можна працягваць, але ж колькі не кажы «халва», саладзей не стане — «Звязду» трэба выпісваць і чытаць, тады будуць навідавоку яе дыяпазон, яе высакародная місія, а не ніша (слова якое брыдкае).

Можа, той, хто прапаноўваў пашукаць яе, ацэньвае газету па ўзроўні тыражу?

Дык у ім жа вінавата не рэдакцыя, і нават не чытачы. Вінаваты, па-мойму, узровень іх даходаў і наша сумнавядомае моўнае становішча: у краіне, дзе большасць насельніцтва не чуе беларускай мовы, развучылася размаўляць на ёй, чытаць і пісаць, іншага чакаць не даводзіцца. Гэта наша бяда, бяда, з якой трэба змагацца. І ў першую чаргу — чыноўнікам.

Спадзяюся, што «Звязда» і надалей будзе трымацца! Будзе працягваць сваю высакародную справу. Безумоўна ж, з падтрымкай чытачоў, людзей, якія не выракаюцца свайго — сваёй мовы, сваёй Бацькаўшчыны і сваёй газеты.

**Алена МАРОЗАВА, заслужаны работнік культуры Беларусі,** *г. Мінск.*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Аукцион состоится **14 июля 2011 года в 11.00** по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12, конференц-зал. Организатором аукциона является РУП «Белтелеком» в лице Могилевского филиала РУП «Белтелеком», находящегося по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12.

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

1. Отдельные помещения на 4 этаже в капитальном строении (здание АТС 24), общей площадью 521,0 кв.м. (33,8; 20,9; 15,5; 36,6; 15,4; 20,5; 15,5; 20,3; 35,2; 23,6; 12,1; 95,2; 176,4) по ул.Турова, 1 в г. Могилеве. Срок договора аренды – на неопределенный срок, но не менее 3-х лет; коэффициент по пункту 9.2. Указа Президента Республики Беларусь от 23.10.2009 года № 518 «О некоторых мерах аренды и безвозмездного пользования имуществом» 3,0; целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещение офиса, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли, требуется капитальный ремонт. Помещения будут выставлены на аукцион по продаже права заключения договоров аренды тринадцатью лотами:

**Лот № 1:** Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет 295 750 рублей, размер задатка составляет 29 575 рублей.

**Лот № 2:** Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет 182 875 рублей, размер задатка составляет 18 285 рублей.

**Лот № 3:** Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет 135 625 рублей, размер задатка составляет 13 560 рублей.

**Лот № 4:** Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет 320 250 рублей, размер задатка составляет 32 025 рублей.

**Лот № 5:** Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет 134 750 рублей, размер задатка составляет 13 475 рублей.

**Лот № 6:** Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет 179 375 рублей, размер задатка составляет 17 938 рублей.

**Лот № 7:** Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет 135 625 рублей, размер задатка составляет 13 563 рублей.

**Лот № 8:** Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет 177 625 рублей, размер задатка составляет 17 763 рублей.

**Лот № 9:** Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет 308 000 рублей, размер задатка составляет 30 800 рублей.

**Лот № 10:** Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет 206 500 рублей, размер задатка составляет 20 650 рублей.

**Лот № 11:** Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет 105 875 рублей, размер задатка составляет 10 588 рублей.

**Лот № 12:** Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет 833 000 рублей, размер задатка составляет 83 300 рублей.

**Лот № 13:** Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет 1 543 500 рублей, размер задатка составляет 154 350 рублей.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049.

Документы на участие в аукционе принимаются **с 14.06.2011 года по 08.07.2011** в рабочее время (с 8.00 до 17.00) по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12, каб. 401. Документы, поданные после 08.07.2011 года, не рассматриваются.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

- перечисляет задаток на с/с 3012200007522 в филиале № 700 Могилевского областного управления АСБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700838273, Могилевский филиал РУП «Белтелеком»;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- представляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо представляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;
- юридическое лицо: резидент Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица представляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным, а участника аукциона – победителем.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется участником, выигравшим торги.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Контактные телефоны: (8 0222) 29 21 33, 29 22 13, факс 22 54 58.**



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Аукцион состоится **14 июля 2011 года в 11.50** по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12, конференц-зал. Организатором аукциона является РУП «Белтелеком» в лице Могилевского филиала РУП «Белтелеком», находящегося по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12.

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

1. Отдельные помещения на 4 этаже в капитальном строении (четырехэтажное каменное здание АТС с двумя тамбурами), общей площадью 607,9 кв.м (39,4; 9,7; 558,8) по ул. Островского д. 52 в г. Могилеве. Срок договора аренды – на неопределенный срок, но не менее 3-х лет; коэффициент по пункту 9.2. Указа Президента Республики Беларусь от 23.10.2009 года № 518 «О некоторых мерах аренды и безвозмездного пользования имуществом» 3,0. Целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещение офиса, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли, требуется капитальный ремонт. Помещения будут выставлены на аукцион по продаже права заключения договоров аренды тремя лотами:

**Лот № 1**. Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет 344 750 рублей, размер задатка составляет 34 475 рублей.

**Лот № 2.** Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет 84 875 рублей, размер задатка составляет 8 488 рублей.

**Лот № 3**. Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет 4 889 500 рублей, размер задатка составляет 488 950 рублей.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049.

Документы на участие в аукционе принимаются **с 14.06.2011 года по 08.07.2011** в рабочее время (с 8.00 до 17.00) по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 12, каб. 401. Документы, поданные после 08.07.2011 года, не рассматриваются.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

- перечисляет задаток на с/с 3012200007522 в филиале № 700 Могилевского областного управления АСБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700838273, Могилевский филиал РУП «Белтелеком»;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- представляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо представляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;
- юридическое лицо: резидент Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица представляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным, а участника аукциона – победителем.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется участником, выигравшим торги.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Контактные телефоны: (8 0222) 29 21 33, 29 22 13, факс 22 54 58.**


## ФЭН-ШУЙ ГАРАСКОП

**НЯДЗЕЛЯ, 12 ЧЭРВЕНЯ**

Спрыяльны дзень для прапановы рукі і сэрца, атрымання ўзнагароды або адказу, задавальнення просьбаў, атрымання прызнання, дасягнення выніку сваіх намаганняў.

**ПАНЯДЗЕЛАК, 13 ЧЭРВЕНЯ**

Дзень добры для пачатку навучання ў школе або на курсах, для бізнэсу, сацыяльнай дзейнасці, грамадскіх спраў, завяршэння здзелак, просьбы аб павышэнні па службе або пачатку новай працы.

**АЎТОРАК, 14 ЧЭРВЕНЯ**

Неспрыяльны дзень для пачатку лячэння, наведвання хворых. Спрыяльны для закладкі падмурка або пачатку працоўнага праекта. Усё будзе развівацца паспяхова, імкнуцца да багацця. Пачынайце важныя справы як у асабістым жыцці, так і ў бізнэсе.

**СЕРАДА, 15 ЧЭРВЕНЯ**

Спрыяльны для лячэння. Неспрыяльны для пачатку судовай цяжбы, для інтрыг і непрыстойных учынкаў у адносінах. Імкніцеся не выпускаць маленькіх дзяцей з дома.

**ЧАЦВЕР, 16 ЧЭРВЕНЯ**

Гэта дзень, калі дасягае піку ваша фізічная энергія. У такі дзень добра займацца справамі, якія патрабуюць канцэнтрацыі і намаганняў.

**ПЯТНІЦА, 17 ЧЭРВЕНЯ**

Спрыяльны для любых спраў, якім патрэбен добры старт і ад якіх жадаюць атрымаць годны вынік. Выдатна падыходзіць для важных крокаў ва ўзаемаадносінах, шлюбе.

**СУБОТА, 18 ЧЭРВЕНЯ**

Спрыяльны для вандраванняў. Неспрыяльны для шлюбу. Неспрыяльна турбавацца стыхію Дрэва: займацца цяслярскай або сталярнай працай, а таксама садовымі працамі. Падтрымлівайце ў доме добрае асвятленне.

## Важныя дробязі

### ЖАНЧЫНЫ ЎМЕЮЦЬ КАНЦЭНТРАВАЦЦА АДРАЗУ НА НЕКАЛЬКІХ ЗАДАЧАХ



**Жанчыны здольныя больш працяглы час працаваць над некалькімі задачамі, пастаўленымі аднachасова, чым прадстаўнікі моцнага полу.**

Навукоўцы прапанавалі пяцідзесяці дамам і такой жа колькасці кавалераў выканаць шэраг немудрагелістых задач. Удзельнікам эксперыменту трэба было на працягу васьмі хвілін знайсці на карце рэстаран, рашыць элементарны матэматычны прыклад і скласці графічны план пошуку ключа ва ўяўным полі. Натуральна, усё гэта патрабавалася зрабіць як мага хутчэй, уклаўшыся ў тыя самыя восем хвілін. Таксама падчас выпрабавання ўсім добраахвотнікам тэлефанавалі. Ці адказваць на званок — кожны быў вольны вырашыць сам. У выніку дамы значна лепш справіліся з усімі чатырма заданнямі. Даследчыкі лічаць, што цудоўны пол наогул праяўляе значна больш выражаныя здольнасці. Жанчыны могуць не толькі сканцэнтравацца на адной думцы, але і працягваць пры гэтым успрымаць, а таксама аналізаваць іншыя падзеі.

### КАХАННЯ З ПЕРШАГА ПОЗІРКУ НЕ БЫВАЕ

**Навукоўцы даказалі, што пры першай сустрэчы чалавек зведвае толькі страсць і сімпатыю. У даследаванні, праведзеным спецыялістамі, прынялі ўдзел некалькі сотняў пар, якія знаходзяцца ў стасунках ужо на працягу доўгага часу.**

Падчас эксперыменту ацэньваліся ўзровень даверу людзей адно да аднаго і стабільнасць адносін. Падчас выпадковай сустрэчы чалавек не можа даведацца пра звычкі і характар партнёра, што і прыводзіць да раптоўнага разрыву адносін.

### УЛАДАЛЬНІКІ БЛАКІТНЫХ ВАЧЭЙ БОЛЬШ ПАСПЯХОВЫЯ



**Навукоўцам удалося выявіць сувязь паміж колерам вачэй і здольнасцямі чалавека. Блакітныя вочы — не толькі эталон прывабнасці, але і паказчык інтэлектуальных здольнасцяў. Блакітнавокія людзі больш паспяховыя ў акадэмічным навучанні, чым уладальнікі больш цёмных вачэй. У светлавокіх прадстаўнікоў чалавецтва лепш развіта стратэгічнае мысленне, і яны лепшыя гульцы ў гольф.**

Псіхолагі ўжо даўно заўважылі, што характар і колер вачэй звязаны паміж сабой. Так, уладальнікі шэрых, блакітных і сініх вачэй — заўсёды ўпэўнены ў сабе. Людзі з зялёнымі або карычнева-зялёнымі вачамі непаслядоўныя і непастаянныя. Каравокія людзі здольныя пакарыць любога сваім абаяннем.

### САМЫЯ СПАКУСЛІВЫЯ МУЖЧЫНСКІЯ... НЕДАХОПЫ



**Навукоўцы склалі спіс мужчынскіх недахопаў, якія жанчыны лічаць вельмі прывабнымі. Хоць, вядома, не ўсе дамы згодны прызнацца ў такіх дзівацтвах.**

Аказваецца, у першую чаргу жанчын прыцягвае пах мужчынскага поту. Даследчыкі з Каліфарнійскага ўніверсітэта тлумачаць гэта тым, што ў яго склад уваходзіць андрастадыенон. Гэтае рэчыва здольнае выклікаць сэксуальную ўзбуджанасць у прадстаўніц чароўнай паловы чалавецтва. 72% дам-рэспандэнтаў рэагуюць на мужчынскую сівізну. Нямецкія псіхолагі адзначаюць, што жанчыны лічаць яе сэксуальнай іскрынкай мужчын. Па меркаванні прадстаўніц слабага полу, прыкметай мужнасці і гарачага тэмпераменту з'яўляюцца шрамы. Гэта высветлілі падчас апытання прадстаўнікі Ліверпульскага ўніверсітэта. Акрамя таго, як аказалася, жанчын не цікавіць паходжанне шрамаў, яны проста бачаць у мужчынах з рубцамі адвагу і мужнасць. У спіс таксама патрапілі мужчыны ў акулярах. Іх жанчыны лічаць разумнымі. Гэты факт даказалі навукоўцы са Стакгольмскага ўніверсітэта.

### ВЕРНАСЦЬ — ПРЫКМЕТА РОЗУМУ МУЖЧЫНЫ

**Два паралельныя аналізы сацыяльных адносін і ўзроўню інтэлекту дазволілі лонданскім навукоўцам адказаць на пытанне: якія мужчыны здраджваюць радзей?**

Даследаванні паказалі, што чым вышэй IQ мужчыны, тым больш верагодна, што ён застанецца верным сваёй другой палавінцы. «Аналіз паказаў, што разумныя мужчыны больш схільныя да манагаміі, чым астатнія», — растлумачыў навуковец. Першапачаткова мужчына запраграмаваны на непераборлівыя сэксуальныя сувязі, але падчас эвалюцыі неабходнасць пакінуць нашчадкаў любым шляхам адпала. Аднак інстынкт застаўся, і толькі разумныя мужчыны здольныя з ім справіцца і захаваць вернасць адзінай выбранніцы, піша The Telegraph. Таксама ўдалося высветліць, што разумных мужчын аб'ядноўвае не толькі схільнасць да манагаміі, а таксама лібералізм і атэізм. А вось сувязі паміж інтэлектам і сэксуальнымі паводзінамі ў жанчын навукоўцы не выявілі.

### МУЖЧЫНЫ ХЛУСЯЦЬ НА 30% ЧАСЦЕЙ, ЧЫМ ЖАНЧЫНЫ



**Паводле вынікаў нядаўняга даследавання брытанскіх навукоўцаў, сярэднестатыстычны мужчына хлусіць каля трох разоў на дзень, а жанчына — прыкладна два разы. Пры гэтым жанчын, якія нават аднойчы схлусілі, звычайна мучаць згрызоты сумлення, а мужчыны ставяцца да хлусні значна прасцей.**

Даследчыкі правялі эксперымент у Лонданскім Музеі навукі, які паказаў, што мужчыны, у сярэднім, хлусяць 1092 разы на год, а жанчыны — 728 раз на год. Навукоўцы высветлілі, што маленькая хлусня дапамагае людзям у міжпалавых і сацыяльных зносінах. Пры гэтым толькі 10% удзельнікаў даследавання паведамілі, што могуць схлусіць сваім мужам або жонкам.

**Падрыхтавала Ева АДАМАВА.**

АЛЁ, НАРОД НА ПРОВАДЗЕ!
Або весёлыя і праўдзівыя гісторыі з жыцця чытачоў «Звязды»

## ВАЖЦЕ МНЕ, ЯК САБЕ!

Даўней лічылася, што кожная жанчына, калі яна, безумоўна ж, паважае сябе, павінна мець свайго доктара, свайго чалавека (лепш не аднаго) у сферы гандлю, сваю швачку, цырульніцу, педыкюршу, манікюршу...

Але ж часы мяняюцца, мяняецца і пералік прафесій. Цяпер, прынамсі, можна абысціся без свайго чалавека ў паліклініцы: усе неабходныя паслугі "арганізуе" і чужы — праўда, у платным медыцынскім цэнтры. Можна пражыць без блату ў крамах: навошта ён, калі тавараў — хоць каўшамі бяры? Можа асвоіць шэраг сумежных прафесій: самім клеіць шпалеры, вырошчваць гародніну, рабіць манікюр з педыкюрам, шыць, вязаць, нават стрыгчыся! Што жанкі нашы і робяць...

Але ж застаецца сфера, дзе без знаёмства па-ранейшаму аніяк. Ну, вось учора мне трэба было цыбулькі зялёнай купіць, а прадавачка з рынку ціхенька, каб ніхто не пачуў, кажа: "У мяне — неважнецкая, лепш не бярыце...". Свой чалавек!

Акурат такога я шукала сярод гандляроў мясам — купляла яго то ў тых, то ў другіх... Нарэшце пара адна даспадобы прыйшлася: не то сын з маці, не то зяць з цешчай. Але ж абое — хоць да раны іх прылажы: і так табе кавалачак пакажуць, і гэтак, і цану на яго саступяць, і косці пасякуць, і ў пакет усё зложаць, і "Смачна есці! Прыходзьце яшчэ" напаследак скажуць...

Карацей, я задаволена была — аж пакуль не надумала насаліць сабе сала. З'ездзіла па яго на рынак, у тых самых ветлівых людзей купіла, прывезла дамоў. І тут мяне сумненні заелі — наконт вагі. Дай, думаю, пераважу, перш чым саліць... Што атрымалася — не паверыце: заплаціла за шэсць кіль, купіла... чатыры з палоўкай.

Ноч не спала. Раніцой узяла той шмат, павезла назад — на рынак.

Гандляры мае (і народу ж яшчэ не было) у міг, ад слова — толькі шум, маўляў, не падумайце: гэты кавалак забралі, другі (і прыгожанькі, з добрым "запасам") узважылі, у пакет паклалі, прабачэння папрасілі, сваё "Прыходзьце яшчэ" сказалі...

Ну, думаю, і праўда — з кім не бывае, памыліліся людзі. Даравала ім.

А есці ж заўжды нешта трэба і сям'ю карміць — стала зноўку да іх падыходзіць, што-кольвек купляць. Праўда, цяпер пераважвала ўжо...

І, што вы думаеце, неўзабаве зноў на падмане злавіла!

Абурэнню межаў не было: пытаюся, як жа так? Я ж, маўляў, ваша пастаянная пакупніца. Вы ж мяне ўжо падманвалі і прабачаліся. Маглі б, здаецца, запомніць. Чаму зноў за сваё?

Маладзён напраміль Бог:

— Калі ласачка, толькі не шуміце! Мы ўсё кампенсуем — нават маральныя страты (кавалак мяса ў пакет мой кладзе)... І тлумачыць, што пакупнікі (нават пастаянныя) не кожны ж дзень да іх ходзяць — твары запомніць цяжка. "Дык вы, — павучае дзяцюк, — прыйдзеце ў наступны раз і адразу ж кажыце: "Узважце мне, як сабе". Тады ніякіх праблем не будзе!

...Няма іх і сапраўды: усё, што цяпер ні куплю, узважана цюцелька ў цюцельку. Свае людзі!

Вось і падумала: можа некаму яшчэ гэты пароль спатрэбіцца?

**А. Б**, *г. Мінск.*

## ХТО НА ШТО ВУЧЫЎСЯ

...Нехта праўду сказаў: "Коль в сорок лет рассудка нет, — не будет, так живи".

У майго знаёмца гадзіннік зламаўся. Не сказаць, каб зусім — цікае, але ж стрэлкі то чарапахай паўзуць, то вавёркай у коле носяцца. Вырашыў ён паглядзець, з чаго б гэта і, калі атрымаецца, да ладу давесці: адкрыў механізм, нечым пакалупаўся... Пасля гэтага, як і трэба было чакаць, стрэлкі зусім спыніліся — гадзіннік хоць выкідвай.

Але ж тут яго матуля ў райцэнтр сабралася, вырашыла рэч з сабою ўзяць: а раптам?.. Забегла ў майстэрню, гадзіннік майстру падала.

Той узяў, накрыўку зняў, паглядзеў і ў кліенткі пытае:

— У вас дзеці ёсць?

(Тут, мусіць, трэба зазначыць, што маці ў майго знаёмага — цудоўна выглядае... І ўдава. Вось і падумала, што майстар той (а мужчына відны — з вусамі, пры гальштуку) "ціпа" клеіць яе — намер нейкі мае. Ёкнула бабіна сэрца: можа, удавец? Ці разведзены?.. Але ж хлусіць не стала).

— Ёсць, — кажа, — сын.

— І колькі ж яму гадкоў? — цікавіцца гадзіншчык.

— Сорак.

— Працуе недзе?

"Гэта ўжо занадта" — падумала жанчына, але ж, была ні была, як на споведзі, казала далей:

— Так... Ён сталяр... На будоўлі. Няблага зарабляе, але ж са мною жыве — пары дабрацца не можа.

— Дык перадайце хлопцу свайму, — уздыхае майстар, — што кожны павінен сваёю справай займацца — хто на каго вучыўся. Я, прынамсі, са сваім інструментам на яго аб'ект не пайду, але ж хай і ён з сякерай у гадзіннік не лезе.

На тым яны і разышліся. Хоць жанчыне і шкада было.

**А. ЛІПЕНЬ**, *Іўеўскі раён.*

## БРЫГАДНЫ ПАДРАД

Мой аднавясковец у Сібіры дзесь падчапіў мясцовую прыгажуню, кандыдаткай у жонкі прывёз дамоў — бацькам паказаць. Было што: высокая дзяўчына, ладная. Стан — бы вытачаны, губкі, броўкі, як намаляваныя, вочы — хоць вады з іх напіся. Да таго ж прафесію добрую мае — бухгалтар.

Што бацькам заставалася, як прыняць ды вяселлейка зладзіць?..

А там, глядзіш, маладзіца асвойталася крыху, рашыла сям'і паказаць, што не з гліны зеплена, што рабіць таксама штосьці можа. Ну, напрыклад, кароўку падаіць. Не складаная ж гэта навука?

То загнала яна карміцельку ў куст, у цянёк (справа летам была), фартушок прычапіла, услончык паставіла, даёначку побач. І нават даіць пачала сваімі далікатнымі пальцамі... А тут, як на тое ліха, авадні наляцелі. Каroўка то галавой ад іх адмахнецца, то доўгім хвастом — нічога не дапамагае: крывасмокі усё роўна грызуцца. Каб нейкага з-пад бруха адагнаць, карова нагой... І ў даёнку бабах! Хвастом плясь... маладзіцу па твары.

Тая, бедная, з зэдлічка вобзем і ў крык:

— Жэнька (гэта мужу), трымай хвост! Ты, тата, — рогі. А я даіць яе буду.

...Збоку за гэтай сцэнай назірала свякроў. Усё жыццё яна даіла карову адна, думала, што так і трэба. А высвятляецца — не. Малядзя ўсё цяпер робяць пасвойму.

**Пятро БУРСЕВІЧ**, г. *Слонім.*

## ТАННАЯ САЛЯРКА

Дальнабойшчык Валянцін уздоўж і ўпоперак аб'ехаў не толькі Беларусь, але і ці не ўсю Еўропу.

І вось — новая камандзіроўка, у горад Ялец, што паміж Масквою і Растовам.

Дарога як дарога туды: вёскі, лясы, палі, час ад часу — запраўкі.

Непадалёк ад адной бачыць: мужык стаіць на ўзбочыне, вялікім пальцам правай рукі ўніз паказвае, што на шафёрскай мове азначае: "Ёсць "левае" паліва!".

"Дык чаму б не ўзяць? Калі па боскай цане?"— думае кіроўца, спыняе свой грузавы "Мерседэс". А там слова за слова і дамова: "прадавец" бярэ грошы, пакупнік тут жа падрульвае да бензакалонкі, дзе яго, як быццам, чакаюць: да машыны кіруе запраўшчык, устаўляе ў бензабак "пісталет".

Далей — справа тэхнікі: чакае вадзіцель, што вось-вось жа паліва палiецца, а яно ўсё ніяк... І хвіліна прайшла, і пяць... Думае, ці мала што: можа, запраўшчыца задрамала ці з кім забалбаталася, а можа, у аўтаматыцы штосьці заела?

Яшчэ крыху пачакаў. А калі цярпенне лопнула, пайшоў да акенца. Пытаецца: "Чаму ж паліва ў бак не ідзе?" Тая глядзіць на яго:

— А вы што — за яго плацілі?

— Дык жа толькі што! Вашы запраўшчыкі грошы ўзялі. Нават пісталет у бензабак мой уставілі.

— Ах вось яно што?! — смяецца дзяўчына. — Ну то шукайце ветру ў полі — пытайце ў яго сваё паліва! Бо на гэтай запраўцы я адна працую, два гады ўжо... Бачыла раніцай: круціліся пустадомкі нейкія... Што вы купілі ў іх?

— Ды салярку.

— Шмат...

— Шмат...

(Колькі — прызнавацца сорамна. — **Аўт.**).

...Гэта шчасце, што кабета была маладая і вельмі прыгожая — разам пасмяяліся: ну, не плакаць жа?..

А што грошы ляснулі, дык за навуку ж трэба плаціць? Гэта значыць, што цяпер наш Валянцін — верабей стрэляны: убачыць на дарозе чалавека з "лішнім палівам" і адразу газку дадае: не трэба яму танная салярка.

**Аркадзь ЖУРАЎЛЁЎ**, *г. Маладзечна.*

## РАБЫ І БЕЛЫ

Расла я ў вельмі дружнай, працавітай сям'і і, як кажуць, на ўсім сваім: свая ў нас была садавіна—гародніна, свой мёд, сваё малако і мяса. Прычым мець гэтых прадуктаў і мы, і іншыя вяскоўцы маглі б намнога больш, калі б не душылі падаткамі. Бралі (ці нават "дралі"?) іх тады за ўсё — нават за "лішнюю" яблыню! Што ўжо казаць пра скаціну? Таму людзі, як маглі, падманвалі, хітрылі, выкручваліся. Што было рабіць?

Канкрэтны прыклад? Ды калі ласка.

У той дзень па вёсцы пагалоска прайшла, што будуць "трэсці" — правяраць, у каго ёсць лішняя жывёла. У нас — карова ў полі, ды і адна, гэта можна, бычок ля рэчкі пасецца — гэта таксама не злачынства. А вось са свінствам — праблема: лішні парсюк у хлявушку стаіць.

"Трэба схаваць", — вырашылі бацькі. І нават прыдумалі дзе — у вялізазным кусце бэзу, што рос за гародамі.

Але ж вырашыць гэтак лёгка, а вось парсюка завесці...

За вядром, трэба сказаць, ён не пойшоў, таму бацька стаў цягнуць на вяроўцы. Мы, дзятва, ззаду — падпіхаць ды падганяць... А свінчо ж дурное: не ведае, што яго ў тым кусце чакае, думае, напэўна, што заколюць. І вішчыць — ну, як перад сканаsucc! Вэрхал на ўсю акругу, на ўсю нашу вуліцу!.. Па якой і акурат у тую часінку (закон подласці ў дзеянні)... праверальшчыкаў нячысцік нясе.

Ідуць яны, значыць (два валожынскія інспектары, старшыня сельсавета) і "цырк" наш, зразумела ж, бачаць: і тату, і дзяцей, і гарластага рабога парсюка...

Але ж, як ішлі, так пайшлі сабе — на нашым падворку "шмону" не было.

Чакаем яго назаўтра. Зноў карову выганяем у поле, навязваем бычка і гонім парсюка ў той бэз.

Тут бы здагадацца: што трэба белага, каб учарашняга, рабога, у хляве камісія ўбачыла, але ж ён (той рабы) большы, і калі забярэш (а такое магло быць), то яго ж больш шкада тады будзе...

Акурат пасля абеду прыходзіць да нас камісія — інспектар і старшыня сельсавета (дай бог, яму здароўя і доўгіх гадоў жыцця!). Тата вядзе іх у хлеў, паказвае: вось, маўляў, мая гаспадарка — кабанчык, куры, качкі... Інспектар запісвае, пытанні задае, а старшыня хітравата так усміхаецца і маўчыць. У паветку зазірнуў, у склеп. А калі з двара сыходзілі, ціхенька тату кажа:

— Ты, Валодзя, усю ноч, відаць, свайго кабанчыка... мыў? Добра атрымалася — аж белы стаў.

Што было бацьку казаць? Маўчаў. Чакаў, пераджываў, што далей будзе і чым абернецца?

На шчасце, скончылася ўсё па-людску: бацька потым запрасіў старшыню да хаты і добра-такі пачаставаў. У тым ліку — кумпячком ад рабога кабанчыка.

**Лілія ВАСІЛЕЎСКАЯ**, *в. Трабы, Іўеўскі раён.*

**P.S.** *Парадоксы гісторыі: цяпер усё гэта падаецца камічным, а тады... Колькі жаху перажылі нашы бацькі, колькі нервовых клетак, здароўя спалілі — з-за чужой дураты.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

## АГУРКОЎ ХОПІЦЬ І САМІМ, І НА ЭКСПАРТ

**У краіне працягваецца актыўная нарыхтоўка агуркоў ад насельніцтва: штодня ў гэтай сферы занятыя каля 40 аўтамашын прадпрыемстваў спажывецкай кааперацыі, паведаміlі рэдакцыі ў Белкаапсаюзе. Ужо закуплена 2,4 тысячы тон, у тым ліку ад насельніцтва 680 тон, што на 35 працэнтаў больш у параўнанні з аналагічнай датай мінулага года.**

Агуркі закупліваюцца пераважна ў Столінскім, Пінскім, Кобрынскім, Шклоўскім раёнах. У сувязі з вялікім ураджаем агуркоў і павышаным попытам на іх у расійскіх рэгіёнах з-за забароны ўвозу гароднiны з ЕС прадпрыемствы спажывецкай кааперацыі актывізавалі пастаўку агуркоў на экспарт у Расійскую Федэрацыю. У прыватнасці, туды ўжо прададзена першая партыя ў колькасці 20 тон, зараз рыхтуецца да адпраўкі наступная партыя.

Таксама ад насельніцтва закуплена 2,3 тысячы тон ранняй свежай белакачаннай капусты. Паводле слоў спецыялістаў, у сёлетнім нарыхтоўчым сезоне закупка ранняй капусты айчыннай вытворчасці пачалася значна раней, чым у папярэднія гады, таму ў спажыўцоў зараз няма праблем з набыццём гэтага віду вітаміннай прадукцыі.

Прадпрыемствы спажывецкай кааперацыі таксама пастаўляюць на ўнутраны рынак бульбу і сталовую гародніну мінулага ўраджаю.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ТРОЙЦА

*Святочны дзень!*
*Усё квітнее,*
*Кранае вецер кроны дрэў,*
*Расліны пышна зеляянеюць,*
*Ліецца птушак мілы спеў.*
*Спаслання сёння*
*мы чакаем*
*Святога Духа*
*ў сэрцы нам*
*І роснай раніцай*
*спяшаем*
*Усёй сям'ёй у Божы храм.*

**Людміла ПРАХАЦКАЯ,** *г. Мінск*

## Семінарыю закрылі ў 1918-м. Адкрылі ў 2011-м

**У Віцебску ў гістарычным цэнтры праз 93 гады пасля свайго закрыцця зноў пачала дзейнічаць духоўная семінарыя для навучання праваслаўных святароў — другая ў нашай краіне. Семінарыя створана на базе духоўнага вучылішча. Рэктарам прызначаны архіепіскап Віцебскі і Аршанскі Дзімітрый. Рашэнне аб аднаўленні ВНУ для святароў было прынята Сінодам Рускай Праваслаўнай царквы.**

Як расказалі "Звяздзе" ў епархіяльным упраўленні, да 1872 года семінарыя дзейнічала ў Полацку. У 1918-м, у пачатку барацьбы з рэлігіяй, дзверы семінарыі зачынілі па загадзе ўлады. Статус вышэйшай духоўнай навуковай установы праз дзесяцігоддзі атрыманы ў выніку намаганняў архіепіскапа, выкладчыкаў духоўнага вучылішча. Сярод выкладчыкаў ёсць доктар гістарычных навук, кандыдаты багаслоўя. Бібліятэчны фонд семінарыі налічвае каля 14 тысяч выданняў, ёсць інтэрнат, спартыўная зала свае пякарня, майстэрні. Існуе таксама і завочная, і вячэрняя форма навучання.

У гонар аднаўлення семінарыі ў таксама адбудаваным храме — Свята-Успенскім кафедральным саборы — адбыўся малебен.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**Кватэрнае пытанне**

## Дом не толькі прыбіраюць...

***Значныя сумы мы, жыхары шматкватэрных дамоў, плацім за тэхнічнае абслугоўванне. Цікава ведаць, на што павінны расходавацца гэтыя грошы, апроч платы дворнікам і прыбіральшчыцам?***

**Г. Рудэнка,** *г. Слуцк*

У адпаведнасці з артыкулам 51 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь наймальнікі, уласнікі жылых памяшканняў, члены арганізацыі грамадзян-забудоўшчыкаў у шматкватэрных жылых дамах абавязаны штомесяц удзельнічаць у фінансаванні долі затрат па фактычных выдатках, звязаных з эксплуатацыяй і рамонтам дапаможных памяшканняў, канструктыўных элементаў, інжынерных сістэм, утрыманнем прыдамавых тэрыторый сувымерна агульнай плошчы жылых памяшканняў, якія яны займаюць у гэтых дамах.

Згодна з Інструкцыяй аб парадку аплаты насельніцтвам жыллёва-камунальных паслуг (зацверджана пастановай Мінжылкамгаса ад 24 мая 2004 г. № 13) тэхнічнае абслугоўванне ўключае работы падрадных арганізацый па бягучым утрыманні жылых дамоў і прыдамавых тэрыторый (бягучая эксплуатацыя і рамонт агульнай маёмасці жылых дамоў, прыбіранне і асвятленне дапаможных памяшканняў, прыдамавой тэрыторыі).

Агульная маёмасць жылога дома — гэта міжкватэрныя лесвічныя клеткі, лесвіцы, ліфты, ліфтавыя і іншыя шахты, калідоры, дахі, тэхнічныя паверхі і падвалы, іншыя часткі і месцы агульнага карыстання, апорныя, абмежавальныя неапорныя канструкцыі, якія знаходзяцца ў карыстанні ўласнікаў і наймальнікаў жылых памяшканняў і з'яўляюцца неад'емнымі часткамі жылога дома, а таксама механічнае, электрычнае, сантэхнічнае і іншае абсталяванне, якое знаходзіцца за межамі або ўнутры жылых і (ці) нежылых памяшканняў, элементы інжынернай інфраструктуры, азеляненне і добраўпарадкаванне, асобныя аб'екты, якія служаць мэтаваму выкарыстоўванню будынка.

Утрыманне прыдамавой тэрыторыі ўключае работы па прыбіранні смецця, снегу, рамонце пакрыццяў праездаў, праходаў, доглядзе зялёных насаджэнняў і інш.

У цэлым тэхнічнае абслугоўванне жылога дома павінна ўключаць работы па кантролі і забеспячэнні належнага тэхнічнага стану будынка, забеспячэнні працаздольнасці і спраўнасці ўсіх яго інжынерна-тэхнічных сістэм, падрыхтоўцы да сезоннай эксплуатацыі жылога дома, а таксама па забеспячэнні выканання санітарна-гігіенічных патрабаванняў да ўтрымання, абсталявання і ўтрымання жылых дамоў і прыдамавой тэрыторыі.

**Віктар САВІЦКІ.**

## ДОБРЫЯ ЛАПЫ — У ДОБРЫЯ РУКІ

**Каля трох дзясяткаў катоў і сабак знайшлі сабе новых гаспадароў на акцыі «Быць дабру», якую правяла ў Бабруйску гарадская арганізацыя па ахове жывёл «Дабрачыннасць».**


**«Хадзем дадому, гаспадар!»**

Вулічным катам і сабакам, якія трапілі ў месца часовага знаходжання для бяздомных жывёл, праз некалькі дзён пагражала ўсыпленне. Многім з ім далі прытулак і, лічы, новае жыццё бабруйчане. Людзі засталіся неабыякавымі да лёсу братоў меншых. «Яны ўсе цудоўныя: хатнія альбо бяздомныя, усе хочуць любові, ласкі і клопату,» — казалі шчаслівыя гаспадары катоў і сабак, якіх яны прыдбалі на акцыі ў гарадскім парку.

Гэтай акцыяй, дарэчы, актывісты «Дабрачыннасці» адзначылі двухгоддзе сваёй арганізацыі, якая абараняе жывёл. Не, яны не паліваюць фарбай натуральныя футры на модніцах, як на Захадзе. Іх праца ў Бабруйску больш празаічная: яны забіраюць бяздомных жывёл з вуліц і з месцаў часовага ўтрымання камунальных службаў, за свае сродкі лечаць і кормяць іх, а потым імкнуцца знайсці катам і сабакам бяспечны прытулак і новых гаспадароў.

За два гады «Дабрачыннасці» ўдалося прыстроіць каля паўтысячы жывёл, як паведаміла лідар арганізацыі Вольга Азаронак. Амаль усіх катоў і сабак, якіх прывезлі на акцыю ў гарадскі парк, разабралі, а тыя, што засталіся, будуць браць удзел у новай, ужо запланаванай, дабрачыннай акцыі па прыцягненні ўвагі да бяздомных жывёл.

**Ілона ІВАНОВА.**

Уладзімір АБРАМАЎ:

# «ЗАРАБЛЯЦЬ ДАСТОЙНЫЯ ГРОШЫ МОЖНА І Ў ВЁСЦЫ, ДЛЯ ГЭТАГА НЕ ТРЭБА ЕХАЦЬ У СТАЛІЦУ»

**ЗАЎСЁДЫ існаваў такі стэрэатып — калі хочаш нармальна зарабляць, то трэба абавязкова ехаць у буйны горад. Там і працу лягчэй знайсці, і заробкі вышэй, і магчымасцяў для адкрыцця свайго бізнэсу болей. А ці насамрэч так? Ці можна жыць у вёсцы і атрымліваць добрыя грошы? Уладзімір АБРАМАЎ, дырэктар Мясцовага фонду ўстойлівага развіцця «Афлатус», перакананы — можна! Гэты фонд створаны зусім нядаўна некалькімі энтузіястамі (сярод іх ёсць псіхолаг, рэстаўратар, доктар, банкір, праграміст і г. д.) і плануе пачаць сваю дзейнасць з вёскі Вішнева Смаргонскага раёна — а менавіта паспрабаваць дапамагчы мясцовай моладзі арганізаваць свой бізнэс у сферы інфармацыйных тэхналогій.**



— Мы стварылі грамадскую арганізацыю — Мясцовы фонд устойлівага развіцця «Афлатус», які будзе займацца падтрымкай прадпрымальніцтва ў малых гарадах і сельскай мясцовасці. Асноўная ідэя заключаецца ў тым, каб паказаць людзям, што неабавязкова ехаць некуды ў Мінск ці ў буйныя гарады, каб зарабляць добрыя грошы. На Захадзе мара любога — жыць у сельскай мясцовасці, на прыродзе і зарабляць грошы. У нас ёсць усе ўмовы для гэтага — зараз ёсць інтэрнэт, які такія магчымасці прадастаўляе.

**— Чаму менавіта Смаргонскі раён?**

— Усё проста — там у мяне лецішча, і адтуль вырашылі пачаць. Ужо ёсць дамова наконт памяшкання ў мясцовым Палацы культуры, ёсць зацікаўленасць маіх знаёмых эканамістаў, якія гатовы паўдзельнічаць, зараз пракладаем оптавалаконны кабель для хуткага інтэрнэту.

Разумееце, у тым і цікавасць, можна сказаць, пэўны выклік — ажыццявіць такі праект менавіта ў вёсцы. Я лічу, гэта будзе вельмі добра. Што моладзь атрымлівае у калгасе? Калі браць у цэлым — нярэдка капеечныя зарплаты. А спецыяліст у тым жа інтэрнэт-маркетынгу ці нейкі айцішнік — ад 4-5 мільёнаў. Згадзіцеся, розніца каласальная. Таму калі такі праект ажыццявіць, то гэта будзе стымуляваць моладзь заставацца ў вёсцы, вучыцца, ці нават пераязджаць з Мінска ў вёску на пастаяннае месцажыхарства. Аснова ідэі — паказаць мясцовым людзям, што можна працаваць і рабіць нейкія высокатэхналагічныя праекты, знаходзячыся ў вёсцы. Шмат хто мне кажа, што гэта ўтопія, бо для такой дзейнасці патрэбны высокакваліфікаваныя кадры. Так, там айцішнікаў пасля ўніверсітэтаў няма, але сучасная моладзь, тыя ж мясцовыя старшакласнікі ўсё гэта лёгка схопліваюць і вучацца. У мяне ёсць добрыя кантакты з нашымі IT-кампаніямі і я мяркую, калі рабіць нейкую стажыроўку, кароткатэрміновае практычнае навучанне, то яны хутка ўсяму навучацца. Такім чынам, паспрабуем стварыць спачатку адну кампанію, потым другую і гэтак далей, калі працэс пойдзе паспяхова.

**— А хто будзе заснавальнікам кампаніі?**

— Спачатку мы проста будзем вучыць моладзь. Трэба зрабіць іх калі не прафесіяналамі, то кімсьці, хто нешта ўмее. А далей мы дапаможам зарэгістраваць фірму. Заснавальнікам могуць быць і самі хлопцы, для нас гэта не прынцыпова. Канешне, калі ў іх будзе жаданне, то мы можам выступіць сузаснавальнікамі, але, скажам так, мы не ставім перад сабой мэты зарабіць грошы, асабліва на першым вопыце, для нас галоўнае стварыць прэцэдэнт. Калі гэта атрымаецца, то, я мяркую, ахвотных да стварэння такіх прадпрыемстваў будзе шмат.

**— Значыць, цалкам магчыма, што потым створаная пры вашай дапамозе кампанія пойдзе ў свабоднае плаванне?**

— Так.

**— Акрамя навучання, у якой яшчэ форме плануеце аказваць дапамогу?**

— Па-першае, кансультацыямі. Па-другое, плануем і фінансавае садзейнічанне аказваць. Канешне, у асноўныя сродкі грошы ўкладваць мы не зможам, але, магчыма, будзем прадастаўляць аргтэхніку, сродкі камунікацыі. Ну і будзем дапамагаць ім самім шукаць фінансы — ёсць жа розныя дзяржаўныя праграмы, проста не ўсе пра гэта ведаюць.

**— Адкуль будзе фінансаванне фонду?**

— Пакуль мы ўкладваем свае грошы — яны невялікія і для падтрымання дзейнасці хапае. У далейшым аперацыйныя расходы фонду (зарплата супрацоўнікам, арэнда і г. д.) плануем пакрываць за кошт паслуг фонду. Таксама будуць і іншыя крыніцы, але яны пойдуць на дапамогу гэтым прадпрыемствам або на культурныя праграмы.

**— Інвестараў таксама можна прыцягваць?**

— Не, бо інвестар — гэта той, хто ўкладвае рубель і хоча яшчэ прыбытак з гэтага рубля атрымаць. Мы ж грамадская арганізацыя, мы самі не інвестуем і не можам на сябе прымаць грошы, якія будуць генераваць дадатковыя грошы. Таму гаворка можа ісці толькі пра спонсарства.

**— Ну калі ў вас усё атрымаецца, то будзе проста выдатна. Давайце зараз пагутарым наогул пра бізнэс у рэгіёнах — як там сёння жывуць прадпрымальнікі?**

— Я не бачу вялікай розніцы паміж рэгіёнамі і Мінскам — праблемы ва ўсіх аднолькавыя. Больш цяжка тым, чыя праца арыентавана толькі на беларускі рынак, яны зараз адчуваюць складанасці, бо эканоміка зараз у пэўнай стагнацыі. Я заўсёды казаў, што адна з важных умоў паспяховага бізнэсу, асабліва ў краінах, дзе эканоміка развіваецца, гэта яго дыверсіфікацыя. У бізнэсу павінен быць экспартны складнік. Але я ведаю і іншы прыклад: адна беларуская кампанія на 100% працавала на расійскі рынак, а ў 2008 годзе з пачаткам крызісу яны таксама апынуліся ў складанай сітуацыі — тут іх прадукцыю ніхто не ведаў, а ў Расію пастаўкі ўпалі. Таму патрэбна дыверсіфікацыя і яшчэ раз дыверсіфікацыя. Павінна быць некалькі напрамкаў — на ўнутраны рынак, на знешні, прычым знешні рынак таксама па-свойму трэба дыверсіфікаваць. Калі ж вяртацца да рэгіёнаў, то там усё-такі большасць кампаній арыентаваны толькі на ўнутраны рынак, а то і наогул на мясцовы. І з-за гэтага ў іх зараз складанасці.

**— А ці назіраецца ў рэгіянальнага бізнэсу пэўная спецыфіка?**

— Канешне. Калі казаць пра малы бізнэс, то гэта або паслугі для насельніцтва, або вытворчыя напрамкі, якія, як правіла, ствараюцца па прынцыпе кластараў. Умоўна кажучы, калі ў горадзе, асабліва не абласным, ёсць нейкае буйное прадпрыемства, то побач з'яўляюцца невялічкія вытворчыя прадпрыемствы, якія маюць або сумежны профіль, або дапаўняльны. Гэта звязана з тым, што на буйным прадпрыемстве ёсць прафесіяналы, а сярод іх заўсёды знаходзяцца прадпрымальныя людзі, якія хочуць сваёй любімай справай займацца ў выглядзе прадпрымальніцтва. Такім чынам і з'яўляюцца кластары. Праўда, дзяржава павінна дапамагчы ў стварэнні інфраструктуры для кластараў, бо ў малых гарадах існуе праблема з вытворчымі памяшканнямі — з аднаго боку, ёсць шмат памяшканняў на заводах, якія не выкарыстоўваюцца, а з другога — прадпрымальніку атрымаць гэтае памяшканне няпроста. Таму дзяржава павінна гэтую інфраструктуру стварыць — або прадаць ужо існуючыя, або нават пабудаваць нешта новае. Вось у Італіі, ды і ў Расіі зараз, ёсць такі вопыт: будуецца вялізнае вытворчае памяшканне, хай нават і з лёгкіх канструкцый, падводзяцца камунікацыі, і запрашаюцца невялічкія фірмы, кожная адгароджвае сабе нейкую плошчу, ставіць сваё абсталяванне і пачынае нешта рабіць. Такім чынам і ствараецца інфраструктура для кластараў. Бо вытворчы малы бізнэс сам сабе інфраструктуру ніколі не зможа зрабіць.

**— Калі казаць пра адукацыю: наколькі бізнэсменам з рэгіёнаў патрэбны нейкія новыя веды? Наколькі там людзі разбіраюцца ў эканамічных працэсах?**

— О, добра разбіраюцца! Але варта разумець, што рэгіён рэгіёну — розніца. І вёска Вішнева — рэгіён, і Гомель — рэгіён. Але што тычыцца адукацыі, то Беларусь мае вельмі сур'ёзны плюс — у нас вельмі добрая адукацыя ў цэлым. Канешне, бывае, што чалавек — прафесіянал, але ў эканамічных пытаннях слабы. Ды зараз няма праблемы для набыцця ведаў: ёсць інтэрнэт, можна ў вэбінарах удзельнічаць, лекцыі глядзець і г. д. Я вось рэгулярна гляджу лекцыі Стэнфардскага ўніверсітэта. Зараз ёсць усе магчымасці, было б жаданне. Яшчэ адзін плюс нашай краіны — што ёсць Белтэлекам з параўнальна добрымі камунікацыямі. Нават калі праводзіць паралелі з той жа Украінай, нават з некаторымі прыбалтыйскімі краінамі, то ў нас камунікацыі ў рэгіёнах лепей развіты. Ды ў той жа Ірландыі ёсць цэлыя раёны, дзе вельмі дрэнны інтэрнэт.

**— Ну і напрыканцы дазвольце зноў спытаць пра ініцыятыву вашага фонду — калі праект атрымаецца, то вопыт распаўсюджваць на іншыя рэгіёны будзеце ці абмяжуецеся Смаргонскім раёнам?**

— Спачатку павінен быць прэцэдэнт. Калі ў нас усё атрымаецца, калі моладзь будзе працаваць, то, канешне, будзем развівацца.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

Спрэчны погляд з правінцыі

# І НЯХАЙ БОЛЬШ ЛЮДЗІ ВЯЗУЦЬ?

**Пытанне напрыканцы назвы неабходна абавязкова паставіць, калі падзяліцца думкамі па тэме вывазу людзьмі ў суседнюю Расію і іншыя краіны беларускіх прадуктаў харчавання? Што тычыцца бензіну, няма сумненняў, у гэтым я згодны, трэба неяк стрымаць вываз паліва ў такіх маштабах. Адпаведна і цану павысілі, потым, добра, трохі панізілі. А ўсё рабілася, каб быў бензін на запраўках, каб перапрацоўчыя заводы не працавалі са стратамі, каб не багацелі, фактычна проста перасякаючы мяжу, хітрыя кіроўцы. Але ж нядаўняя прапанова — аплачваць пры пераездзе за мяжу розніцу ў кошце бензіну — пакуль неяк не зусім зразумелая, як гэта рэалізаваць на практыцы.**

Што тычыцца прадуктаў харчавання, дазвольце не пагадзіцца з меркаваннямі наконт таго, што павышаныя цэны дазваляюць неяк нівеліраваць кошт малочных і іншых прадуктаў у беларускіх крамах і прыгранічных расійскіх, у выніку стрымліваць «народны гандаль». Цэны, безумоўна, выраслі і «дзякуючы» павышэнню цаны на тое ж паліва, а раней газ. Дарэчы, чаму яны не паніжаюцца, калі нафта і газ таннеюць?

Віцебшчына, вядома, не мае межаў з Расіяй. Зразумела, гэтым актыўна карыстаюцца чаўнакі, якія дзясяткамі купляюць упакоўкі смятаны, сыр, малако, іншае і возяць у Расію. Дык не сёння ж гэта з'ява «нарадзілася». І раней так было. Памятаю, яшчэ ў 1990-я аўтар гэтых радкоў асабіста вазіў прадукты на продаж у расійскі гарадок Рудня, у Смаленск. Хлеб можна было без праблем прадаць адразу на пероне чыгуначнага вакзала. Праблему хаатычнага вывазу тады вырашылі тым, што мытнікі пачалі правяраць пасажыраў у дызелях, паяздах. І, калі больш, чым дазволена, нешта везлі, канфіскоўвалі, штрафавалі. Зараз, дарэчы, нельга вывозіць за мяжу гарэлку больш, чым дазволена. Існуе і адпаведнае рашэнне, якое прадугледжвае адказнасць за незаконны вываз і ўвоз алкаголю і іншых вадкасцяў на аснове спірту. Як жа цяпер увесці мытны кантроль на празрыстай мяжы на агульнай мытнай прасторы, якая ствараецца? Калі ўжо трэба, чаму б часова і не ўвесці па дамоўленасці з расійскім бокам.

Наконт таго, што вывозяць тыя ж малочныя прадукты ў Расію, а нашым пакупнікам яе ў выніку не хапае. Прабачце, калегі з тэлебачання, хапае. Можа, чэргаў трохі больш, а можа раней прыйсці ў краму трэба, каб не купілі і на продаж не вывезлі, але хапае.

Безумоўна, пасля таго, як курс расійскага рубля павысіўся, нейкая часовая праблема з вывазам з'явілася. Але ж не ў разы курс змяніўся. І што «багаты» радавы расіянін, які і раней вывозіў нешта, цяпер гвалтам усё купіць? Ды не.

Упэўнены, што айчынным вытворцам толькі на карысць тое, што зноў раптам «вінаватыя» чаўнакі вязуць іх прадукцыю за мяжу. Маўляў, цяпер не можам задаволіць айчынных пакупнікоў. Дык працуйце ў тры змены. Адкрывайце філіялы прадпрыемстваў. Многія з дырэктараў раней скардзіліся, што прадукцыю не пускаюць рэалізоўваць нават на рынкі суседніх абласцей Беларусі, і такую практыку асудзілі на вышэйшым узроўні улады. А пра «малочныя войны» ўжо забылі. Зараз толькі вырабляй, вывезуць у тую ж Расію: і радавыя людзі, і бізнэсмены. Як і раней да дэвальвацыі.

І трэба шчыра прызнацца: з Расіі — прыгранічных абласцей «чаўнакі» і прадпрымальнікі возяць да нас на рэалізацыю параўнальна танныя чай, каву, цукеркі, кансервы і іншае. Праўда, зараз у выніку таго, што людзі нашы не могуць, як было, траціцца на ўсё гэта, вельмі прыбытковы такі бізнэс у многіх сышоў на «не». Але ж у Расіі не было такога, і зараз не гучаць заклікі наконт таго, што трэба павышаць цану, каб не вывозілі нічога ў Беларусь «чаўнакі». Рынак ёсць рынак: купляюць, вывозяць, адпаведна трэба больш тавараў, прадуктаў, каб вывозілі. А пры канкурэнцыі вытворцаў падае цана — азы эканомікі, якія яшчэ са школы ведаюць.

Быў у Польшчы, калі яна яшчэ не ўступіла ў Еўрапейскі саюз. Тутэйшыя расказвалі, што немцы спецыяльна прыязджаюць па пакупкі. І не скардзіліся, наадварот. Больш прадаецца — больш падаткаў, больш попыту — новыя рабочыя месцы на прадпрыемствах, у крамах, кавярнях...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Спакой Вадалеям будзе толькі сніцца, а ў цэнтры ўвагі Шаляў будуць грашовыя пытанні




**АВЕН.** Турбота з нагоды ўласных магчымасцяў безгрунтоўная. Паспрабуйце спыніцца на чымсьці вызначаным і ідзіце да канца, нават калі вы сумняваецеся ў поспеху. Сітуацыя на працы, хутчэй за ўсё, зменіцца да лепшага — толькі не перастарайцеся з арыгінальнасцю. Навядзіце, нарэшце, парадак і пазбаўце свой дом ад непатрэбнага, няведама калі назапашанага хламу.

**ЦЯЛЕЦ.** Не зусім удалы час для змены працы, затое выдатны момант для павышэння прафесійнага ўзроўню і вывучэння чагосьці новага. У першай палове тыдня вам, хутчэй за ўсё, давядзецца адстойваць перад начальствам свой пункт гледжання, так што пажадана да гэтага падрыхтавацца загадзя. Часцей прыслухоўвайцеся да голасу сваёй інтуіцыі і звяртайце ўвагу на папераджальныя знакі лёсу.

**БЛІЗНЯТЫ.** Навядзіце парадак у галаве: усё змрочнае і песімістычнае павінна быць бязлітасна выкінутае прэч. Сумневы ў сваіх сілах і поспеху пачынанняў таксама недапушчальныя. Толькі жалезная ўпэўненасць у перамозе разумнага, добрага і вечнага дапамогуць справіцца з тым, што чакае вас на гэтым тыдні. Асабліва напружанымі будуць аўторак і чацвер. Паспрабуйце не прад'яўляць залішне высокіх патрабаванняў да сябе. У выхадныя адпачніце ў адзіноце, падбаўшы аб стварэнні максімальнага для сябе камфорту.

**РАК.** У вашых сілах зрабіць максімум магчымага ў самых розных галінах. Паспрабуйце заставацца сабой ва ўсіх праявах. Не бойцеся браць на сябе дадатковыя абавязкі, тады ў вас будзе больш вольных сродкаў і магчымасцяў. Варта пазбягаць канфліктаў і супярэчнасцяў у адносінах з калегамі і начальствам. Вашы творчыя ідэі цяпер павінны стаць своечасовымі і неабходнымі навакольным, таму і настрой будзе на вышыні.

**ЛЕЎ.** У панядзелак неабходна быць больш уважлівымі і асцярожнымі, сачыце за сваімі словамі. Можа паўстаць сітуацыя, калі давядзецца хутка авалодаць новымі ведамі і прафесійнымі навыкамі — калі ў вас ёсць падазрэнні, што гэта могуць быць за веды, лепш прыступіць да іх набыцця загадзя. Тыдзень спрыяльны для вынаходніцкай дзейнасці — магчыма з'яўленне новых ідэй.

**ДЗЕВА.** «Давярай, але правярай» — вось адна з галоўных задач тыдня. Вы зможаце дасягнуць практычна любых вяршынь, але толькі пры крытычным стаўленні да сябе і яшчэ больш прыдзірлівым — да навакольных. На гэтым тыдні можна паспяхова займацца навуковымі даследаваннямі і, як ні дзіўна, справамі, якія не разлічаны на доўгі час. Бліжэй да канца тыдня зможаце своечасова завяршыць важную і адказную справу.

**ШАЛІ.** У пачатку тыдня верагодныя цяжкасці ў стасунках са сваякамі або суседзямі. Практычна бессэнсоўна гаварыць ім аб сваёй жыццёвай пазіцыі: вас усё роўна не пачуюць. Паверце, у вас больш сіл і ведаў, чым вы думаеце. Грашовыя пытанні, напэўна, будуць у цэнтры ўвагі — паспрабуйце дакапацца да самой сутнасці праблемы, каб яна не стварала непрыемных сітуацый.

**СКАРПІЁН.** Не разлічвайце на чужыя абяцанні: вас у лепшым выпадку падвядуць, у горшым — ашукаюць. У чацвер паспрабуйце не думаць пра людзей дрэнна, нават калі яны, па вашым меркаванні, гэтага заслугоўваюць. Шукайце ў кожным станоўчыя бакі, недахопы проста не заўважайце — вашы цярпенне і добразычлівасць акупяцца.

**СТРАЛЕЦ.** Навакольныя будуць прыслухоўвацца да вашага меркавання, так што не прапусціце магчымасці паўплываць на сітуацыю, але і не нагаварыце лішняга. Выкарыстоўвайце толькі правераныя метады — новаўвядзенні пакуль пачакаюць. Будзе нялішне паслухаць старэйшых, не саромейцеся звяртацца да іх па дапамогу.

**КАЗЯРОГ.** Тыдзень вельмі ўдалы ў плане кар'еры. Могуць паступіць прывабныя дзелавыя прапановы. Таксама вельмі верагодныя знаёмствы з карыснымі людзьмі. Калі праявіце ўважлівасць і засяроджанасць, то вам забяспечаны поспех на працы, прычым такі, на які вы нават не разлічвалі. Намячаецца вырашэнне, хоць і некалькі балючае, сур'ёзнай праблемы. Знайдзіце раўнавагу ў сабе, не бойцеся абмяркавання цяжкасцяў, а часам яшчэ і прыслухоўвайцеся да заўваг сяброў.

**ВАДАЛЕЙ.** Спакой вам толькі сніцца. Паспрабуйце ўсё ж такі заняць чакальную пазіцыю, назапасіць сілы і ўзброіцца ведамі і мудрасцю. Тады раптоўны рывок наперад прывядзе да перамогі над акалічнасцямі. Трымайце ў парадку важныя дакументы і не цягніце з праблемамі, якія неабходна вырашыць.

**РЫБЫ.** Намячаецца шмат паспяховых спраў, зносін і забаў. Вас узбадзёраць цікавыя навіны, перспектыўныя знаёмствы і важныя гутаркі. З'явіцца магчымасць кінуць усе сілы на працу і паказаць усім, які вы каштоўны і незаменны супрацоўнік. Выявяцца незавершаныя справы. Калі вы адчуваеце, што не можаце з імі справіцца, смела бярыце сабе ў памочнікі блізкіх людзей.

Хочаце — верце...

# ФЭН-ШУЙ ДЛЯ КВАТЭР

**Імкненне да гармоніі — гэта натуральная ўласцівасць чалавека. І пакуль еўрапейцы толькі пачынаюць надаваць больш увагі таму, каб знайсці сябе ў гэтым супярэчлівым свеце і дасягнуць гармоніі думак, жаданняў і ўчынкаў, народы Усходу даўно ўжо распрацавалі правілы суіснавання чалавека з навакольнай яго прасторай, якія былі ўшанаваны ў вельмі папулярнай цяпер дактрыне фэн-шуй.**

**Фэн-шуй: верыць або не**

Верыць або не пастулатам Фэн-шуй — вырашаць вам самім. Але перш чым вы абвінаваціце гэтую дактрыну ў беспрунтоўнасці, будзе карысна ўспомніць, што ў Кітаі фэн-шуй існуе ўжо больш чатырох тысячагоддзяў і дагэтуль ўтрымлівае свае пазіцыі і займае асаблівае месца ў жыцці людзей. З цягам часу ён усё больш завяёўвае папулярнасць сярод адукаваных і цынічных еўрапейцаў, якія ўжо пачалі стамляцца ад раз'ядненасці і хаатычнасці сучаснага свету.

Можа, наш пастаянны стрэс, хваробы і іншыя непрыемнасці сапраўды адбываюцца з-за няправільнай арганізацыі нашай жыццёвай прасторы і бесклапотнага разбазарвання жыватворнай энергіі нашай матулі Зямлі? Калі не кожны з нас гатовы адказаць на гэтае пытанне сцвярджальна, то ў любым выпадку нельга і цалкам адмаўляць наяўнасць разумнага сэнсу ў гэтым асаблівым падыходзе да навакольнага свету, які з'яўляецца вынікам тысячагадовых назіранняў чалавека. У нас заўсёды ёсць выбар. Але калі вы адчуваеце, што нешта ў вашым жыцці ідзе не так, вы, безумоўна, можаце скарыстаць і застасаваць у такім стане бясконца, але вы можаце таксама паспрабаваць змяніць нешта ў вашым жыцці. І чаму б не пачаць працэс зменаў з уласнага дома або кватэры?

**Фэн-шуй кватэры: з чаго пачаць, або змагаемся з рэальнасцю**

Зразумела, нават калі вы вырашыце пераўтварыць ваш дом або кватэру ў адпаведнасці з правіламі фэн-шуй, то не зможаце змяніць яго ў корані, напрыклад, змяніць форму падмурка дома, месцазнаходжанне туалета або разбурыць вышынны дом, які стаіць насупраць вокнаў вашай кватэры і які закрывае ўвесь астатні пейзаж. Але вы, безумоўна, усё роўна зможаце зрабіць даволі шмат для таго, каб, ужываючы фэн-шуй кватэры, палепшыць энергетыку сваёй жыццёвай прасторы.

**Далоў смецце!**

**Чысціня памяшкання і адсутнасць смецця** — гэта адзін з асноўных прынцыпаў фэн-шуй, гэта забяспечвае нармальную цыркуляцыю энергіі Цы (энергіі жыцця). **Пачніце змены ў сваёй кватэры з генеральнага прыбірання памяшканняў** — менавіта з гэтага пачынаецца фэн-шуй кватэры. Надайце ўвагу кожнаму кутку кватэры, навядзіце парадак у кожнай шафе, разбярыце і пачысціце кладоўку. Бязлітасна пазбаўцеся ад усяго непатрэбнага: надколатых кубкаў, ваз, якія не выкарыстоўваюцца або трэснутых, і калготак «са стрэлкамі». Не захоўвайце ў кватэры старыя тапачкі і халадзільнік, які не працуе.

Падаруйце тыя рэчы, якія вам не патрэбны, сябрам, бедным людзям або аднясіце іх у царкву. Правіла фэн-шуй адносна адзення: калі нейкія рэчы ў вашым гардэробе застаюцца незапатрабаванымі больш за год, гэта азначае, што яны для вас абсалютна бескарысныя і іх можна смела аддаць «у добрыя рукі».

Але перш чым пачынаць грандыёзнае прыбіранне кватэры, паглядзіце ў месяцовы каляндар. **Гэтая павінна рабіцца толькі справа ў тым выпадку, калі месяц у апошняй чвэрці.** І падчас прыбірання варта месці падлогу ў кватэры не ў бок уваходных дзвярэй (інакш вы, па правілах фэн-шуй, «вымецеце» свае грошы), а ў бок кухні.

**Абкурванне пахамі**

Пасля таго, як увесь стары пыл будзе выдалены з кватэры і ўсё смецце вынесена ў смеццеправод або адмысловы кантэйнер для смецця, **можна перайсці да наступнай стадыі энергетычнай ачысткі памяшкання — абкурванню пахамі.** Паводле законаў фэн-шуй кватэры, гэта вельмі важны элемент. Абкурванне кватэры можна зрабіць пры дапамозе свечкі, араматычных палачак або пучка травы. Абкурванне пахамі можна замяніць акрапленнем святой вадой.

Не забывайцеся, што **падчас прыбірання варта рухацца ад парога па гадзіннікавай стрэлцы**, спыняючыся ў кожным куце кватэры (менавіта там акумулюецца негатыўная энергія). Адразу пасля прыбірання прыміце душ: пакуль вы змагаліся за чысціню вашага навакольнага асяроддзя, уся адмоўная энергія назапасілася на вас. Калі дазваляе здароўе, то душ пасля такой уборкі варта прыняць халодны.

**Для замацавання вынікаў такой «энергетычнай чысткі» выкарыстайце амулеты.** Гэта могуць быць не толькі традыцыйныя ўсходнія амулеты (статуэткі сланоў, сабак або драконаў), якія варта ставіць так, каб яны ахоўвалі ўваходныя дзверы кватэры. Падыдуць таксама пучкі цыбулі, часнаку, сухіх раслін, а таксама адмысловыя амулеты фэн-шуй.




**У дробным маштабе**

Пасля таго, як вы прыбраліся, самы час падумаць аб правільным упрыгожванні вашай кватэры. Вось у гэтым давядзецца праявіць усю сваю кемлівасць і вынаходлівасць. Першым чынам, **пры дапамозе компаса варта вызначыць часткі свету і вырашыць, якія менавіта зоны кватэры,** паводле правілаў фэн-шуй (багацця, здароўя, кар'еры, сем'і і г.д.), **вы хацелі б падкрэсліць і асабліва выдзеліць у гэты момант.**

Выберыце неабходную частку вашага пакоя паводле сваіх прыярытэтаў. Выдзеліце яе. Гэта можна зрабіць пры дапамозе шпалер іншага колеру, шматслаёвага асвятлення гэтай зоны або размяшчэння шматузроўневай мэблі. Напрыклад, каб актываваць зону ведаў, будзе карысна павесіць там паліцы з кнігамі, зону сям'і можна падкрэсліць дадатковым асвятленнем, а ў зону славы можна змясціць сведчанні вашых дасягненняў (медалі, дыпломы, кубкі).

**Цэнтр пакоя — гэта месца асаблівае.** Менавіта адгэтуль размяркоўваецца энергія ва ўсе іншыя сектары жылля, таму вельмі важна, каб ён быў аформлены правільна. Самы просты спосаб яго афармлення паводле фэн-шуй — змясціць у цэнтры пакоя дыван або яркую крышталёвую жырандолю.

**За шырмай**

Фэн-шуй кватэры абвяшчае, што **спальнае месца патрабуе адмысловай увагі.** Падчас сну наша цела напаўняецца энергіяй і здароўем, таму **не варта ставіць ложак побач з акном або пакаёвымі раслінамі** (яны забіраюць энергію), а таксама побач з «прагрэсіўнымі дасягненнямі чалавецтва» (камп'ютарам, тэлевізарам, CD або DVD — плэерамі), якія выпраменьваюць негатыўную энергію.

**Не варта таксама вешаць якія-небудзь паліцы над ложкам.** Акрамя таго, што іх знаходжанне над ложкам перашкодзіць нармальнай цыркуляцыі энергіі, гэта таксама досыць небяспечна.

Часта ў невялікіх кватэрах ложак у дзённы час выконвае ролю простай канапы. Вядома, фэн-шуй кватэры не вітае мэблю-трансформер, але сёе-тое ў гэтым выпадку ўсё ж такі можна зрабіць. Простая шырма дапаможа выправіць такую сітуацыю. Уначы яна з поспехам прыкрые ваш ложак, а днём — адгародзіць пісьмовы стол.

**Карысная прастора**

У маленькіх кватэрах кожны квадратны метр на асаблівым рахунку. Фэн-шуй ставіцца да прасторы гэтак жа асцярожна. Не варта грэбаваць дапаможнымі памяшканнямі ў кватэры — кухняй, ваннай, туалетам, кладоўкай і балконам.

**У кухні,** па правілах фэн-шуй, **неабходна падзяліць элементы, якія адносяцца да вады і агню.** Калі пліта размяшчаецца блізка да ракавіны, то падзяліце гэтыя зоны чымнебудзь драўляным — напрыклад, апрацоўчай дошкай.

**Ванная і туалет «змываюць» энергію.** Каб пазбегнуць гэтага, варта пастаянна і шчыльна зачыняць не толькі дзверы гэтых пакояў, але і накрыўку ўнітаза. **У сумешчаным санвузле варта падзяліць паміж сабой дзве галоўныя часткі памяшкання** (ванна — унітаз) пры дапамозе шырмы. Але калі з-за нядалай планіроўкі памяшкання санвузел, на жаль, апынуўся ў зоне здароўя або багацця, то варта паспрабаваць звесці негатыўны эфект ад гэтай сітуацыі да мінімуму. Для гэтага можна проста паставіць у гэтых памяшканнях люстраныя дзверы, і тады яны проста «знікнуць».

**Што датычыцца кладоўкі, то не варта рабіць у ёй склад непатрэбных рэчаў.** Трымайце там тое, што вам неабходна ў паўсядзённым жыцці: пыласос, прасавальную дошку.

Фэн-шуй кватэры настойвае, што **балкон таксама варта ачысціць ад рознага хламу, пустых слоікаў і зламаных лыж.** А што датычыцца формы самога балкона, то лепш, калі яго куты будуць закругленымі або скошанымі (у выглядзе трапецыі).

*Пасля таго, як вы зрабілі магчымыя змены ў сваёй кватэры, зрабіўшы яе больш камфартабельнай і прывабнай, пачакайце трохі і пагледзіце, што атрымаецца: ваша жыццё, след за вашым жыллём, таксама пачне змяняцца да лепшага. Калі ў ёй пачнуць адбывацца добрыя падзеі, то гэта азначае, што вы ўсё зрабілі правільна. Калі не, то гэта значыць, што трэба яшчэ сёе-тое дапрацаваць. І фэн-шуй вам у гэтым дапаможа.*

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

СМАЧНА ЕСЦІ

## У нас на абед трускалкі!

**Менавіта ў чэрвені мы можам у поўнай меры нацешыцца гэтай незвычайна духмянай і смачнай ягадай.**



Трускалкі валодаюць магутнымі супрацьзапаленчымі і антымікробнымі ўласцівасцямі, у іх шмат вітаміну С і фалівай кіслаты, у іх утрымліваюцца солі жалеза і саліцылавая кіслата. Трускалкі абараняюць арганізм ад вірусаў, умацоўваюць імунную сістэму і сценкі сасудаў, дапамагаюць пры сардэчна-сасудзістых захворваннях, павышаюць імунітэт і тым самым падрыхтоўваюць арганізм да зімы і халадоў.Трускалкі паляпшаюць страваванне, чысцяць кішэчнік, спрыяюць зніжэнню вагі і вывядзенню лішняй вады з арганізма. Вось чаму яны не толькі ўваходзяць у склад шматлікіх дыет, але існуе нават адмысловая «трускалкавая» дыета, інакш званая «галівудская» — многія галівудскія зоркі тры дні ў месяц харчуюцца выключна трускалкамі.

Трускалкі нездарма лічацца самай эратычнай ягадай. У Вялікабрытаніі навукоўцы прызналі ягады трускаўкі «прыроднай віяграй», і не дарма: у костачках трускалак утрымліваецца вялікая колькасць цынку, а менавіта ён спрыяе сэксуальнай узрушанасці і павышэнню сэксуальнай цягі не толькі ў мужчын, але і ў жанчын.

Цяпер, у сезон, можна скарыстацца сітуацыяй і паспрабаваць прыгатаваць стравы з трускалкі не толькі на дэсерт, але і на закуску, і нават як асноўную страву.

**СУП-ПЮРЭ З ТРУСКАЛАК АБО СУНІЦ**

Свежыя ягады садовай або лясной суніцы перабраць, прамыць, абсушыць, затым працерці скрозь сіта або змалаваны друшляк. Закіпяціць ваду, пакласці ў яе цукар, размяшаць. Атрыманы сіроп астудзіць і затым толькі змяшаць з ягадным пюрэ. У сякоту такі суп з'ядаецца імгненна. Да яго падаюць смятану або сухое печыва.

На 500 г ягад спатрэбіцца палова шклянкі цукру, дзве шклянкі вады і смятана па смаку і жаданні. Аматары рэзкіх прыпраў могуць дадаваць у такі суп кардамон або расцёртыя лісткі базіліку.

**СУП З ТРУСКАЛАК З ТВАРАГОМ**



У эмаляваную каструлю наліць адну шклянку гарачай вады, кінуць у ваду 3 бутончыкі гваздзікі, давесці ваду да кіпення, выключыць агонь. Накрыць каструлю шчыльна вечкам і пакінуць на 15 хвілін. Адвар настаіцца. Затым яго трэба працадзіць.Пакуль адвар будзе настойвацца, 100 г свежага тварагу працерці праз сіта. Затым злучыць тварог з астуджаным адварам. У міску або каструлю усыпаць 400 г трускалак. Заліць ягады сумессю з аднаго літра кефіру з 2 сталовымі лыжкамі мёду, 3 шклянкамі халоднай гатаванай вады, а затым уліць адвар з тварагом. Размяшаць і падаваць на стол. У спякотныя дні на дачы такія супы з задавальненнем ядуць не толькі дзеці, але і дарослыя.

**ТОРТ З ТРУСКАЛАК (БЕЗ ВЫПЕЧКІ)**



***Спатрэбіцца***: 100 грамаў вадкага мёду, дзве шклянкі малака, 100 грамаў кукурузных шматкоў, чарка рому або каньяку (можна і без спіртнога), 150 мл вяршкоў, сталовая лыжка цукровай пудры, трускалкі.

Мёд злучыць з малаком і добра змяшаць венчам. Затым усыпаць кукурузныя шматкі і дадаць спіртное. Зноў змяшаць і пакінуць на 20 хвілін. Узбіць вяршкі міксерам і змяшаць іх з цукровай пудрай. Трускалкі разрэзаць папалам. На дно формы выкласці пластом сумесь са шматкамі, потым рэзаныя трускалкі. Пакрыць ягады вяршкамі, выкласці пакінутую сумесь шматкоў і трускалкі, упрыгожыць торт кветачкамі з вяршкоў і цэлымі ягадамі. Астудзіць дзве гадзіны. Кончыкі трускалак можна акунуць у расплаўлены шакалад.

*(Працяг у наступным выпуску.)*

-2758-

ПЕРАЙМАЙ

## Ніхто не праскочыць!

Каб куфлі з напоямі ў гарачы дзень не ператвараліся ў несакцыянаваныя басейны для купання насякомых, прыкрыйце іх ільнянымі хустачкамі. Бакі апрацуйце з дапамогай касой бейкі або падагнуўшы. А каб лёгкія хустачкі не паляцелі з парывамі летняга ветрыку, да бакоў кожнага па перыметры нашыйце пакрытыя залатой акрылавай фарбай металічныя шайбы. У якасці ўцяжарвальнікаў можна выкарыстаць і іншыя матэрыялы: прыгожыя гузікі, пацеркі, крышталікі, падвескі.



УМЕЛЫЯ РУЧКІ

## Другое жыццё пластыкавых бутэлек



**Аказваецца, пустыя пластыкавыя бутэлькі могуць стаць не толькі «ўпрыгажэннем» наваколля, але і матэрыялам, з якога можна зрабіць шмат карысных рэчаў.**

**МЯТЛА**

Трэба адрэзаць у бутэлькі дно і парэзаць бакавыя часткі на стужачкі.

Праз горла бутэлькі прасунуць ручку мятлы і замацаваць.

Для больш пышнай мятлы трэба скласці некалькі бутэлек адна ў адну.

**«ЖАЛЮЗІ»**





Шылам трэба зрабіць дзіркі і нанізаць накрыўкі на вяровачкі, замацоўваючы вузялкамі. Вяровачкі замацаваць на вузенькай дошчачцы ці навязаць на стужку.



**ШЛЁПАНЦЫ**

Гэта, вядома, не лепшы прыклад абутку. Але у экстрэмальнай сітуацыі ідэя можа спатрэбіцца. Гэта ўсё ж лепш, чым босымі нагамі па калючках.

ПАРАДЫ БЫВАЛЫХ

- Калі вам трэба вычысціць мяккую мэблю або дываны, якія вісяць на сцяне ў пакоі, не паднімаючы пылу, але няма пыласоса, гэта можна зрабіць наступным чынам : намачыце і добра адцісніце вялікую анучу або старую прасціну, пакладзіце яе на канапу або падвесце на дыван і выбівайце пыл тонкай палкай, час ад часу прапалоскваючы анучу.
- **Калі драўляныя кольцы для фіранак на драўляным карнізе не перамяшчаюцца па ім лёгка і ўзнікае небяспека, што ўся гэтая прыгажосць у адзін выдатны дзень зваліцца на галаву, варта нацерці карніз недагаркам свечкі.**
- Люстэрка вешаюць звычайна там, куды не падаюць прамыя прамені сонца, паколькі ад іх уздзеяння на люстэрцы з'яўляюцца плямы. Некаторыя люстэркі маюць арыгінальную, часам нават дарагую раму. Рамы, абліцаваныя сусальным золатам (яны патрабуюць спецыяльнага догляду), рэкамендуецца чысціць малочнай сыроваткай.

-2759-

## ДЗЕ «ПАРНАС»? ГЭТА Ў ГАРАДКУ!

**У Гарадоцкім раёне прайшоў фестываль беларускай паэзіі і фальклору, народнай творчасці «Гарадоцкі Парнас». Як вядома, менавіта з гэтых мясцін родам Канстанцін Вераніцын, стваральнік «Тараса на Парнасе»**

У рамках гэтай народнай культурнай падзеі арганізавалі кірмашы, на якіх пашчасціла мужчынам па імені Тарас: ім рабілі скідкі пры пакупках. Прайшло і свята нацыянальнай кухні, многія з удзельнікаў якога прэзентавалі смачныя стравы ў паэтычнай і спеўнай формах. На «падворках» мясцовыя вытворцы прэзентавалі сваю прадукцыю, у тым ліку і пры дапамозе герояў паэмы. На цэнтральнай плошчы раённага цэнтра таксама адбыўся канцэрт самадзейных артыстаў, працаваў «дзіцячы гарадок», праходзілі самыя розныя вясёлыя і пазнавальныя конкурсы, віктарыны.

У рамках фестывалю прайшло свята паэзіі і аўтарскай песні. А супрацоўнікі музея ўсім ахвотным далі магчымасць не толькі азнаёміцца з выставай, прысвечанай жыццю і творчасці Вераніцына, але і наведаць занятак у паэтычным майстар-класе.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**СЁННЯ, паважаныя мае кулінары, прапаную вашай увазе «антыкрызіснае» меню. Як кажуць — танна і патрэбна. Што можна сказать з нагоды ўсяго таго, што адбываецца? Праврёмся! Я — аптымістка.**




## АМЛЕТ МАРКОЎНЫ

**Нам спатрэбіцца:** *2—3 яйкі, 1 морква, 1/4 шклянкі малака, 1 сталовая лыжка цукру, 1—2 сталовыя лыжкі сметанковага масла, зялёная цыбуля, соль — на смак.*

Моркву рэжам саломкай, на некалькі хвілін засыпаем цукрам, пасля выкладваем на разагрэтую патэльню і злёгку абсмажваем. Як толькі морква будзе гатова, выліце на яе ўзбітыя яйкі, змяшаныя з малаком. Выпякайце амлет каля 5 хвілін і, калі ён будзе гатовы, пасыпце яго зялёнай цыбуляй.

## АМЛЕТ, ФАРШЫРАВАНЫ ГРЫБАМІ

**Нам спатрэбіцца:** *6 яек, 100 г смятаны, соль, перац, 300 г шампіньёнаў, 1 цыбуліна.*

Яйкі разбіць у місцы, змяшаць са смятанай, добра ўзбіць, пасаліць і паперчыць на смак. Грыбы вымыць, рэпчатую цыбулю ababраць і разам з грыбамі нарэзаць на лустачкі. Абсмажыць грыбы з цыбуляй на сметанковым масле, крыху пасаліўшы да гатоўнасці. Растапіць на патэльні сметанковае масла. З яечнай масы выпечы 4 тонкія амлеты. Пасля на сярэдзіну кожнага амлета вылажыць грыбную начынку, звярнуць папалам. Падаваць са смятанным соусам.

## СУБОТНІ РАНІШНІ АМЛЕТ

**На 1 порцыю нам спатрэбіцца:** *2 яйкі, 100 мл малака або вяршкоў, соль, сметанковае масла і алей. Для начынкі: адна ржаная хлебная сухая скарынка або сухарык, 1/2 цыбуліны, скрылік любой нятлустай вяндліны. Для ўпрыгажэння: 3 лісцікі пятрушкі, 2 скібкі памідора, 1 чайная лыжка маянэзу.*

Спачатку гатуем начынку. Аржаныя скарынкі здробнім (можна ў кавамолцы, але лепш на сярэдняй тарцы). Крыху падсмажым іх на сметанковым масле. Асобна падсмажым дробна пакрышаную рэпчатую цыбулю да празрыстага залацістага колеру. Пасля гатуем аснову для канверціка. Яйкі ўзбіваем з соллю да добрай пены, дадаём малако або вяршкі, акуратна перамешваем. На разагрэтай у меру патэльні (з нізкімі борцікамі) на алеі выпякаем амлет у выглядзе блінчыка. Шырокай лапатачкай пераварочваем блінчык на другі бок. На сярэдзіну блінчыка слаямі выкладваем спачатку ржаныя крошкі, зверху — цыбулю, і пасля — кавалачкі вяндліны. З чатырох бакоў заварочваем блінчык канверцікам. Зноў шырокай лапаткай пераварочваем канверцік швамі ўніз. Прграваем пад накрыўкай 2—3 хвіліны. Выкладваем на талерку. Упрыгожваем лісцікамі пятрушкі, зверху — скібкі памідора, на іх — маянэз. Суботні амлет гатовы! Сёння выхадны!

## АЛАДКІ З РАДЫСКІ

**Нам спатрэбіцца:** *150 мл малака, 400 г радыскі, 250 г бульбы, 120 г морквы, 120 г мукі, 2 яйкі, 1 ст. лыжка цукру, алей — для смажання, крыху соды і 40 г сметанковага масла.*

Агародніну адварыць, ачысціць і працерці праз сіта або прапусціць праз мясарубку. Яйкі расцерці з цукрам і соллю, дадаць паступова малако, а затым соду. Гэтую сумесь хутка злучаюць з працёртай агароднінай і ўзбіваюць. Смажыць аладкі на алеі і падаць са смятанай або сметанковым маслам.

## ПЯЧОНАЧНАЯ САЛАТА З БУРАКОМ

**Вазьміце:** *300 г варанай або падсмажанай ялавічнай пячонкі, 1 вялікі вараны бурак, 1 цыбуліну, 2 зубкі часнаку, 2—3 сталовыя лыжкі маянэзу, соль.*

Цыбулю парэзаць тонкімі колцамі, абсмажыць на алеі і астудзіць. Пячонку парэзаць тоненькай саломкай. Бурак надзерці на буйной тарцы. Часнок праціснуць праз прэс і змяшаць з маянэзам. Пры жаданні масу падсаліць (не больш за 1/3 ч. лыжкі солі).

На талерку выкласці пячонку, палову маянэзу, затым выкласці бурак і другую палову маянэзу. Зверху пакласці абсмажаныя колцы цыбулі.

Калі салата гатуецца для сямейнага ўжывання, то можна зрабіць значна прасцей (так, дарэчы, смачней атрымліваецца): пячонку, бурак і маянэз перамяшаць, а цыбулю таксама выкласці зверху. Цыбулю змешваць з астатнімі інгрэдыентамі не трэба, інакш яна размякне ад маянэзу і перастане хрумсцець.

## САЛАТА З МОРКВЫ І ЦЫБУЛІ

**Нам спатрэбіцца:** *2 галоўкі рэпчатай цыбулі, 1 морква, 1 чайная лыжка цукру, 2 сталовыя лыжкі алею.*

Цыбулю парэжце колцамі, а потым заліце кіпнем на 10-15 хвілін. Ваду зліце, цыбулю пасыпце цукрам, дадайце надзёртую на буйной тарцы моркву, выкладзіце ў салатнік і запраўце алеем.

## ЧОРНЫЯ ТРУФЕЛІ Ў ЧОРНЫМ ШАКАЛАДЗЕ

**Вазьміце**: *75 г чорнага шакаладу, 50 г вяршкоў (35%).*

Шакалад з утрыманнем какавы масай не менш за 70% і тлустыя 35% вяршкі растапіць разам і ўзбіць. Даць застыць у халадзільніку, сфармаваць шарыкі, патрымаць іх яшчэ крыху ў халадзільніку. Растапіць астатнія 25 г чорнага шакаладу, памачыць у яго шарыкі, пакласці іх сохнуць і застываць на намазаны маслам ліст фольгі або пякарскай паперы.

**АНЕКДОТ У ТЭМУ:**

Амерыканец наведвае правінцыйны расійскі гарадок.

У адзіным рэстаране заказвае мясцовую страву — амлет з сырам.

Пасля сняданку ім падаюць рахунак. Рахунак здаецца амерыканцу вельмі вялікім, і ён пытаецца ў гаспадара:

— У вас што, яйкі і сыр рэдкасць?

— Зусім не, рэдкасць — гэта амерыканцы!

---

**г. ВИТЕБСК** **08.07.2011**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С УСТАНОВЛЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, РАВНОЙ ОДНОЙ БАЗОВОЙ ВЕЛИЧИНЕ

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 3. | Здание бани с холодной пристройкой, расположенное по адресу: Витебская область, Полоцкий район, д. Малое Ситно | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 250/С-31162 (здание бани с холодной пристройкой), одноэтажное кирпичное, фундамент – бетонный, а/ц листы по деревянным стропилам, общей площадью 84 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 223883803101000020, площадью 0,0325 га для содержания и обслуживания недвижимого имущества, сроком аренды 50 лет. Назначение – для размещения объектов: административно-хозяйственного назначения, розничной торговли, общественного питания, гостиничного назначения, физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения, культурно-просветительского и зрелищного назначения, бытового обслуживания населения. | Одна базовая величина | Одна базовая величина |
| 4. | Здание клуба с холодной пристройкой, расположенное по адресу: Витебская область, г. Верхнедвинск, ул. Московского, 39 | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 251/С-63918 (здание клуба с холодной пристройкой), одноэтажное, бревна облицованные кирпичом, фундамент бетонный, кровля шиферная, общей площадью 114 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 221050100001002059, площадью 0,0428 га, сроком аренды 30 лет. Назначение – для обслуживания здания клуба с перспективным назначением для обслуживания производственного здания, допустимого для размещения в смешанной застройке по согласованию с органами государственного санитарного надзора. Ограничения в использовании земельного участка в связи с расположением в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы (река Дрисса) на площади 0,0428 га и в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000В на площади 0,0044 га. | Одна базовая величина | Одна базовая величина |
| 5. | Здание клуба, расположенное по адресу: Витебская область, Оршанский район, Клюковский с/с, д. Софиевка, д. 29 | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инв. № 240/С-30337 (сооружение специализированное культурно-просветительного и зрелищного назначения), бревенчатое одноэтажное, 1969 г.п., общ. площадь 94,4 кв.м, объем 371 куб.м, фундамент бетонный, перекрытие деревянное, крыша шиферная. Земельный участок: с кадастровым номером 223682706101000025 для содержания и обслуживания клуба, площадь 0,0222 га. Использование – для специализированного культурно-просветительного и зрелищного назначения. | Одна базовая величина | Одна базовая величина |

**ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайт www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.**

ПРОДАВЕЦ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ: Белорусский производственно-торговый концерн лесной, деревообрабатывающей и целлюлозно-бумажной промышленности, контактный телефон в г. Минске (017) 227 52 54.

**Условия продажи недвижимого имущества:**

**по лотам №№ 3, 4, 5** – осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данных объектах, создание им дополнительных рабочих мест; запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объектов до выполнения им условий договора купли-продажи.

**Условия предоставления земельных участков:**

**по лоту № 3** – получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения исполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 лет (в случае изменения назначения недвижимого имущества); осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией (в случае изменения назначения недвижимого имущества);

**по лоту № 4** – заключение победителем аукциона договора аренды земельного участка с исполкомом и осуществление государственной регистрации права на земельный участок в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; ведение хозяйственной деятельности на земельном участке в соответствии с требованиями статьи 77 Водного кодекса Республики Беларусь, в связи с расположением земельного участка в водоохранной зоне вне прибрежной полосы реки Ушача;

**по лоту № 5** – заключение победителем аукциона с Клюковским сельисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок, после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка, государственной регистрации права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий двух лет; осуществление строительства (реконструкции) объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

**Аукцион состоится 08.07.2011 в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.**

1. Для участия в аукционе приглашаются негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: негосударственным юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть оформлена не ранее чем за шесть месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, **последний день приема документов 07.07.2011 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 08.07.2011 с 14.00 до 15.00**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

3. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 11.03.2010 № 342. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

4. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

**5. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; **не позднее 10 рабочих дней** со дня принятия решения исполкома о предоставлении ему земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка, в сумме 2-х миллионов рублей (по каждому лоту); **не позднее 12 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

7. Информация о проведении аукционов была опубликована ранее в газете «Звязда» от 26 января 2011 г. № 15, от 15 марта 2011 г. № 47, от 29 апреля 2011 г. № 80.

---

**Ведай нашых!**

# КУДЫ ВЯДУЦЬ ТАЙНЫЯ СЛЯДЫ?

### Шляхі даверу і масонскія знакі прывялі беларускія музеі да перамог на конкурсе ў Маскве

**КАЛІ на пачатку чэрвеня падвялі вынікі XIII міжнароднага музейнага фестывалю «Інтэрмузей-2011», то аказалася, што Беларусі ёсць чым уразіць. Калі музей крэатыўна падыходзіць да справы, будуць вынікі. Напрыклад, у выглядзе перамогі — як у праекта «Масонская калекцыя са збору Вацлава Федаровіча» Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. Лепшы ў конкурсе сярод маладых музейных спецыялістаў краін СНД!**

Зусім іншым браў Беларускі дзяржаўны музей Вялікай Айчыннай вайны — статус усё-такі абавязвае. «Прастора культуры — прастора даверу» — так называўся конкурс, дзе гэты музей атрымаў другую прэмію фестывалю.

Яшчэ нашу краіну прадстаўлялі Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту і Гомельскі палацава-паркавы ансамбль — гэта каб розныя напрамкі музейнай справы паказаць. Аднак жа ва ўсіх конкурсах (іх было шэсць) не адзначыш адных беларусаў...

Тым больш што ўдзел у фестывалі ўзялі 230 музеяў краін СНД, а таксама музеі з Вялікабрытаніі, Карэі, Італіі, Іспаніі, Германіі, Швейцарыі, Галандыі, якія ўжо перамагалі на буйных конкурсах. Музейны конкурс у Маскве быў арганізаваны Міністэрствам культуры РФ пры падтрымцы Бюро ЮНЕСКА ў Маскве і Міжнароднага савета музеяў.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

---

## Будуць пераходы для капытных і земнаводных

**Ужо гэтым летам пад дарогай у раёне вёсак Броды і Гута плануецца адкрыць два пераходы для капытных жывёл — казуль, дзікоў, аленяў, ласёў.**

Зараз, у адпаведнасці з Указам кіраўніка дзяржавы, вядуцца работы па будаўніцтве абходнай аўтамабільнай дарогі вакол Нацыянальнага парка «Белавежская пушча». Пры правядзенні ацэнкі ўздзеяння на навакольнае асяроддзе былі рэкамендаваны і запраектаваны спецыяльныя канструкцыі для забеспячэння бяспечнага пражывання дзікіх жывёл — як земнаводных, так і капытных. Для апошніх і плануецца летам адкрыць два пераходы. А для земнаводных уладкаванне пяці пераходаў, як удакладнілі ў Міністэрстве прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, мяркуецца завяршыць на працягу летняга перыяду. Аўтарскі нагляд за выкананнем гэтых работ вядзецца навукоўцамі Нацыянальнай акадэміі навук.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

---

# АСУДЖАНЫ ПЕДАФІЛ

**Суд г. Пінска і Пінскага раёна прыгаварыў вычварэнца за гвалтоўныя дзеянні над васьмігадовым хлопчыкам да 10 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.**

22-гадовы жыхар адной з вёсак раёна завёў дзіця за хлеў і рабіў там сваю чорную справу. За гэтым і застала злыдня бабуля хлопчыка. Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» памочнік пракурора Брэсцкай вобласці Вольга ДЗМІТРУК, падчас следства высветлілася, што злачынца не раз выкарыстоўваў хлопчыка для ажыццяўлення ўласнай пажаднасці. Але дзіця баялася расказаць дарослым.

Хоць педафіл і не нанёс урону здароўю хлопчыка, суд прызначыў даволі суровае пакаранне. За падобныя дзеянні ў розных краінах караюць наогул вельмі жорстка. На Захадзе прыйшлі да высновы, што такія людзі невылечныя, таму ў шэрагу месцаў іх падвяргаюць хімічнай кастрацыі. Зараз гэта пытанне шырока абмяркоўваецца ў суседняй Расіі. Не выключана, што закон аб стэрылізацыі злачынцаў медыцынскім спосабам у гэтай краіне неўзабаве прымуць. Думаю, што і нашым юрыстам варта грунтоўна вывучаць гэтую тэму.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




**АДКАЗЫ НА СКАНВОРД**

**Па гарызанталі:** Нікулін. Гайдай. Ганг. «Лада». Акт. Звон. Рэгбі. Арго. Ялта. Спа. Селен. Аўдытар. «Аса». Ная. Атам. Прапажа. Атака. Смута. Клан. Рэктар. Апад. Опт. Атара. Кіно. Івалга. Серп. Міронаў. Ерафеіч. **Па вертыкалі:** Папанаў. Ралі. Згода. Ата. Пано. Статак. Паліто. Вылас. Жарт. Нуга. Арама. Краса. Адан. Кюі. Леў. Ганак. Негр. Тыл. Жабо. Апе. Расада. Тамат. Галіна. Упа. Аматар. Святлічная. Адамовіч.

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.38 | 21.40 | 17.02 |
| Віцебск — | 4.19 | 21.38 | 17.19 |
| Магілёў — | 4.28 | 21.31 | 17.03 |
| Гомель — | 4.34 | 21.18 | 16.44 |
| Гродна — | 4.55 | 21.54 | 16.59 |
| Брэст — | 5.05 | 21.45 | 16.40 |

**Месяц**

*Першая квадра 9 чэрвеня. Месяц у сузор'і Шаляў.*

**Імяніны**

**Пр.** *Фядоссі, Івана, Лукі.*

**К.** *Адэлаіды, Настассі, Розы, Варнавы, Фелікса.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




## Дзве даты

## 11 чэрвеня

**1903 год** — выдадзены першы выпуск трохтомнай навуковай працы філолага-славіста, заснавальніка беларускай філалогіі Яўхіма Карскага «Беларусы».

**1742 год** — Бенджамін Франклін, вучоны, які пасяліўся на пачэсным месцы — купюры ў 100 амерыканскіх долараў — вынайшаў прыладу, якая сёння стаіць у кожным доме — кухонную пліту. Да яго металічныя печы мелі дзіўную канструкцыю, якая не дазваляла раўнамерна разагравацца або гатаваць ежу. Б.Франклін дадумаўся, які лабірынт з труб стварыць, каб распалены газ ішоў па іх аднолькава раўнамерна.



## Цытата дня:

*«Існуе толькі адзін спосаб не ператварыць старасць у пародыю на пражытае жыццё, а менавіта — працягваць дамагацца мэтаў, якія надаюць сэнс існаванню, аддавацца сваёй справе, грамадскай, палітычнай ці творчай рабоце».*

**Джэферсан Дэвіс (1808—1889), прэзідэнт канфедэрацыі паўднёвых рабаўладальніцкіх штатаў Амерыкі.**

# ЧЫРВОНЫ КУТ




**ДЛЯ таго каб зразумець, якую знакава-сімвалічную ролю выконвалі чырвоны і белы колеры, неабходна высветліць, якім чынам кожны з гэтых колераў быў звязаны з абрадавымі структурамі і ў якіх рытуальных кантэкстах яны выкарыстоўваліся. З гэтай мэтай нагадаем шэраг рытуальных дзеянняў і прадметаў, у якіх белы і чырвоны колеры з'яўляюцца дамінантнымі, ці зместавымі.**

● Сёння гарадскія жыхары ўсё радзей і радзей успамінаюць, а мабыць, ужо і не ведаюць пра структуру жыццёвай прасторы хаты і функцыянальнае прызначэнне кожнай з рытуальных зон. Калі вы ўважліва прыглядзіцеся да сістэмы забудовы любога населенага пункта славян, то выявіце, мабыць, адно з галоўных правілаў вясковага дойлідства: кірунак галоўнай вуліцы заўсёды адпавядаў найважнейшаму касмічнаму арыенціру — Млечнаму Шляху (Малочная рака, Гусіная ці Жураўліная дарога), які пралягаў у кірунку ад узыходу Сонца да яго заходу. Тым самым задаваліся дакладныя арыенціры з усходу на захад.

● Найбольш распаўсюджаным з'яўляецца той тып будынка, пры якім на вуліцу выходзяць два акны. Сціана, размешчаная ўздоўж двара, звычайна мела або два, або тры акны. Вокны з боку вуліцы з'яўляліся своеасаблівымі каналамі сувязі з Сонцам (тое, якое бліжэй да чырвонага кута) і Месяцам (тое, якое было бліжэй да «глухой», «цёмнай» сцяны). Тры акны з боку двара сімвалізавалі тры пакаленні людзей, якія пражывалі ў гэтай хаце. Традыцыйная ўсходнеславянская сям'я была вялікай (да 12-15 чалавек) і пры гэтым аб'ядноўвала тры пакаленні, кожнае з якіх выконвала сваю радавую місію.

● Унутраная прастора жылля таксама падзялялася на тры часткі, кожная з якіх вызначала не толькі зону знаходжання гаспадароў, але і гасцей. Ролю своеасаблівай мяжы паміж адпаведнымі часткамі выконвалі дзве бэлькі, на якіх трымалася столь. Прататып сучаснага пярэдняга пакоя — прастора ад уваходных дзвярэй і да першай бэлькі. Яна належала тым, хто ўваходзіў у хату: гасцям, прышлым людзям і г.д. У гэтай частцы памяшкання любы з іх мог зняць вопратку, прысесці, выпіць вады.

● Прастора сям'і знаходзілася паміж першай і другой бэлькай і лічылася асноўным месцам баўлення часу гаспадароў. Менавіта тут знаходзілася зыбка (калыска), ставіліся «кросны», і якраз тут выконвалі ўсю хатнюю працу на працягу зімовага перыяду.

● Другая бэлька з'яўлялася матэрыяльным увасабленнем родавай памяці. Гэта была своеасаблівая родавая кніга, у якой фіксаваліся (выразаліся нажом ці пісаліся вугалем ці мелам) імёны ўсіх памерлых членаў на працягу цэлага стагоддзя. За гэтай сакральнай мяжой пачыналася святая прастора чырвонага кута, у якім былі сканцэнтраваны атрыбуты духоўнай культуры сям'і.

● Дзве ці тры бэлькі дзялілі прастору хаты паміж пакаленнямі, аднак у кожным пакаленні падтрымлівалася раўнавага паміж мужчынскім і жаночым пачаткамі. Галоўная сілавая лінія, якая аб'ядноўвае тры пакаленні і два пачаткі, пралягала па кірунку руху чалавека ад парога да «лобнага месца» — чырвонага кута. Тонкая мяжа паміж левай і правай часткамі хаты — гэта лінія духоўнага жыцця, якая аб'ядноўвала/раз'ядноўвала прастору паміж гаспадарамі хаты. Тая частка, якая знаходзілася злева ад дыяганалі «печ — чырвоны кут», замацавалася за жаночай палавай сям'і, а прастора справа ад яе (з рытуальным цэнтрам чырвонага кута) стала лічыцца жыццёвай сферай мужчын. Галоўнае месца ў ніжняй сферы чырвонага кута займалі два атрыбуты-знакі: сноп са збожжам-насеннем (мужчынскі пачатак) і дзяжа, у якой раслаўздымалася «рошчына» — знак жаночага аплодненага ўлоння.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнемся!

**На сваёй выпускной стужцы Андрэй напісаў свой хатні адрас, мамін мабільны і сваю групу крыві — і не пралічыўся.**

☺

— Пі! Пі, я табе кажу!

— Не буду! Я больш не магу!

— А я кажу — пі!

— Тата! Ну што ты робіш?

— А гэта, дачка, я цябе да выпускнога рыхтую!

☺

**Не разумею я гэтыя сушы-рэстараны! Ну як можа рыс, загорнуты ў рыбу, ды да таго ж сырую, каштаваць больш, чым сала, загорнутае ў газету, ды да таго ж свежую!**

☺

Аб'ява: "Тэлефон, выкрадзены ў жонкі пракурора, просьба вярнуць за ўзнагароду: мінус два-тры гады ад агульнага тэрміну».




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, бухгалтэрыі: 292 22 03.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 2771.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 10 чэрвеня 2011 года.